
МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ СЛОЎНІКА

мінска-маладзечанскіх гаворак

МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ СЛОЎНІКА МІНСКА-МАЛАДЗЕЧАНСКІХ ГАВОРАК

Пад рэдакцыяй доктара філалагічных навук М. А. Жыдовіч



Мінск
Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна
1977

4Бел
М35

Укладальнікі:

М. А. Жыдовіч, І. А. Каралёва, У. М. Лизоўскі, Е. С. Мяцельская, І. М. Шчарбакова

М 35 **Матэрыялы** для слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак. Пад рэд. М. А. Жыдовіч. Мн., Выд-ва БДУ, 1977.

144 с.

У слоўніку тлумачацца значэнні дыялектных слоў, адлюстроўваюцца фанетычныя, граматычныя і стылістычныя асаблівасці мінска-маладзечанскіх гаворак, паказваецца сінаніміка і сфера бытавання дыялектызмаў.

Прызначаецца навуковым работнікам, выкладчыкам ВНУ і настаўнікам школ, студэнтам-філолагам і ўсім тым, хто цікавіцца беларускай народнай мовай.

М $\frac{\text{0715—004}}{\text{М317—77}}$ **53—77** **4 Бел.**

© Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна, 1977 г.

ПРАДМОВА

Жывая дыялектная мова — невычэрпная крыніца лексічнага і фразеалагічнага папаўнення мовы. Сабрана ж і надрукавана з гэтага багацця пакуль што вельмі мізэрная доля. Прапануемы ўвазе чытача чарговы выпуск матэрыялаў з'яўляецца часткай запланаванай на кафедры лексікаграфічнай працы, прысвечанай збору і сістэматызацыі дыялектных матэрыялаў мінска-маладзечанскага арэалу.

У III выпуску «Матэрыялаў для слоўніка мінска-маладзечанскіх гаворак», як і ў папярэдніх двух, змешчаны словы, якія адсутнічаюць у нарматыўным «Беларуска-рускім слоўніку» (1962), за выключэннем слоў з паметай *абл., разм.* У матэрыялах змешчаны таксама словы, значэнне або націск якіх іншыя, чым у літаратурнай мове.

Пры тлумачэнні слова даецца адпаведны сінонім літаратурнай мовы. Калі такі сінонім адсутнічае, то слова тлумачыцца апісальна. Пры дублетных парах робіцца адсылка да больш ужывальнага слова.

Загалоўнае слова даецца ў арфаграфічным напісанні, у дужках пасля яго — транскрыпцыя, як яно гучыць у гаворцы. У якасці ілюстрацыйнага матэрыялу прыводзяцца урыўкі (сказы) мясцовай мовы.

Запіс ілюстрацыйнага матэрыялу, як і ў папярэдніх двух выпусках, падаецца спрошчанай транскрыпцыяй: перад галоснымі *а, о, у, э* мяккасць зычных абазначаецца літарамі *я, ё, ю, е;* мяккасць зычных перад зычнымі і на канцы слова — праз мяккі знак: *борзьдзенька, згомтаць;* падоўжаныя мяккія зычныя абазначаюцца падвоеным напісаннем літар, паміж якімі пішацца мяккі знак:

зельле, насеньне, узьлесьсе; выбухное *г* выдзелена курсівам; для спрашчэння набору націскі ў словах пастаўлены пасля галоснай: *заману'цца, падвазо'ньнік* і інш.

УМОЎНЫЯ СКАРАЧЭННІ

1. Граматыка-стылістычныя

абраз.— абразлівае
адабр.— адабральнае
агульн.— агульны род
адз.— адзіночны лік
арф.— арфаграфічнае
асудж.— асуджальнае
бат.— батанічнае
будаўн.— будаўнічае
выкл.— выклічнік
гл.— глядзі
дапаможн. дзеясл.— дапаможны дзеяслоў
дзеепрым.— дзеепрыметнік
жан.— жаночы род
заал.— заалагічнае
займ.— займеннік
зак. тр.— закончанае трыванне
збор. ліч.— зборны лічэбнік
зневаж.— зневажальнае
злучн.— злучнік
іран.— іранічнае
ласк.— ласкальнае
лаянк.— лаянкавае
мед.— медыцынскае
мужч.— мужчынскі род
неадабр.— неадабральнае
незак. тр.— незакончанае трыванне
ніяк.— ніякі род
пабочн. сл.— пабочнае слова
памяншл.— памяншальнае
перан.— пераносnае
прым.— прыметнік
прын.— прыназоўнік
прысл.— прыслоўе
субст.— субстантыўнае
толькі адз.— толькі ў адзіночным ліку
толькі мн.— толькі ў множным ліку
часц.— часціца

2. Населеныя пункты, у якіх запісвалася лексіка

Аз. — Азаркі Мядзельскага раёна
Акал. — Акалова Лагойскага раёна
Алях. — Аляхновічы Маладзечанскага раёна

Ар. — Арэшніца Клецкага раёна
Аўг. — Аўгустова Валожынскага раёна
Баг. — Багрыцоўшчына Дзяржынскага раёна
Бар. — Барок Стаўбцоўскага раёна
Белар. — Беларучы Лагойскага раёна
Бом. — Бомбалы Валожынскага раёна
Борк. — Боркаўшчына Мядзельскага раёна
Бр. — Брадок Лагойскага раёна
Буз. — Бузуны Нясвіжскага раёна
Бяз. — Бязводнае Вілейскага раёна
Бяс. — Бясяды Лагойскага раёна
В. В. — Вялікая Вуса Уздзенскага раёна
Войр. — Войрава Чэрвеньскага раёна
Ган. — Ганцавічы Лагойскага раёна
Гар. — Гарадок Маладзечанскага раёна
Гіл. — Гілікі Валожынскага раёна
Граб. — Грабёнка Чэрвеньскага раёна
Даўг. — Даўгінава Вілейскага раёна
Дзям. — Дзямідаўка Барысаўскага раёна
Дуб. — Дубіна Маладзечанскага раёна
Дубр. — Дубрава Маладзечанскага раёна
Дук. — Дукора Пухавіцкага раёна
Заб. — Забрэжжа Валожынскага раёна
Зайцы — Зайцы Чэрвеньскага раёна
Зал. — Залазоўе Вілейскага раёна
Зап. — Запруддзе Валожынскага раёна
Заям. — Заямнае Стаўбцоўскага раёна
Каб. — Кабыльчыцы Валожынскага раёна
Кал. — Каляды Вілейскага раёна
Калод. — Калодкі Вілейскага раёна
Кам. — Каменка Уздзенскага раёна
Карш. — Каршавіца Барысаўскага раёна
Кірк. — Кіркаўшчына Нясвіжскага раёна
Кл. — Клінок Чэрвеньскага раёна
Клет. — Клетнае Барысаўскага раёна
Кор. — Коргава Лагойскага раёна

Крок. — Кроква Лагойскага раёна
Кузьм.— Кузьмічы Мінскага раёна
Кук. — Кукалеўка Лагойскага раёна
Кукш. — Кукшавічы Дзяржынскага раёна
Кухц. — Кухцічы Уздзенскага раёна
Леж. — Лежня Барысаўскага раёна
Ліс. — Лісіца Нясвіжскага раёна
Луб. — Лубень Вілейскага раёна
Луц. — Луцішчы Крупскага раёна
Мал. — Малінаўка Лагойскага раёна
Малм.— Малмыгі Вілейскага раёна
Масц. — Масцішча Барысаўскага раёна
Мац. — Мацькаўцы Вілейскага раёна
Меж. — Межава Чэрвеньскага раёна
Меч. — Мечаі Вілейскага раёна
Мік. — Мікольцы Мядзельскага раёна
Мойс.— Мойсічы Маладзечанскага раёна
Мул. — Муляры Вілейскага раёна
Мядз.— Мядзель (гар. пасёлак)
Нав. — Навасёлкі Валожынскага раёна
Нар. — Нарач Вілейскага раёна
Н. Д.— Новы Двор Мінскага раёна
Неж. — Нежаўка Чэрвеньскага раёна
Няр. — Няровы Валожынскага раёна
Паг. — Пагост Вілейскага раёна
Пал. — Палачаны Маладзечанскага раёна
Пап. — Папоўка Мядзельскага раёна
Папл. — Паплавы Бярэзінскага раёна
Пільк.— Пількаўшчына Мядзельскага раёна
Прудз.— Прудзішча Лагойскага раёна
Пуз. — Пузыры Мядзельскага раёна
Рад. — Радашковічы Маладзечанскага раёна
Рат. — Ратуцічы Барысаўскага раёна
Раўч. — Раўчак Пухавіцкага раёна
Р. П. — Рудня Плешчаніцкая
Руб. — Рубанікі Мядзельскага раёна

Р. Ч. — Рудня Чэрвеньскага раёна
Сав. — Савоні Стаўбцоўскага раёна
Сак. — Сакольшчына Уздзенскага раёна
Сасн. — Сасноўшчына Вілейскага раёна
Св. — Светлае Клецкага раёна
Сів. — Сівіцы Валожынскага раёна
Сл. — Слабодка Стаўбцоўскага раёна
Слаб. — Слабада Лагойскага раёна
Стар. — Старлыгі Мядзельскага раёна
Ст. В. — Старая Вёска Мядзельскага раёна
Ст. — Станькі Вілейскага раёна
Суд. — Суднікі Валожынскага раёна
Суц. — Суцін Пухавіцкага раёна
Сцеп. — Сцепянёва Мядзельскага раёна
Сцеш. — Сцешыцы Вілейскага раёна
Сям. — Сямкова Лагойскага раёна
Так. — Такарышкі Смаргонскага раёна
Турэц. — Турэц Чэрвеньскага раёна
Уж. — Ужанка Нясвіжскага раёна
Узгур. — Узгурск Лагойскага раёна
Хал. — Халопенічы Крупскага раёна
Хац. — Хацюхова Крупскага раёна
Хож. — Хожава Маладзечанскага раёна
Цял. — Цялякава Уздзенскага раёна
Цяр. — Цярэшкі Барысаўскага раёна
Чар. — Чарняўка Нясвіжскага раёна
Чыж. — Чыжаха Бярэзінскага раёна
Фал. — Фалевічы Мядзельскага раёна
Яз. — Язні Вілейскага раёна
Якш. — Якшыцы Клецкага раёна
Януш. — Янушкавічы Лагойскага раёна
Яц. — Яцыны Мядзельскага раёна

МАТЭРЫЯЛЫ ДЛЯ СЛОЎНІКА

А

АБАЛО́НА (абало́на) *жан.* Кара на дрэве. Абало́на скрось от тако́й глыбіні. *Кам.*

АБВЫКА́ЦЬ (абвыка́ць), -аю, -еш; *незак. тр.* Прывыкаць. І тут ужо до́бра, як абвы́клі, а ране́й, дык цягну́ла на старо́е ме́сца. *Узгур.*

АБЕ́ДАШНІ (абе́дашні) *прым.* Што прыходзіць у абед. Во́ўка се́ньня абе́дашнім аўто́бусам прые́хаў. *Бяс.*

АБ'Е́ДЗІНЫ (аб'е́дзіны) *толькі мн.* Аб'едкі. На стале́ засталі́ся адны аб'е́дзіны. *Меж.*

АБІВА́ЦЬ ТУ́НІКІ. Нічога не рабіць. Ты нічо́га не ро́біш, абіва́еш ту́нікі. *Кам.*

АБІРА́ЦЬ (абіра́ць'), -аю, -еш; *незак. тр.* Аддзяляць (мяса ад касцей). Аб'ры́ ко́сці — мя́са мно́га на іх засталó́ся. *Меж.*

АБНО́ЖКА (абно́шка) *жан.* Сабраны з кветак пылок. Сабра́ны пыло́к называ́ецца абно́шкай. Пчала́ прышла́ з абно́шкай у ву́лей. Хо́раша ідзе́ пчала́ с абно́шкай — мно́га мёду́ бу́дзець. *Бяс.*

АБРЫ́ЎКА (абры́ўка) *жан.* Заработак. Я адзі́н на ўсю ве́ску бо́ндар, гэта сяго́ньня ў яку́ю ха́ту ні су́нься — мой цабэ́рак зно́йдзеш. І людзя́м ла́ска, і табе́ сяка́я-така́я абры́ўка. *Белар.*

АБДЗІ́РКУС (абдз'і́ркус) *мужч.* Дзіця, якое хутка рве адзенне. Не набра́цца ж адзе́ння на гэ́тага абдзі́ркуса: ме́сяца не прайшло́, а гало́шы парва́ў, руба́шку распаласава́ў. *Меж.*

АБЖА́ЛІЦЬ (абжа́ліць'), -ю, -іш; *зак. тр.* Абскардзіць. Рашэ́ньне суда́ яшчэ́ абжа́ліць мо́жна. *Граб.*

АБЛА́ДЗІЦЬ (абла́дзіць), -дж-у, дз-іш; *зак. тр.* Аба-

браць бульбу. Сынóчак, навастры́ нож, бо ён вéльма тупы́, трэ́ба на вячэ́ру бу́льбу абла́дзіць. *Р. П.*

АБМА́ГЧЫ′ (абмахчы́), -у, -аш, *зак. тр.* Перамагчы. Яшчэ́ ніхто́ яго́ не змог абмахчы́, і малады́я на́ват. *Меж.*

АБМІ′НАК (абмі́нак) *мужч.* Агрэхі пасля таго, як поле ўзарана. Палоскі зямлі, якія прапушчаны, не зараны. І мно́га ж на гэ́тым по́лі абмі́нкаў засталó́ся: му́сіць, трактары́ст тра́ктар пе́ршы раз вёў, прапуска́ючы цэ́лыя пало́скі. *Дук.*

АБМЫЛІ′ЦЦА (абмыліцца), -ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Памыліцца. Глядзі́ ўва́жліва, а то абмыліцца мо́жаш, адну́ ме́рку прапусці́ ці даба́ў і на цэ́лую со́тку ме́ней або́ больш наме́раем. *Меж.*

АБНЯДУ′ЖАЦЬ (абнядýжаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Аслабець. Мае бацькі́ саўсі́м абнядýжалі. *Жор.*

АБО′РА (або́ра) *жан.* Гумно. З ле́ташняга го́ду ў або́ры засталó́ся не́калькі пудо́ў збо́жжа. *Р. П.*

АБО′Я (або́я) *збор. ліч.* Абодва. Абаі́м далі́ прымірóўку *Р. Ч.*

АБРАБІ′ЦЦА (абрабі́цца), -л-ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Запэцкацца. Абрабі́ўся ўвесь, не́дзе ў гразі́ по́ўзаў, ці што? *Прудз.*

АБРАДЗІ′НІЦЦА (абрадзі́ніцца), -ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Радзіць. Во го́ра было́: муж памёр, а я тут яшчэ́ абрадзі́нілася. *Сак.*

АБРО′БЛЕНЫ (абро́блены) *прым.* Запэцканы. Ён такі́ заўсёды абро́блены хо́дзіць, і ў сьвя́та і ў бу́дні: нікóлі не апране́ чы́стага, як і не памы́е старóга. *Граб.*

АБРЫ′ДНІЦА (абры́дніца) *жан., неадабр.* Надакучлівая. Не хачу́ і ба́чыць абры́дніцы гэ́тае! *Бр.*

АБРЫ′ДНІЦА (абры́дніца) *жан.* Бессаромная (у адносінах да жанчыны). Зыйдзі́ з вачэ́й, абры́дніца! Ля́паеш усё, што мо́жна, чаго́ і не́льга. Там жа дзе́ці — усё чу́юць. *Меж.*

АБРЫ′ЗЛЫ (абры́злы) *прым.* Азызлы. З начы́ яна́ заўжды́ з абры́злым тва́рам устава́ла. *Хал.*

АБРЫ́НДАЦЦА (абры́ндацца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Заляпацца граззю. Усю́ спадні́цу абры́ндала за гэ́тую дарогу́, а панчо́хі ад гразі аж рабыя ста́лі. *Узгур.*

АБСАДЗІ́ЦЬ (апсадзіць), -дж-у, -дз-іш; *зак. тр.* Стрымаць. Але я яго́ адразу́ апсадзі́ў, бо на́тта ўжо ён разышо́ўся. *Р. В.*

АБСАДЗІ́ЦЬ (апсадзіць), -у, -іш; *зак. тр.* Супыніць. Нямá каму́ апсадзі́ць цябе́. *В. В.*

АБСАРДА́К (апсарда́к) *мужч.* Лапсардак. Апсарда́к на ім, як на калу́ вісіць, так ужо схуднеў. *Дубр.*

АБСЛЮНЯ́ЎЛЕНЫ (апсьлюня́ўлены) *прым.* Абслюнены. Стары́ дзед дзяржа́ў у зуба́х апсьлюня́ўленую цыгары́ту. *Узгур.*

АБТРАХНУ́ЦЬ (аптрахну́ць), -у, -еш; *зак. тр.* Абтрэсці. Вось галга́нцы, за ноч усе́ я́блыкі аптрахну́лі. *Узгур.*

АБУ́БНІЦЬ (абу́бніць), -ю, -іш; *зак. тр.* Астрыгчы нагала. Такі́ прыго́жы хло́пец, а яго абу́бнілі як аве́чку. *Бр.*

АБХЛЮ́ПАЦЬ (апхлю́паць), -ю, -еш; *зак. тр.* Апырскаць граззю. Паткаса́й штаны́, а то апхлю́паеш. *Дук.*

АБЦЕ́ПКАЦЦА (апце́пкацца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Не прыбіраць у хаце. Така́я маладáя, а зусім апце́пкалася, усё ніпачо́м: ці прыбра́на, ці насьме́чана; ці бу́дуць чужы́я, ці не бу́дуць — усё ёй ро́ўна. *Меж.*

АБЧЫ́РЫЦЬ (абчы́рыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Абадраць, абрэзаць, абчасаць. А той гэ́тым ча́сам абчы́рыў ду́ба і ляці́ць сюды́ з кійко́м. *Р. Ч.*

АБШАЛЁСТАЦЬ (апшалёстаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Красці. Апшалёсталі ўсё: і пшані́цу і ячме́нь і бо́йку з мёдам, усё забра́лі. І ніхто́ не ве́дае, хто мог гэ́та зрабіць. *Меж.*

АБША́СТАЦЬ (апша́стаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Абрэзаць (у адносінах да прычоскі). Гэ́та ж мая́ дзяўчы́на ўчо́ра такія валасы́ апша́стала, галава́ ста́ла го́лаю, як гарбу́с. *Меж.*

АБ'Е'ДДЗЕ (аб'е́дзьдзе) *ніяк., толькі мн.* Аб'едкі. Не з'едзенае сена. У нас яшчэ́ ў паве́ці мно́га аб'е́дзьдзя ляжы́ць. *Пільк.*

АБЯРНУ'ЦЦА (абярну́цца), -у-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Перакуліцца. Каза́ў жа не лажы́ць такі́ по́ўны вос, вот і абярну́ўся. *Чар.*

АГЛАМА'ЗДАК (агламáздак) *мужч., зневаж.* Дурань. Аднаго́ сы́на ма́ю і той агламáздак, нічо́га не разуме́е. *Уж.*

АГЛАМО'ЗЫ (агламо́зы) *прым.* Тупы чалавек. Каму́ ты дала́ раша́ць? Калі́ Га́нна ні рашы́ла, то гэ́та агламо́зая і сло́ва ні прачыта́е. Яна́ ж як пень. *Бяс.*

АГЛЯ'ДЗІНЫ (агля́дзіны) *толькі мн.* Агледзіны. Не́калі ў нас гэ́так было́. Хо́ча жаніцца хло́пец, дык трэ́ба ш, каб бацькі́ маладо́га прыяжджа́лі на агля́дзіны. *Кукш.*

АГРА'З (аграс) *мужч.* Гультай. Аграс гэ́ты нічо́га не ро́біць, то́лька і шлы́ндая па ву́ліцы. *Р. Ч.*

АГУ'ЛАМ (агу́лам) *прысл.* Разам. Агу́лам спахватне́й рабі́ць. *Кам.*

АДАБРА'ЦЬ (адабра́ць) *зак. тр.* Паралізаваць. Ужо трэ́ці гадо́к мінў́ў, як яму адабра́ла но́гі. *Кам.*

АДГАДАВА'НАЯ (адгадава́ная) *дзеепрым.* Вялікая. Ну і трава́ ж адгадава́ная, я і ня ду́маў, што така́я бу́дзя. *Мядз.*

АДГА'КАЦЬ (адга́каць), -а-ю, -а-еш; *зак. тр.* Зрабіць, паставіць дом. Так ху́тка Васі́ль сваю́ ха́ту адга́каў, што не ве́рыцца. *Прудз.*

АДГАНА'ШЫЦЬ (адгана́шыць), -ш-у, -ш-ыш; *зак. тр.* Адлупцаваць. Ой сьці́хні, а то кля́пам рот заткну́ ды так адгана́шу. *Раўч.*

АДДАЛЁ'К (аддалёк) *прысл.* Воддаль. Іх ха́ты ста-я́лі аддалёк, так што вясно́й і во́сеньню туды́ ні даехаць, ні дайсьці́. *Граб.*

АДДУДУ'РАНЫ (аддудýраны) *прым.* Адтапыраны. Чаго́ ў цябе́ карма́н такі́ аддудýраны, чаго́ ты туды́ накла́ў? *Чар.*

АДДУ′ХА (аддýха) *жан.* Адпачынак. Рабíў без аддýхі — беркулёз зарабíў, але гля́нь-ка ты, вы́лечыўся. *Буз.*

АД′Е′ХАЦЬ ЧАРАДУ′. Адпомсціць. Прыбéх мой малы́ да ха́ты, дый ка́жа, што яго́ пабíлі, а старэ́йшы ка́жа: «А ты б ад′éхаў чарадý». *Бяс.*

АДКАСА′ЦЦА (аткаса́цца), -у-ся, -аш-ся; *зак. тр.* Адчапíцца. Аткаса́йся ты ат мяне́, прыста́ў як сма́ла. *Чар.*

АДЛІ′ЎНІК (атлíўнік) *мужч.* Прыстасаванне, па якім сцякае вада з страхі. До́бра, дзéткі, што атлíўнік éсьць, хоць вады́ дажджаво́й мно́га назьбіра́ецца. *Р. П.*

АДЛЯЧЫ′ЦЬ (адлячы́ць), -у, -ыш; *зак. тр.* Вылечыць. Яе ў Мíнску ў бальні́цу палажы́лі, мо́жа адле́чаць. *В. В.*

АДНАЛІ′ЧНІК (адналíчнік) *мужч.* Аднаасобнік. Гэ́ты ж адналíчнік і каня́ ма́я, зада́рам нічо́га ні зро́біць. *Бяс.*

АДНІ′МКА (атні́мка) *жан.* Ануча, якой адцэджваюць бульбу з чыгуноў. Пада́й атні́мку, а то ру́кі папя́ку́. *Чар.*

АДО′НАК (адо́нак) *мужч.* Сцяжар'е. Адо́нак на́да, кап се́на ні гніло́. *Цяр.*

АДЧЫ′РЫЦЬ (атчы́рыць), -у, -ыш: *зак. тр.* Адзначыць, адвесці лінію. Нíма чырво́нага карандаша́ палí адчы́рыць. *Цяр.*

АДПЭ′НДЗІЦЬ (адпэ́ндзіць), -у, -іш; *зак. тр.* Адправіць. Пасадзíў сваю Га́нначку на вос і адпэ́ндзіў у Уздý ў сямігóтку. *Шяр.*

АДТУ′РЫЦЬ (аттý́рыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Прагнаць, адагнаць. Як аттý́рылі не́мцаў ад Масквы́, дык лю́дзі павесялéлі. *Кл.*

А′ДРЫС (а́дрыс) *мужч.* Адрас. Каб ве́дала яго́ а′дрыс. дык ні мяша́ла п напіса́ць пісьмо́. *Р. П.*

АДСЯКА′ЦЬ (атсіка́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Адсякаць. Патрэ́бна паатсіка́ц' гэ́тыя галíнкі, бо яны́ мяша́юць расьцí дрэ́ву. *Узгур.*

АДТА́ЎХІВАЦЬ (аттаўхівац'), -аю, -еш; *незак. тр.* Адштурхоўваць. А ён як пача́ў аттаўхівац' усіх ад сябе́. *Узгур.*

АДТО́П (аттóп) *мужч.* Пасудзіна, у якой адтопліваюць малако. Ты лажы́ся, дачушка, а я за́раз малака́ табе́ ў аттóпе прынясу́. *Р. П.*

АДУ́ЖАЦЬ (адýжаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Ачуняць. Ён цяжка хварэ́ў, ледзь адýжаў. *Меж.*

АДХАДЗІ́ЦЬ (атхадзíць), -у, -іш; *зак. тр.* Вылечыць. Мой мужы́к хварэ́ў у тóя ле́та, ле́дзьві атхадíлі. *Кам.*

АДХАЛАДЗІ́ЦЬ (атхаладзíць), -у, -іш; *зак. тр.* Супакоіць. Атхаладзíць яго́ на́да, а то разгарачы́ўся дýжа. Вот ужо не́йкі шале́ны. *Бяс.*

АДХУ́ҚАЦЬ (атхýкаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Выхадзіць, выратаваць. Ледзь-ледзь удало́ся небара́ку адхýкаць, так хапíла, што аж крыча́ў — і но́гі, гаво́рыць, баля́ць, і ру́кі, і галава́. *Бяс.*

АДЫМА́ЛКА (адыма́лка) *жан.* Ануча, якою адцэджваюць чыгуны. Ня по́мню, дзе адыма́лку дзе́ла. *Аўг.*

АДЫМА́ЧКА (адыма́чка) *жан. Гл.* адымалка; тут: брудны, знешнім выглядам падобны на анучу. Ні люблю́ я Стэ́фкі за язы́к, што лю́бя абгаварыць другíх. На другíх усё відзя, а што сама́ спадніцу адзе́ўшы, ла́сьне ка́жучы адыма́чку, е́тага ня відзя. *Заб.*

АД'Я́ДА (ад'я́да) *агульн., зневаж.* Надакучлівы чалавек. Во ўжо йдзе́ гэты ад'я́да, трэ́ба ўцячы́, бо нада-е́сьць за цэ́лы ве́чар. *В. В.*

АЖЫ́ВЕЦ (ажы́вец) *мужч.* Жывая прынада для рыб. На ажы́вец хутчэ́й ры́ба по́йдзе, чым на хлеп. *Чыж.*

АЗДРУБА́ЛАК (аздрубáлак) *мужч.* Шчэпка. На́шага дóхтара ўно́чы завезьлі ў бальні́цу, аздрубáлак адляцéў ад палéна і папáў у вóка. *Уж.*

АКАЛЕ́ЦЬ (акалéць), -ю, -еш; *перан., зак. тр.* Астыць. Ну дзе ты там? Ідзí е́сьці хутчэ́й, бо ўжо акалé-ла бýльба. *Дубр.*

АКЕ′НЯЧКА (аке́нячка) *ніяк.* Ваконца. Паглядзі́ ў вакéнячка, дзе прадýць дзéвачкі. *Дук.*

АКІСА′ЦЬ (акісáць) *зак. тр.* Скісаць. Малачко́ сьвéжанькае, абéдняе, у хáце янó акісáе, а як у кладóвачку вы́нясу, дык не. *Бяс.*

АКО′НАМ (акóнам) *мужч.* Панскі аканом. Пáнскі акóнам у палáцы жыў. *Кам.*

АКРА′ЙКА (акрáйка) *жан.* Лента. Ранéй дзяўчáты ў косы́ такія прыгóжыя акрáйкі заплятáлі, а цяпéр дык нéйкія стры́шкі рóбяць. *Р. П.*

АКРО′ПЧЫК (акрóпчык) *мужч.* Укроп. У гарóдзі ў міне́ акрóпчыку шмат. *Кам.*

АКРЫЯ′ЦЬ (акрыя́ць), -ю, -еш; *зак. тр.* Ачуняць. Мóжа й акрыя́е Гáнна. *Цял.*

АЛЬНЯНЫ′ (альняны́) *прым.* Ільняны. Альняна́я рубáшка лéтам хóраша. *Ліс.*

АЛЬШЭ′ЎНІК (альшэ́ўнік) *мужч.* Малады альховы лес. Там выгарашча, саўсім нічóга не расло́, а зáрас альшэ́ўнік разрóсься. *Пільк.*

АНГЕ′ЛЬКА (ангéлька) *жан.* Рахіт. Як анг′éлька (ці знаяш ты, што та ангелька? Эта хвaрóба дзіця́ча — нóшкі слáбянькія, а жывóт вéлькі, рахíт па-вáшаму, па-вýчóнаму), дак як ангéлька нападзé на дзіця́, зьбірáюць с кры́шы зялéнянькі такí мох (але цяпéр тóга мóху й нямá, бо кры́шы салóмай ні кры́юць), пáраць, мая́ ты, і па пóвяс сáдзяць папáрыцца. *Заб.*

АНДРЭ′ЙКА-САЛАВЕ′ЙКА (андрэ́йка-салавéйка) *мужч.* Божая кароўка. Падýмаеш, я нядзéлю ўжо знаў, што андрэ́йка-салавéйка з'явíўся. *Чыж.*

АНО′ДАСЬ (анóдась) *прысл.* Калісьці. Анóдась і Парáска нáша былá маладóй. *Чыж.*

АНТАЛА′К (анталáк) *мужч.* Падваконнік. Пакрáсіла я вясно́й анталáкі ў хáце, а яны ужо і аблупíліся. *Кук.*

АНТО′НЫ (антóны) *толькі мн., бат.* Гатунак яблыкаў. Антóны так дасьпéлі, аш сьвіця́цца. *Кам.*

АНЭ′ГДЫ (анэ́г′дысь, анаг′да́й) *прысл.* Нядаўна, два-тры дні назад. Анэ́г′ды ўзяла́ яна́ маю́ пянько́ўку, а се́ньня зі́мна, я і сама́ завяза́ла б галаву. *Нав.*

АНЯЖ (аняш) *часц.* Так. «Ты на сход по́йдзеш?»—«Аняш». *Хал.*

АПІ′ННЯ (апі́ньня) *жан.* Рэпутацыя. Заслужы́ў ён тут до́брую апі́ньню. *Граб.*

АПЛЯТА′НІК (аплята́нік, апляця́нік) *мужч.* Збанок, аплецены дротам. Малако́ вазьмі вунь там, у аплята́ніку стаіць. *Бр.*

АПО′ЛКІ (апо́лкі), *адз.* апо́лка. Адыходы, якія атрымліваюцца пры рэзанні дошак. До́шак нім а́, дык хоць апо́лкамі тро́ба накры́ць го́ты хлявушо́к. *Бр.*

АПО′НА (апо́на) *жан.* Пакрышка на кола веласіпеда і аўтамашыны. Во, прабі́ла апо́ну, тро́ба заклеіць. *Уж.*

АПРАНІ′ХА (апраніха) *жан.* Якая-небудзь верхняя адзежа. Адзе́нь яку́ю-не́будзь апраніху, а то но́ччу ш хо́ладна бу́дзя е́хаць. *Дубр.*

АПРУ′К (апру́к) *мужч.* Парсюк. До́бра аткарміліапрука́, і кало́ць ужо пара́. *Бяс.*

АПУСНЫ′ (апусны́) *прым.* Неахайны. Ну і апусна́я го́та Га́нна. У ха́це гра́зна, ку́ры хо́дзюць. *Бяс.*

АПУ′ШЧАНЫ (апу́шчаны), -ая,- -ае, *прым.* Занядбаны; такі, ад якога адвярнуліся людзі. А го́ты Язэ́п (памёр, небара́ка) быў чалаве́чык, сказа́ць па пра́ўдзе, не́йкі тро́хі апу́шчаны ў вёсцы, не́йкі быў хто яго ве́дыіць які́. *Зал.*

АПЯЛЮ′ХА (апялю́ха) *агульн.* Глухі. Ён с са́мага нараджэ́ньня апялю́ха, нічо́га ні чу́я. *Кам.*

АПЯРНУ′ЦЦА (апярну́цца), -у-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Абаперціся. Дай я аб цябе́ апярну́ся. *Кам.*

АПЯ′РЫЦЬ (апя́рыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Адлупіць. Яго апя́рылі пра́вільна, за тое што пе́ршым пале́з у бо́йку. *Гар.*

АРБО′Н (арбо́н) *мужч.* Аўтобус. «Ці ня е́ты арбо́н на Забро́зья по́йдзіць?»—«Го́ты».—«А кундукта́р ёсць?

Мо́жа ён мне бялéт у арбо́не дась?» *Заб.* Чуць пасьпе́ла узя́ць білéт на арбо́н, шо́фяр ужо́ й браць ні на́тга хацéў. *Яц.*

АСКАЛО́ЦІНЫ (аскало́ціны) *толькі мн.* Кіслае малако. Мы аскало́ціны с хлéбам і бу́льбай ядзім, што ш, сма́чная ядá. *Мац.*

АСЛАБАНІ́ЦЬ (аслабаніць), -ю, -іш; *зак. тр.* Вызваліць. А як аслабанілі нас, дык і жыцьцё нала́дзілася. *В. В.*

АСМА́ЛАЧАК (асма́лачак) *мужч.* Прыгарачка. Дзéці вéльма лю́бяць асма́лачкі. *Кук.*

АСНО́ВА (аснóва) *жан.* Падэшва лапця. Гэ́тыя ла́пці бу́дуць до́ўга насіцца, бо аснóва мóцная. *Р. П.*

АСО́БЕННА (асóбенна) *прысл.* Асобна. Ты ж гро́шы асóбенна схава́й, а не ўсё ра́зам. *Буз.*

АСО́ТЫ (асóты) *толькі мн.* Соты. Пчóлы сáмі асóты ро́бяць, ча́шачкі такія клéюць зьвéрху і каля бако́ў, гэ́тыя ча́шачкі напаўня́юць мéдам, і каб ён не вылівóўся, заклéюць. *Бяс.*

АСПАДНІ́ЦА (аспадніца) *жан.* Спадніца. Была́ яна́ ў чóрнай аспадніцы і прыгóжай квяцістай нажу́ццы. *Сак.*

АСПАКО́ІЦЦА (аспакóіцца) *зак. тр.* Супакоіцца, уладзіцца. Сьвéкар чорт быў, ня раз я пла́кала ад яго́. Тады́, пра́ўда, нéяк аспакóілася, аспакóілася, перастáлі сварыцца, жыць мóжна ста́ла. *Яз.*

АСЬМУ́ШКА (асьму́шка) *жан.* Восьмая часць валокі. Гэ́та ш я учóра асьму́шкай ішла́ і éта пугаўé нашла́. *Р. П.*

АДРУІ́ЦЦА (атруіцца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Атруціцца. З грыбóў і атруіцца мóжна, калі́ дрэ́нна зварыць. *Буз.*

АТСЮ́ЛЕКА (атсю́ліка) *прысл.* Адсюль. Атсю́ліка да шашы́ кіламéтры тры бу́дзе. *Узгур.*

АЎСЯ́НКА (аўсянка) *жан.* Аўсяныя крупы. Авéс вы́сушуць, тады́ яго аптаўку́ць у сту́пе, насы́пюць у гарш-

чо́к, кіпятко́м налі́ваюць і ў печ. Гэ́ты авёс распа́рыцца, а тады́ выця́гаваюць з гаршка́ ў ро́шата, каб вада́ сьцякла́ до́бра, а пато́м сы́пюць на печ і су́шуць. Вы́сахне і зро́біцца як авёс настаяшчы, непа́раны. *Акал.*

АЎША́К (аўша́к) *мужч.* Вушак. Ён як сту́кнуўся аб аўша́к, так і су́мка на пол гру́кнула. *Нав.*

АХА́ЯЦЬ (аха́яць), -ю, -еш; *зак. тр.* Прыбраць. Мая цётка сказа́ла, каб я аха́яла ха́ту. *В. В.*

АХРА́ПКА (ахра́пка) *жан.* Качарэжка. Мой са́мы мало́тшыУла́дзь дык усё крычы́ць: «Ма́ма, абро́ж мне ахра́пку». *Хац.*

АЧАЛАВЕ́ЧЫЦЦА (ачалаве́чыцца), -у-ся, -ыш-ся; *зак. тр.* Ажаніцца. Ачалаве́чыўся б ён ужо́, а то хо́дзіць як блу́дны. *Кам.*

АШАВУ́РАК (ашаву́рак) *мужч.* Асмалак, а часта і звычайная палка. Як скіня ён сваю́ капо́ту (вопратку), як хва́ця ашаву́рак дый за саба́кам сьле́дам. *Заб.*

АШАРА́ШЫЦЬ (ашара́шыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Здзівіць. Ну і ашара́шыў жа ён мяне́, як сказа́ў, што жэ́ніцца на гэтай дзяўчы́не. *Кам.*

АШЛЁ́ПКІ (ашлёпкі) *толькі мн.* Абутак (стоптаны). Што гэ́та за ашлёпкі ў цябе́ на нага́х? Бы́тта купіць чаравікі табе́ німа́ за што. *Узгур.*

Б

БА́БІЧ (ба́біч) *мужч.* Дзіця, што нарадзілася ў прысутнасці бабкі-павітухі. У нас завядзёнка така́я была́ — на велька́нац ідзём па я́йка да та́туся хрышчо́нага, ма́мы хрышчо́най, бабу́лі. Дак я рас прышла́ (а ў нас на́тта было́ мно́га дзяце́й, было́ сем дзяце́й), дык эта бабу́ля мне як накла́ла, усім жа сваім гэ́тым бабічо́м як накла́ла я́ек, дак я дамо́ў ужо й ні прынясла́, пабіла, памя́ла. *Зал.*

БАБКО́ВЫ ЛІСТ (бапко́вы ліст). Лаўровы ліст. Ва́раць расо́л, кіда́юць туды́ пе́рац, бапко́вы ліст, соль, укро́п, часно́к. Гэ́тым расо́лам залі́ваюць грыбы́ і закры-

ва́юць дну́шкай і ста́вяць у склеп. Грыбы́ гато́вы. *Белар.*

БА́БЛЕННЕ (ба́бленьне) *ніяк.* Радзіны. У е́ту нядзелю ў маé нявéсткі ба́бленьне бу́дзе. *Р. П.*

БАБО́К (бабо́к) *мужч.* Капытнік. Ідзі́, сын, бабо́к зьбіра́ць, сьві́ньні е́сьці хо́чуць. *Р. П.*

БАБО́ЎКА (бабо́ўка) *жан.* Бульба. Я на сваім пля́цы пасадзі́ла бабо́ўкі. *Р. П.*

БАБУ́НЯ (бабу́ня) *жан.* Бабуля. Бабу́ня Камаро́ўская, ідзе́ця, я з ва́мі рашчыта́юсё, гро́шы адда́м. *Сав.*

БАБЫ́′ (бабэ́) *толькі мн.* Цёплыя, доўгія дзіцячыя штаны. Бардзе́й сабіра́йся, я табе́ сёньня но́выя бабэ́ дам надзе́ць, пашы́ла ўжо́. *Борк.*

БАВАЛЬНІ́ЦА *жан.* Баваўняныя ніткі. Быва́ла, мы пасьці́лкі і з бавальні́цы тка́лі, і с ку́жалю, і с тэ́рсні. *Кам.*

БАВЭ́ЛНА (бавэ́лна) *жан.* Гл. бавальніца. Бавэ́лну мы купля́лі на ўток, а на аснóву ку́жаль. *Цял.*

БАВЭ́ЛЬНІЦА (бавэ́льніца) *жан.* Баваўняная хустка. Гэ́та вось бавэ́льніца, што залóўка падары́ла мне, гэ́тка была́ ўжо краси́вая, што цяпе́р хоць і старэ́нька, а від ма́е. *Кук.*

БАДА́Ґ (бада́к) *мужч.* Асот (пустазелле). Калю́чы бада́к заглушы́ў уве́сь ячме́нь, што рабіць: пачні́ рваць — ячме́нь сто́пчаш і ру́кі пако́ляш. *Меж.*

БАДА́Й (бада́й) *пабочн. сл.* 1. Магчыма. Бада́й, яна ўжо пашла́ туды́, бо нідзе́ ня відаць на дварэ́ нікóга. *Р. П.* 2. *Каб* у ролі *злучн.* Бада́й ты здóхла. *Кам.*

БАДЗЮГІ́′ (бадзюгі́) *толькі мн.* Асот. Трэ́ба б было́ аста́ццa дóма, бу́льму апкапа́ць, бадзюгі́ парва́ць. *Р. П.*

БАДЗЯ́ЦЦА (бадзяцца), -ю-ся, -еш-ся; *перан., незак. тр.* Валяцца. Па ўсе́й ха́це адзе́жа бадзя́іцца. *Цяр.*

БАЕ́′ЎКА (баéўка) *жан.* Цёплая хустка з байкі. Так сяго́ньня зі́мна, я й кажу́х адзе́ла і баéўку ўзяла́, а ўсё адно́ зьмёрзла. *Яц.*

БАЖЭ́′ (бажэ́) *ніяк.* Жабо. Суке́нку Ма́ня мне́ пашыла і прыго́жае бажэ́ купі́ла. *Св.*

БА́ЙКАЦЬ (ба́йкаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Гаварыць. Ці не лепш было́ п, каб вы ні ба́йкалі, а рабілі. *Ліс.*

БАКАВІ́ЦА (бакавіца) *жан.* Пакой у хаце (не цэнтральны). У бакавіцы на ло́жка ўскаціўся і ні з ме́сца, тут аж кіпіць усё, а ён у халадку́ адле́жваецца. *Меж.*

БА́ЛА (ба́ла) *прысл.* Бывала. Ба́ла, не то́е, што цяпе́р — да сьне́дання на луку́ зье́жджу і пе́чы пе́ршая вы́палю вярну́ўшыся. *Меж.*

БАЛА́БО́Н (балабо́н) *мужч.* Балбатун. Не слу́хай гэ́тага балабо́на, бо ён табе́ бу́дзе балабо́ніць аж да ве́чара. *Ліс.*

БАЛАБО́СЦІЦЬ (балабо́сьціць), -ч-у, -ц-іш. Гаварыць абы-што. Ве́чна ты балабо́сьціш што папа́ла. *Цял.*

БАЛА́ЎКАЦЬ (бала́каць), -ю, -еш; *незак. тр.* Гаварыць. Сядайця, бу́дзям бала́каць. *Кам.*

БАЛЭ́НДА (балэ́нда) *агульн., зневаж.* Чалавек, які вельмі любіць маніць. У нас е́сьць такі балэ́нда, аткуль то́лькі бярэ́ ўсё, хіба́ гэ́та так бы́ло? *Крок.*

БАМБІ́ЗА (бамбіза) *агульн.* Гультай. Бамбіза гэ́ты туля́ецца цэ́лы дзень бяс спра́вы. *Цял.*

БАНЯ́К (баня́к) *мужч.* Гаршчок для вады. Я ў печ вадý вам паста́віла ў вялікім баняку́. *Мал.*

БАРВІ́НА (барвіна) *жан.* Паляна, парослая маладымі дрэўцамі. У гэ́тым ле́се барві́на рэ́тка сустрака́ецца. *Гіл.*

БАРВЯ́К (барвя́к) *мужч.* Баравік. У на́шых лясáх мно́га барвяко́ў, казяко́ў мно́га, падасі́навікі чырво́ніньк ія сідзя́ць ку́чкамі, як ля́лячкі. *Мул.*

БА́РЗДА (ба́рзда) *прысл.* Надта. Калі́ хэньць падпа́ла ямý вучы́цца, дык бу́дзе вучы́цца, а я ба́рзда і ўпра́шваць ня бу́ду. *Борк.*

БАРЗЕ́Й (барзе́й) *прысл.* Лепш. Мой Ва́ська барзе́й за Сяро́шку ву́чыцца. *Кам.*

БАРЛЯ́ЦІ (барля́ці) *адз.* барля́ць. Доўгія жаночыя боты на шнуроўцы. Такія бо́цікі стары́я ў нас то́лькі барля́ці называюць, а малады́я і сапо́шкі. *Борк.*

БАСТРЫ́К (бастры́к) *мужч.* Рубель, якім уціскаюць снапы, сена, салому. Уціскаюць бастры́кам вос, а то снапкі паскіда́юцца, як бу́дзеце канаву пераязджаць. *Р. Ч.*

БАСЭ́ТЛЯ (басэ́тля) *жан., перан.* Бедная жанчына. Прышо́ў я да гэ́тай басэ́тлі ў пры́мы. *Кам.*

БАТАРЭ́Я (батарэ́я) *жан.* Стог. Быва́ла, батарэ́і се́на стаяць, сало́мы. *Р. П.*

БАТО́ЎЕ (бато́ўе) *ніяк.* Бацвінне. На сяго́дняшні дзень бато́ўе зварылі, бо закра́сы ўжо́ нема́. *Хал.*

БАХІ́ЛЫ (бахі́лы) *толькі мн.* Глыбокія калошы. У тваіх бахі́лах так спра́ўна выглядаюць ва́ленкі, а у маіх ва́ленкі ло́мяцца. *Меж.*

БА́ХНУЦЬ (ба́хнуць), -у, -еш; *зак. тр.* Стрэліць. А тут як ба́хне ра́птам, аш у вушшу́ зазьвіне́ла. *Узгур.*

БАЦВІ́ННІК (бацьві́ньнік) *мужч.* Бацвінне. Нарві́ бацьві́ньніку ў гаро́дзе і ўкі́нь свіньня́м. *Чар.*

БАЧО́К (бачо́к) *мужч.* Бідон. Глянь, по́ўны бачо́к ягат прыне́сла, во малайчы́на. *Ліс.*

БЕРАГУ́ЛЬКА (берагу́лька) *жан.* Ластаўка, якая робіць гняздо ў беразе ракі. У нас тых ла́ставак завуць берагу́лькамі, што ў бе́разя ро́бяць гняздо́. *Дук.*

БІ́БІК (бі́бік) *мужч.* Сініца. Мы кармушку зрабі́лі, дык да нас бі́бікі прылята́юць. *Бар.*

БІ́ЛА (бі́ла) *ніяк.* Верхняя частка спінкі драбін. Зьвесь но́гі праз бі́ла, ямчэ́й бу́дзе сядзе́ць. *Чыж.*

БІЛІТРА́МА (білітра́ма) *жан.* Аканіца. Му́сіт-ка, білітра́мы перакра́сіць трэ́ба. *Чыж.*

БІРАВІ́К (біравік) *мужч.* Баравік (белы грыб). Што біравіко́ў у гэ́тых ме́сцах было́ лета́сь! Усе як часно́к бе́лыя, прыго́жыя, а якія сма́чныя, калі зва́рыш. *Узгур.*

БІ́ТВА (бі́тва) *жан.* Бойка. Як устро́ілі бі́тву, дык ледзь разьня́лі. *Граб.*

БЛАКА́ТАР (блака́тар) *мужч.* Лакатар. Як е́дзеш у Мінск, дык нідалёка ад го́рада блака́тары стаяць і кры́ламі маха́юць. *Уж.*

БЛАГІ′ (благі́) *прым.* Худы. Які ты, сыно́к, благі́ стаў, адны́ ко́сьці. *Уж.*

БЛІЗНЮКІ′ (блізьнюкі́) *адз.* блізьнюк. Блізняты. На́ша дачка́ радзі́ла двух блізьнюко́ў, дык ве́льма ця́шка гадава́ць. *Кук.*

БЛІНО′ЎКА (блінóўка) *жан.* Пасудзіна, у якой рашчыняюць бліны. Памы́й, Ва́ля, блінóўку, а я ба́цьку ка́йстру зьбяру́. *Суц.*

БЛІСКУ′ХА (бліскýха) *жан.* Посцілка з бліскучых нітак. А мае бліскýхі харашэ́йшыя за тваé. *Кам.*

БЛЫ′ТАЦЦА (блы́тацца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр., неадабр.* Хадзіць. Дзе ты то́лькі блы́таўся да гэ́тай пары́. *Раўч.*

БЛЮ′ДАЧКА (блю́дачка) *ніяк.* Сподак. Пакладзі́ вы́ліўкі ў то́е блю́дачка, ку́рыца не́шта ста́ла адны́ вы́ліўкі не́сьці. *Гар.*

БЛЮ′ХНУЦЬ (блю́хнуць) *зак. тр.* Плюхнуць. Як блю́хне дошч, дык усё се́на сапсуé. *Кам.*

БО′ЛБАЦЕНЬ (бóлбацень) *мужч., зневаж.* Балбатун. Калі́ ўжо ты, бóлбацень, перастáнеш балбатáць? *Кам.*

БО′ЛІ (бóлі) *прысл.* Болей. Рві я́блыкаў бóлі, у нас яшчэ́ мнóга. *Чар.*

БО′НДА (бóнда) *жан.* Хлеб з ячменнай мукі. Сьпячэ́ш бóнды, дык хлéбу спарнéй, ня трэ́ба за ім бéхчы кóжны дзень. *Няр.*

БО′РЗДЗЕНЬКА (бóрзьдзенька) *прысл.* Хуценька. Бóрзьдзенька сабірáйся ў дарóгу, хóпіць ужо гавэ́ндаць. *Якш.*

БО′ЎТАЦЦА (бóўтацца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Круціцца пад нагамі, перашкаджаць каму-небудзь. Чаго́ ты бóўтаесься пад нагáмі? *Кам.*

БО′ЦЯН (бóцян) *мужч.* Бусел. Бóцян хóдзіць па балóце, шукáе жáбаў. *Уж.*

БРА′ДЗЕНЫ (брáдзяны) *дзеепрым.* Узяты. Гэ́та ні маё рэ́шата, а брáдзяная. *Кам.*

БРАДО́К (брадо́к) *мужч.* Мелкае месца ў рэчцы, якое можна перайсці. Да́лей на рэ́ццы уніс было́ шмат браткоў. *В. В.*

БРА́ЗГАЎКА (бра́згаўка) *жан.* Бразготка. Мой хло́пчык ве́льмі лю́біць бра́згаўкі, накупі́лі ямў. *Суд.*

БРАЗДЖЭ́ЦЬ (бражджэ́ць), -у, -ыш; *незак. тр.* Стукаць. Малы́я сёньня як пачалі бразджэ́ць пад во́кнамі, дык спасе́ньня не было́. *Цяр.*

БРА́МКА (бра́мка) *жан.* Варотцы. Зачыні́ бра́мку з вуліцы. *Кам.*

БРА́ТКА-КАНДРА́ТКА (бра́тка-кандра́тка) *мужч. Гл.* Андрэйка-Салавейка. Ага́, пе́ршая ўба́чыла я бра́тку-кандра́тку. *Чыж.*

БРА́ТНЯЯ (бра́тняя) *субст. прым.* Пляменніца. Трэ́ба ў ха́ці тро́шка прыбра́ць, бо на э́тай нядзе́лі бра́тняя к нам прые́дзе. *Р. П.*

БРАХА́ЦЬ (браха́ць), -у, -аш; *незак. тр., лаянк.* Гаварыць без толку, нецэнзурна. Вось ужо бро́ша, дык бро́ша, як у яе то́лькі язы́к паварачваецца. *Кам.*

БРАЦІ́ХА (браці́ха) *жан.* Братава жонка. Браці́ха ў мяне́ благая́ была́, ве́чна сварылася. *Р. П.*

БРА́ЦЦА (бра́цца) *незак. тр.* Надыходзіць. Ямў ўжо пат сто гот бярэ́цца, ён шмат чаго́ ве́дая. *Кам.*

БРАЦЕ́ЛЬНІК (браце́льнік) *мужч.* Дваюрадны брат. На сьвя́та браце́льнік мой ме́ўся прые́хаць, але цётка, яго́ ма́ці — сястра́ майго́ ба́цькі, прыхвары́ла і прышло́ся заста́цца зь ёю. *Узгур.*

БРУ́СНІК (бру́сьнік) *мужч.* Шафер. Бру́сьнік сядзіць каля жаніха́, заво́дзіць гу́льні, пе́сьні. *Р. П.*

БРЫДА́ (брыда́) *агульн., зневаж.* Дрэнны, надакучлівы чалавек. Ідзі́ адгэ́туль, брыда́. *Уж.*

БРЫЛЬ (брыль) *мужч.* Выступ у печы, утвораны радам цэглы. Калі́ нямá на брылю́ сьпічак, то шука́й у скры́нцы. *Чыж.*

БРЫ́НДА (бры́нда) *жан.* Брудны, неахайны чалавек. Хо́дзіш тут, бры́нда, адно́ мяша́еш тут. *Уж.*

БРЫ'НДЗЫ (бры́ндзы) *толькі мн.* Абтрапаныя краі адзення. Але ж вот страпа́ў палітó — усе по́лы ў бры́ндзах. *Раўч.*

БРЭ'НКАЦЬ (бро́нкаць), -ю, -еш. Бразгаць. Я вось табе́ за́раз бро́нкну дзвяра́мі, і ты тады́ палу́чыш. *Меж.*

БРЭХ (брэх) *мужч.* Чатырохвугольны стог сена, агароджаны колámі, на якіх ляжыць страха. Прыста́ла я сёньня, се́на ў брэх склада́лі. *Кам.*

БУ'ДА (бу́да) *толькі мн.* Калёсы. Паéхала я на Узду́, ды купíла бу́ду, каня́. *Кам.*

БУ'ДАЧКА (бу́дачка) *жан.* Будан. Нéмцы ха́ту спалíлі, хлеў спалíлі, каро́ву спалíлі, аста́вілі безь нічо́га. Пчо́лы спалíлі, усё спалíлі. Як вярну́ліся зь ле́су — адны́ каміны́. Убíлі ко́лікі, зрабíлі бу́дачку і жылí так да во́сені. *Белар.*

БУЛЬБА'ШНІК (бульба́шнік) *мужч.* Бульбоўнік. Бульба́шнік даўно́ ўжо ско́шаны. *Нар.*

БУЛЬБЕ'ННІК (бульбе́ньнік) *мужч.* Бульбоўнік. Бульбе́ньнік гэ́ты такí ўжо паро́с, ня бу́дзя бу́льбы. *Бяс.*

БУНТАНІ'НА (бунтаніна) *жан.* Блытаніна. Ну і бунтаніна ў вас тут, што канца́ не зно́йдзеш: усё заблы́тана. *Меж.* Блытаніна. Зноў бунтаніна вы́йшла з гэ́тымі граша́мі. *Узгур.*

БУРАКАВІ'ННЕ (буракавíньне) *ніяк.* Бацвінне. Уско́ч на ве́сьнікі, набяры́ буракавíньна і ўкінь тро́ху парасяці. *Узгур.*

БУРКАВА'НЫ (буркава́ны) *дзеепрым.* Брукаваны. Вы па но́вай буркава́най даро́зе éхалі? Там до́бра éхаць на машы́не. *Няр.*

БУРЦА'К (бурца́к) *мужч.* Пячэнне, спечанае з мукі на алеі. Ну, ма́ці, бурцакí ў цябе ўдалíся. *Пал.*

БУСА'К (буса́к) *мужч.* Узгорак. Бяжы́, яны ўжо на буса́к паднíма́юцца. *Даўг.*

БУХА'Н (бухáн) *мужч.* Абаранак. Ко́лісь цуке́рак такíх не было́, то́лькі бухáны пяклí, але ш і яны́ былí сма́чныя. *Бяс.*

БУЦЯ́Н (буця́н) *мужч.* Бусел. На страсе́ буця́н зноў зьвіў сабе́ гняздо́. *Узгур.*

БЫДЛЯ́ЧЫ (быдля́чы), -ая, -ае; *прым.* Қармавы (бурак). Ці пав*е́*рыш, на́ват былі́ быдля́чыя бурак*і́*, ві-да́ць, мно́га навязьлі́. До́бра, што схадзі́ла. *Яц.*

БЭНСЬ (бэньсь) *мужч.* Дзіця, народжанае дзеўкаю да замужжа. Гэ́та, ка́жуць, бэньсь у яе́, а сто́лькі ж го́нару, недатро́га, а цяпе́р зь лю́ляю займа́ецца. *Узгур.*

БЭ́РЛЯЦЦА (бэ́рляцца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Перабіраць ежу, капацца ў ёй, шукаць лепшага. Чаго́ яму ні паста́ў, ўсё ро́ўна бэ́рляецца. *Кам.*

БЭ́ҚАЦЬ (бэ́кацьь), -ю, -еш; *незак. тр., неадабр.* Дрэнна чытаць. Міха́лка не чыта́е, а бэ́кае, але кап се́сьці ды павучы́ць тро́хі — ня хо́ча. *Хал.*

БЭ́ЙБУС (бэ́йбус) *мужч., неадабр.* Лянівы чалавек (у адносінах да маладых людзей). Ну і бэ́йбус. Қо́лькі яму не кажы́, а да яго́ не дахо́дзіць. *Кам.*

БЭ́ЙСЮР (бэ́йсюр) *мужч.* Байструк. Гаўры́лава дзе́ўка бэ́йсюра радзі́ла. І як е́та лю́дзям у во́чы глядзе́ць. *Р. Ч.*

БЯЗЛА́ДЗІЦА (бязла́дзіца) *жан.* Беспарадак. Така́я ужо ў яе бязла́дзіца, уся́ гаспада́рка ху́тка разва́ліцца. *Кам.*

БЯЗРУ́ЧЧА (бязру́чча) *ніяк., зневаж.* Няспрытны, няўдалы ў рабоце. За́рас вазьму́ ро́згу дый па рука́х. Бязру́чча гэ́нае, усё ў яго з рук па́дая. Абы за што ўзя́ўся, так і паб'е́. *Бяс.*

БЯРЭ́ЗАНЬ (Бярэ́зань) *жан.* Беразіна. Хто ба́чыў, на Бярэ́зань аўто́бус ішоў ці не? *Чыж.*

БЕРАЗАВІ́Ҡ (бяразавік) *мужч., збор.* Бярозавыя дровы. Я сабе́ і бяразавіку́ прывязу́, на што мне гэ́ты асіньнік. *Кам.*

БЯСКЛЁ́ПАЧНЫ (бясклёпачны) *прым., неадабр.* Няўважлівы. Такі́ ўжо бясклёпачны мой чалаве́к, ня ба́чыць, што пад но́сам ро́біцца. *Дук.*

БЯССЛО́ЎНЫ (бясслоўны) *прым.* Маўклівы. Як

трэ́ба гавары́ць, дык ён зусі́м бясслоўны: маўчы́ць бы вады́ набра́ўшы. *Граб.*

ВА́′ДЗІЦЦА (ва́дзіцца), -дж-у-ся, -дз-іш-ся; *незак. тр.* Сварыцца. Як ва́дзіліся тады́, дык і цяпе́р не размаўля́юць. *Зап.*

ВАДЗЯНІ́′К (вадзяні́к) *мужч.* Вялікая драўляная конаўка. Ма́ці, дзе наш вадзяні́к, памы́цца трэба. *Р. Ч.*

ВАЖДА́′ЦЦА (важда́цца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Вазіцца. Наштó мне важда́цца з гэ́тымі па́калкамі. *Кам.*

ВАЖКІ′ (вашке́) *толькі мн.* Лейцы. Пацягні́ вашке́, не ба́чыш ці што: конь зварача́е куды́ хо́ча. *Р. Ч.*

ВАКА́′НЦА (вака́нца) *жан.* Вакансія. Як бу́дзя вака́нца, то устро́іцца на рабо́ту. *В. В.*

ВАКУРА́′Т (вакура́т) *прысл.* Своечасова. Мы прышлі́ вакура́т, не спазьні́ліся. *Кам.*

ВАЛАВО́′Д (валаво́т) *мужч.* Вяроўка, на якой водзяць жывёлу. Дзе ён то́лькі гэ́ты валаво́д дзеў? Каро́ву трэ́ба ве́сьці. *Зап.*

ВАЗЯ́′ЦЬ (вазя́ць), -му, -меш; *незак. тр.* Узяць. Во, вазяла́ кні́гу і нічо́га ве́даць ня хо́ча. *Кузьм.*

ВАЛАЧА́′Й (валача́й) *зневаж.* Валацуга. Дзе гэ́та ты па нача́х шля́есься, валача́й? *Узгур.*

ВАЛАЧЫ́′ЦЦА (валачы́цца), -ч-у-ся, -ч-ыш-ся; *незак. тр.* Хадзіць дзе-небудзь без ніякай мэты. Цётка Юзэ́фа дык вало́чыцца ат ха́ты да ха́ты, бы́ццам у сваёй ха́це нямá чаго́ рабіць. *Сям.*

ВАЛБУ́′ХА (валбу́ха) *жан.* Балячка, прышч. На но́сі не́йкая валбу́ха ўсьсе́ла, бали́ць во. *Бяс.*

ВАЛТУ́′ЗІЦЦА (валту́зіцца) -дж-у-ся, -іш-ся; *незак. тр.* Займацца. Валту́зілася, валту́зілася зь ім ды і кі́нула, бо зрабіць не магу́ нічо́га. *Раўч.*

ВАНГО́′Р (ванг′о́р) *мужч.* Вугор. Пры мне, я якра́с старажы́ў се́ткі на берагу́, дык упуска́лі е́тых ванг′о́раў (іх сі́йчас называ́юць угры́, а тады́ называ́лі ванг′о́ры). *Шап.*

ВА́′РА (ва́ра) *жан.* 1. Вараная ежа. Як я ні пад'е́м

ва́ры, дак гало́дная хаджу́. *Уж.* 2. Агародніна, якую вараць (буракі, капуста, морква і г. д.). Ва́ра ў агаро́дзе вы́расла до́брая, бу́дзе што варыць зімо́й. *Мац.*

ВАРО́К (варо́к) *мужч.* Ларок. Нямá чаго́ ісьці, варо́к закры́ты на абе́т. *Вішн.*

ВАРСА́ЦЬ (варса́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Зацягваць аборы ў лапці. Трэ́ба ла́пці заварса́ць. *Р. Ч.*

ВА́РЫВА (ва́рыва) *ніяк.* Вараная страва. Дзе́ўкі, у пе́чы ва́рыва стаіць, калі́ е́сьці захо́чацца, бярыця е́сьця. *Р. П.*

ВА́ТНІКІ (ва́тнікі) *толькі мн.* Ватовыя штаны. Адзе́нь ва́тнікі, а то хо́ладна се́ньня. *Чар.*

ВАЎЧО́К (ваўчо́к) *мужч.* 1. Ёрш. Налавíў ры́бы, адны́х ваўчко́ў, а што зь імі рабíць? Я не ўме́ю нічо́га. *Чыж.* 2. Фігурка, якую прымацоўваюць на самы высокі край даху. Глядзíце, і Іва́н на сваю́ ха́ту ваўчо́к прыбíў. *Чыж.*

ВА́ЦІКІ (ва́цікі), *адз.* ва́цік. Боцікі з нізкімі халяўка́мі. Быў адзíн у нас дурнава́ты, пасвары́ўся з ма́ткай, адзе́ў ва́цікі і ў даро́гу. *Р. Ч.*

ВЕ́ДАЦЬ (ве́даць), -ю, -еш; *незак. тр.* Умець. Ой, ба́пка, я ні ве́даю каро́ў даíць. *Кам.*

ВЕДЗЯРКО́ (ведзяркó) *ніяк.* Вядзерца. Дзет вадзíцы ўзя́ў ведзяркó, глядзíць — ля кало́цца ляжы́ць цялу́шачка. Ён і гэ́ту цялу́шачку забра́ў дамо́ў. *Луб.*

ВЕ́ДЫМА (ве́дыма) *прысл.* Вядома. Ве́дыма, што вучо́ны чалаве́к гаво́рыць гла́тка, ціка́ва, краси́ва. *Узгур.*

ВЕ́ЛЬКІ (ве́лькі) *прым.* Вялікі. Ве́лька ве́ска тая, што за тым узго́ркам. *Бяс.*

ВЕ́ЛЬМА (ве́льма) *прысл.* Вельмі. Ве́льма пат ста́расьць ко́сьці баля́ць. *Кам.*

ВЕ́РМА (ве́рма) *прысл.* 1. Вельмі. Ве́рма яна́ ўсё да галавы́ бярэ́. *Кам.* 2. Лясная сцяжынка. Бу́дзеце ісьці даро́гай, по́тым напра́ва, а там ве́рмачка бу́дзе, от па ёй і ідзíце. *Р. Ч.*

ВЕРХАЛА́З (верхала́с) *мужч., асудж.* Лёгкадумны

чалавек. Увóсень верхалáс прыяжджáў мой. Што зь яго рáдасьці? *Хож.*

ВЕ′ЧКА (вéчка) *жан.* Накрыўка, якой накрываюць гаршкі і збаны. Здымí вéчка вунь с таго́ збáна ды зьбяры́ трóхі сьмятáны. *Крок.*

ВІД (віт) *мужч.* Твар. Ён давáй вадý ды на віт, памы́ўся, ды прайшóў яго́ сон. *Мядз.*

ВІ′ДНЫ (вíдны) *прым.* Прыгожы. Былá янá вíдная жанчы́на. *Кам.*

ВІДО′ЧНА (відóчна) *прысл.* Відавочна. Нí я, дык ён, відóчна, зóйдзе да цябé. *Нар.*

ВІ′ДУЧЫ (вíдучы) *прысл.* Увачавідкі. Вíльгаці зь вясны́ хватáла, а яшчэ́ сóнца,— вíдучы ўсё йшлó ўгарý. За ноч картóшка на пáляц падрастáла, калíўе лапушы́стае адрáзу ў калéна стáла. *Белар.*

ВІЖАВА′ЦЬ (віжавáць), -ю, -еш; *незак. тр.* Сачыць. Во éты чалавéк праслáвіўся на ўсю вёску. І вы дýмаеце чамý? А тамý, што ён любíў віжавáць за другíмі і яго злавíлі. *Р. Ч.*

ВІСКІ′ (віскí), *адз.* вісóк. Скроні. Е′ла ж як дась мне ў віскí, аш у галавé пацямнéла. Дýмала не вы́жыву, але нейк ачуня́ла. *Р. П.*

ВІТУ́′ШКА (вітýшка) *жан.* Матавíла, прылада, на якую наматваюць пражу. Спрадзём на калаўрóт прáлі, на вітýшкі саўём, гэ́тыя вітýшкі дзьве састáвім, дзьве нítачкі з вітýшак пачэ́пім на столь і снуём на сьцяну́. *Пап.*

ВО′БРУЦЬ (вóбруць) *жан.* Лейцы. Даў сусéду вóбруць, а ён усё нí прынóсіць. *В. В.*

ВО′ГНІК (вóгнік) *мужч.* Тэрмометр. Пашукáй там у прыскры́нку фігýлкі ад вóгніка. *Борк.*

ВО′ЖКІ (вóшкі) *толькі мн.* Лейцы. Твае́ вóшкі чуць ліпя́ць, баю́ся, што парвýцца, не бýдзе чым кіраваць. *Неж.*

ВО′ХВАТ (вóхват) *мужч.* Чорт. Як малáя былá, дык ўсё вóхватам страшылí. *Р. Ч.*

ВО′ПАЧКА (во́пачка) *жан.* Вешалка ў паліто. Во́пачку адарва́лі, палітó ве́шалі. *Н. Д.*

ВО′ТЧЫМ (во́ччым) *мужч.* Айчым. Глядзíць чужы́х дзяцéй, як свáіх, во табé й во́ччым. *Ліс.*

ВО′СЕЦЬ (во́сіць) *жан.* Мера лёну; колькасць снапкоў лёну, якія ўмяшчаюцца ў будынку-сушылцы. Ранéй ко́жная мя́лка па тры во́сіці вымінáла лёну за во́сінь, а ціпе́рака й калаўро́ты павыкíдывалі. *Аўг.*

ВУ′ГАЛ (ву́гал) *мужч.* Дом. Тут у мяне́ ву́гал харо́шы і жыве́цца до́бра, але́ ш у Пліцíвішчах ле́пей было́. *Р. П.*

ВУГНЯ′ВІЦЬ (вугня́віць), -ю, -іш; *незак. тр.* Гугнявіць. Вугня́віць, што нічагéнечкі не разьбярэ́ш. *Ліс.*

ВУДАВЕ′Ц (вудаве́ц) *мужч.* Удавец. Жóнка яго як памéрла, дык ён вудаўцóм жыў увéсь час, пакýль сам не памéр. *Р. П.*

ВУ′КСУС (ву́ксус) *мужч.* Воцат. Схава́й ву́ксус ад дзяцéй, а то патру́цяцца. *В. В.*

ВУЛДЫ′Р (вулды́р) *мужч.* Гуз. Ну і сту́кнулася, што аж вулды́р усхапíўся. *Граб.*

ВУ′ЛКА (ву́лка) *жан.* Праход з асноўнай вуліцы. Бягучы́ па ву́ліцы, яны звярну́лі ў тую́ ву́лку, што паўз Анто́нчыкавай сядзíбы ідзé. *Узгур.*

ВУМ (вум) *мужч.* Розум. Аткýль ты такí вум ма́еш і скуль ты ўзя́ўся: усе мóгуць пара́іць, а вось зрабí папро́буй. *Узгур.*

ВУ′ПАР (ву́пар) *мужч., неадабр.* Упарты чалавек. А ён такí ву́пар, нікóлі не паслýхае, хоць распрасíся. *Уж.*

ВУСА′Ч (вуса́ч) *мужч.* Ячмень. Калóсься вуса́ча́ по́ўныя-по́ўныя, ужо зусíм пасьпе́лі. *Мал.*

ВУШНЯ′К (вушня́к) *мужч.* Вушак. На вушнякí Васíль кра́скі купíў. Трэ́ба бýдзе пакра́сіць. *Бяс.*

ВУША′Т (вуша́т) *мужч.* Цэбар. Была́ ў мяне́ каро́ва, папа́ла у вуша́т сьцякло́, а яна́ ўзяла́ ды вы́піла і здóхла. *Кук.*

ВЫБІРА′ЦЬ (выбіра́ць), -аю, -еш; *незак. тр.* Выра-

заць па дрэве. Дзяцька вельмі ўжо хораша выбірае на дрэве расцом узоры. *Гіл.*

ВЫ'БУХАЦЬ (выбухаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Выліць (неэканомна расходаваць). І калі ж ты пасьпеў гарачую ваду выбухаць? Яшчэ ўся работа напярадзе ды і смаліць яшчэ не закончылі. *Меж.*

ВЫ'БУШАВАЦЬ (выбушаваць), -ю, -еш; *зак. тр.* Выкінуць. За тры гадзіны ўвесь гной выбушавалі с хлява. *Пап.*

ВЫВЁ'РТКІ (вывёрткі), -ая, -ае, *прым.* Вёрткі. Быў кавалер і ў мяне. Цымбаліст. Вывёрткі быў хлапец: рвік за бок адну, скуб другую — усе ад яго ўцякалі. *Пуз.*

ВЫГАГО'ЙЛА (выгагойла) *агульн.* Вымагальнік. Выгагойла яна, твая Марўська: колькі не давай, а ўсё мала. *Граб.*

ВЫГАНЯ'ЦЬ (выганяць), -ю, -еш; *незак. тр.* Зарабіць. Трактарысты вясною па 300 рублёў за месяц выганяюць. *В. В.*

ВЫ'ДАЦЬ (выдаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Адлупцаваць. Хай лепяй ні паказуяцца, бо я ямў выдам добра. *В. В.*

ВЫ'ДУРЫЦЬ (выдурыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Абдурыць. Да сям'і тут далёка, як да неба. Адно вядома: выдурыць ён яе, пакіне голую як ліпку і айда. *Неж.*

ВЫЖАНЯ'ЦЬ (выжаняць), -ю, -еш; *незак. тр.* Выганяць. Ты ж, дзіцятка, выжанеш каровy. *Кам.*

ВЫ'КАПАНЫ (выкапаны) *дзеепрым.* Выліты, падобны. А Валік твой — выкапаны бацька! *Бр.*

ВЫ'КАТ (выкат) *мужч.* Дэкальтэ. Спачатку выраж выкат, а тады ўжо і прайму. *Чар.*

ВЫ'КЕШКАЦЬ (выкешкаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Ачуняць, паправіцца. Ранены быў, рука пачала гнісьці. Жылы былі відаць. Каб левая балела, то можа памёр бы, а то правая,— неяк выкешкаў. *Бяс.*

ВЫ'КІНУЦЦА (выкінуцца) *зак. тр.* Вырасці, з'явіцца. За ноч столькі грыбоў выкінулася, што як пайшоў у

лес, дык во́чы разьбяга́юцца, не ве́даеш като́ры і браць. Пасьля́ дажджу́ баравікі павінны вы́кінуцца. *Неж.*

ВЫ́МАГЛЯВАЦЬ (вы́маг′ляваць), -юю, -еш; *зак. тр.* Выпрасаваць у маглях. Хай сабе́ й прасава́ць амаль што ні тро́ба, ма́г′лі вы́маг′лююць, але ш дзьве́сьця пяцьдзеся́т штук і пяцьдзеся́т каўняро́ў! *Паг.*

ВЫПУЛА́ГАЦЬ (выпула́гаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Выбіваць. Ці мо́жна так выпула́гаць адзе́ньне? Яно́ ху́тка парве́цца. *Р. П.*

ВЫ́ЛУПІЦЬ (вы́лупіць), -л-ю, -іш; *зак. тр.* Адлупцаваць. Бу́дзеш дуро́ць — ба́цьку скажу́, дык вы́лупіць ён цябе́. *Гіл.*

ВЫ́ПАРАЦЬ (вы́параць), -у, -аш; *зак. тр.* Знайсці. Цукерку дзе якую вы́пара, усё з′есць. *Кам.*

ВЫ́ПАРАЦЬ У КНІ́ЗЕ. Вычытаць у кнізе. Го́та я ў кні́зі вы́парала, тро́ха ж умею́ чыта́ць. *Кам.*

ВЫПЯВА́ЦЬ (выпява́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Спяваць. Дрост так хо́раша выпява́я, аж заслу́хаяся. *Кам.*

ВЫ́РАЎНЯ (вы́раўня) *жан.* Капец. А ў про́шлым го́дзе было́ сто́лькі бу́льбы, што ў сто́пку не ўле́зла, дык мы ў вы́раўню закапа́лі. *Кук.*

ВЫРЫ́ЎНЯ′ (вырыўня) *жан.* Хлеў. Маладыя ка́жуць хлеў, а мы вырыўня́. *Р. Ч.*

ВЫРО́СТАЦЬ (выро́стаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Вырастаць. Трава́ тут выро́стае аж па по́яс. *Кам.*

ВЫ́РУБ (вы́руп) *мужч.* Зруб. Во, Максім хату́ ско́ра ко́нчыць — вы́руб ужо гато́вы. *Бяс.*

ВЫРЭ́ЗНА (вырэзна) *прысл.* Выразна. Наш стары́ дык яшчэ́ на́тта вырэ́зна размаўля́е. *Папл.*

ВЫ́СМЕГНУЦЬ (вы́сьмегнуць) *зак. тр.* Выкіпець. Чаго́ го́та ён гамо́ніць? У мяне́ і вада́ ў чыгуне́ вы́сьмегла. *Суц.*

ВЫСТРЭ́НЧВАЦЬ (выстрэ́нчваць), -аю, -еш; *незак. тр.* Дагаджаць. Ну дык вы прывы́клі, каб вам усё выстрэ́нчваць, а я ужо́ стара́я, не магу́. *Раўч.*

ВЫСЫПА́ЛЬНІКІ (высыпа́льнікі) *толькі мн.* Пер-

шыя грыбы. Ужо высыпа́льнікі зьявіліся ў на́шум ле́сі. *Кам.*

ВЫЦІРА′ЛЬНІК (выціра́льнік) *мужч.* Ручнік. Па тутэ́йшаму зві́чаю для гасьце́й прына́сіцца чы́сты выці-ра́льнік. *Узгур.*

ВЫЦЬ (выць), -ю, -еш; *незак. тр.* Плакаць. Чаго́ ты вы́еш, як па пако́йніку, нідзе́ яны́ ні дзе́нуцца, гэ́тыя хло́пцы: пае́зьдзяць, па́езьдзяць і ве́рнуцца. *Узгур.*

ВЫ′ШКІ (вы́шкі) *толькі мн.* Прыстасаванне на ўзроўні столі, на якое можна класці збожжа ці сена. Гэ́тае се́на складзе́м на вы́шкі, яго ж нама́ла зьме́сьціцца, калі́ закладзе́м аж да сто́лі. *Узгур.*

ВЫХВАЛЯ′КА (выхваля́ка) *агульн., зневаж.* Хвалько. Выхваля́ка, узяў бы ле́пей ве́нік, ды і тро́хі маханў́ў. *Хож.*

ВЫ′ХВАТКІ (вы́хваткі), *адз.* вы́хватка. Бліны. На сьне́даньне вы́хваткі с ты́ўкаўкай. *Дуб.*

ВЫ′ЦУХМАЛІЦЬ (вы́цухмаліць), -ю, -іш; *зак. тр.* Запэцкаць. Ні пасьпе́ла надзе́ць но́вай суке́нкі, як вы́цухмаліла ўсю́. *Кам.*

ВЫЦЯГА′НКА (выцяга́нка) *жан.* Саматканая посцілка з выцягнутымі ніткамі. Ка мне ш з Масквы́ прыязджа́лі, дзьве выцяга́нкі на фа́брыку забра́лі. *Кам.*

ВЫ′ЧХАЦЦА (вы́чхацца) *зак. тр.* Страціць рэзкі пах. Хрэн жа зусім ма́ла пастая́ў, а зусім вы́чхаўся. *Гар.*

ВЫЯ′ЎНА (выя́ўна) *прысл.* Выразна. Гавары́ выя́ўна, бо я не разьбіра́ю, што ты ка́жаш. *Цяр.*

ВЭ′НДЗАЦЦА (вэ́ндзацца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.; неадабр.* Хадзіць без справы. Няма́ чаго́ рабіць, дык вэ́ндзаецца с кутка ў кут, а каб ра́шку вы́несьці — ня мо́жа. *Раўч.*

ВЭНЬ (вэнь) *часц.* Вунь. Вэнь стаіць вядро́, схадзі вазьмі і прынясі вады́. *Узгур.*

ВЭ′НЯКА (вэ́няка) *часц.* Вунь. Вэ́няка там вазьмі но́вую ху́стку. *Дук.*

ВЯГА′ЛА (вяга́ла) *жан.* Мянтуз. Лавіць ры́бу люб-

лю́, а е́сьці так сабе́. Адна́ то́лькі мне да сма́ку — вяга-ла: і по́ліўку люблю́ зь яе і мя́са. *Ст. В.*

ВЯРО́ПАЎКА (вярóпаўка) *жан., лаянк.* Тоўстая не-прыгожая жанчына. Што ты, вярóпаўка, вярзе́ш? *Кам.*

ВЯРСТА́′ (вярста́) *жан.* Капа сена. Цэ́лых дзьве вяр-сты́ се́на се́ньня табе́ накла́лі, а ты ка́жаш, што ма́ла. *Р. Ч.*

ВЯРТЛІ′ВЫ (вяртлі́вы), -ая, -ае, *прым.* Вёрткі. Му-жыкі́ паду́малі, што я зда́ўся таму́ барцу́, а не то́я тут было́. Вяртлі́вы быў я ве́льмі. Зноў вы́вярнуўся і ўжо як сеў на яго́, так не зьлес, по́куль ён ні зда́ўся. *Белар.*

ВЯРТУ́′Н (вяртун) *мужч.* Жвавае дзіця. Ну і вяртун, ні міну́ты не пасядзі́ць на ме́сцы. *Бяс.*

ВЯЧЭ′РАШНЯЕ (вячэ́рашняе) *прым.* Вячэрняе. Я, зна́яце, малачко́ ста́ўлю ў хало́дную ваду́, каб не скі́сла. Гля́ньце, учара́шняе вячэ́рашняе, а ня скісла. *Белар.*

ВЯША′К (вяша́к) *мужч.* Вешалка. Трэба палітó на вяша́к павéсіць, а ты што кінуў яго́? *Нар.*

ВЯШНЯ′К (вяшня́к) *мужч.* Вясновае парася. У мяне́ парася́ткі вешнякі́. *Кам.*

Г

ГАБЕ′ЛАК (габе́лак) *мужч.* Гэблік. Е′тым габе́лкам шчэ дзет мой габляваў. *Р. П.*

ГАБЛЯНУ′ЦЬ (габлянýць), -у, -еш; *зак. тр.* Напісаць на скорую руку. Узяла́ і габлянýла пісьмо́, ні паду́маў-шы. *Кам.*

ГАВЭ′НДА (г′авэ́нда) *жан.* Грамада. Цэ́лая г′авэ́нда людзе́й на ву́ліцы, ба́чыце? *Борк.*

ГАВЯ′ДА (гавя́да) *жан.* Буйная рагатая жывёла. Ён наня́ўся гавя́ду па́сьвіць. *Уж.*

ГАЗУ′ЛЕЧКА (газу́лечка) *жан.* Газовачка. Мае два браты́ хадзі́лі ў шко́лу, тут была валасна́я чатырохкла́с-ная шко́ла. Карасіну не было́, газу́лічку ету ма́ма запа́-ліць, яны́ пад гэ́най газу́лічкай сьлепяцца. *Бяс.*

ГАЙЦА′ЦЬ (гайца́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Гойсаць. А ён гайца́е, як дурны́. *Уж.*

ГАЛАВА′СЦІК (галава́сьцік) *мужч., зневаж.* Чалавек з вялікай галавой. От ужо галава́сьцік, ну і галава́ш у яго. *Мядз.*

ГАЛАВА′Ч (галава́ч) *мужч.* Галавень. Учо́ра ён налавіў шмат галавачо́ў. *Р. П.*

ГАЛАВЯ′ЗКА (галавя́зка) *жан.* Любая хустка. Мары́лька сабе́ газо́ўку купі́ла, а мне каб яку́ю галавя́ску прасі́ла прывёсьці. *Борк.*

ГАЛАГУ′Н (галагу́н) *мужч.* Певень. Вот гэ́ны галагу́н, ко́жную ра́ніцу пабу́дзіць. *Кам.*

ГА′ЛДА (га́лда) *агульн.* Гультай. Дзе́ці ляну́юцца працава́ць, са́ма ста́рша га́лда така́я, увесь дзень бе́гае па ву́ліцы. *Р. Ч.*

ГАЛЕ′НЬ (гале́нь) *мужч.* 1. Венік без лісцяў. Каля га́нка валя́ецца гале́нь пад нага́мі, то прынясі́ сюды́. *Хац.* 2. Дзяркач. Нідзе́ гальня́ не знайду́, за́ўтра сьвя́та, падло́гу тро́ба памы́ць. *Р. Ч.* Ці ж с такім у ба́ню хадзіць, гале́нь, а не ве́нік. *Чар.*

ГАЛЁ′КАЦЬ (галёкаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Крычаць. Чаго́ ты галёкала сёньня? *Кам.*

ГАЛЬЕ′СКО (гальёско) *ніяк.* Прас. Іржа́ пабі́ла гальёско, німа́ чым прасава́ць. *Уж.*

ГАМО′НКА (гамо́нка) *жан.* Гутарка, размова. Ну і зашла́ тут гамо́нка така́я, хто як, але ўсе вы́казалісь. *Турэц.*

ГА́МУ′З (гаму́с) *мужч.* Шум. Такі́ гаму́с паднялі́, што аж на ву́ліцы чутно́. *Ліс.* Паднялі́ такі́ гаму́с, што хоць з ха́ты цяка́й. *Уж.*

ГАНЬБО′ВЫ (ганьбо́вы) *прым.* Які́ мае недахоп. Я таго́ пла́цьця ня купі́ла, бо яно ганьбо́вая і на яго зьні́жана цана́. *Дук.*

ГАНЯ′ЦЬ (ганя́ць), ю-, -еш; *незак. тр.* Акучваць. Брыгадзір каня́ ня доў ганя́ць бу́льму, бо на рабо́ту ма́ла хадзі́ла. *Р. Ч.*

ГАНЯ′ЛКА (ганя́лка) *жан.* Акучнік. Трэба ганя́лку ўзяць і абагна́ць бу́льму, а то перарасьцé. *Р. П.*

ГАПЕ′ШЫЦЬ (гапе́шыць), -у, -ыш; *незак. тр.* Луцаваць. Ну, браты́ і пайшлі́ с кала́мі, прыбяга́юць на гумно́, глядзя́ць, а там пад плітóй вуж, яны дава́й яго́ гапе́шыць кала́мі. *Р. П.*

ГАРАВА′ЦЬ (гарава́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Настойлі́ва, цяжка працаваць. Ране́й лю́дзі зімý і ле́та гарава́лі з ра́нку да ве́чара, сьпíны гнýлі. *Сям.*

ГАРБУЗЯ′НКА (гарбузя́нка) *жан.* Каша з гарбузоў з прасянымі крупамі. Гарбузя́нка сма́чная е́жа, калі́ вы́беры́ш сало́ткі гарбу́с, да яшчэ́ даба́віш са́хару, тады́ па́льчыкі абліжаш. *Бяс.*

ГАРДЗІЁН (гардзіён) *мужч.* Акардыён. Мая мало́чшая вот хо́раша на гардзіёні гра́е. *Ліс.*

ГАРДЗІ′СЫ (гардзíсы), *адз.* гардзіс. Карнізы ў акне. Быва́ла, гардзíсы ўкраша́лі, каб было́ прыгажэ́й гляде́ць на во́кны. *Р. П.*

ГАРМО′НЯ (гармо́ня) *жан.* Гармонік. Палажы́ла на гармо́ню буке́т цьвятóў, каб гарманíст ахво́тней іграў. *Ліс.*

ГАРМУ′ШКА (гармý́шка) *жан.* Хлеб, пакрышаны ў салодкую ваду. Ле́сік лю́біць гармý́шку, ямý́ абы́ сало́ткая была́. *Кірк.*

ГАРО′Д (гаро́т) *мужч.* Агарод. Каб вы ве́далі, ко́лькі цяпе́р рабо́ты на гаро́дзі: і гра́ды рабíць, цыбу́лечку садзíць, і пад гýркі гато́віць ме́сца. *Узгур.*

ГАРО′ХАЎКА (гарóхаўка) *жан.* Гарохавы суп. Вы́цягні ві́ламі сага́н з гарóхаўкай, навары́ла се́ньня, як прасíлі. *Дубр.*

ГАРСЭ′Т (гарсэ́т) *мужч.* Накідка на падушкі. Даўне́й э́тых гарсэ́таў не было́, а за́раз дык у ко́жнай ха́це. *Р. Ч.*

ГАРЦА′ЦЬ (гарца́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Шпарка ездзіць. Гарца́лі на стае́нных ко́нях па по́лі. *Ліс.*

ГАРЭ′ШНІК (гарэ́шнік) *мужч.* Арэшнік. Ко́лькі ў нас гарэ́шніку, а арэ́хаў нямá. *Кам.*

ГАРУ′МКІ (гару́мкі) *толькі мн.* Насенне гароху. Гару́мкі заўжды ўзо́йдуць, былі́ п у іх здаро́выя расткі́. *В. В.*

ГАФТ (гафт) *мужч.* Вышыўка на адзенні. Не забу́дзь для га́фта купіць цвятны́х ніцяў. Трэ́ба ж зако́нчыць капта́н — хай дзіця́ но́сіць. *Узгур.*

ГА′ФТАВЫ (га́фтавы) *прым.* ад гафт. Вышываны. Чыя́ гэ́та дзе́ўчына у га́фтавым каптане́? Як снягу́рачка размаля́ва́ная. *Узгур.*

ГАРШЧЭ′НАК (гаршчэ́нак) *мужч.* Гаршчок. Я грыбы́ перабра́ла, а по́тым загатава́ла гаршчэ́нак ва́ру, загатава́ла ва́рам, ускі́нула на скавaро́тку. *Мал.*

ГАРШЧЭ′ЧНІК (гаршчэ́чнік) *мужч.* Прыстасаванне, якім вымаюць гаршкі з печы. А я ж стара́ ўжо, а чыгуны́ с пе́чы ця́шкія цяга́ю, а не ба́чу ўжо. Быва́е, гаршчэ́чнікам зачаплю́ за бок і бядá, хоць с ха́ты ўця́кай. *Р. Ч.*

ГАТО′ВІЦЦА (гато́віцца), -ю-ся, -іш-ся; *незак. тр.* Рыхтавацца. Да каля́даў яны заўсе́ды гато́віліся, а гэ́ты раз го́ра вялі́кае — нічо́га не ро́бяць, як і сьвя́та не сьвя́та. *Граб.*

ГА′ЧАК (га́чак) *мужч.* Булаўка англійская. Некато́ры дзяўча́тка і цяпе́р на га́чках но́сяць ю́пкі, ляні́цца ўшыць аплічо́к і так і зно́сіць. *Р. Ч.*

ГА′ЧКА (га́чка) *жан.* Матыка. Відáць, на по́ля пашлі́, бо Га́нька з га́чкай і жалязьняко́м. *Заб.*

ГА′ШТАР (га́штар) *мужч.* Флёкс. Люблю́, калі́ каля́ ха́ты га́штар цьвіце́. *Мац.*

ГЕ′СТКА (ге́стка) *жан.* Блюзка. Я ўчо́ра набра́ла мульта́ну на ге́стку. *Дук.*

ГІБЗО′ВЫ (гібзо́вы), -ая, -ае, *прым.* З гіпсу зроблены, гіпсавы. Далі́ мне каранда́ш, гібзо́выя пальча́ткі, гібзо́вы пярэ́днік круго́м надзе́ты з рукава́мі і паста́вілі разры́ўныя грана́ты, што кідаю́ць, от такія ма́лянькія, от як бутылачка такія ма́лянькія, правяра́ць. *Паг.*

ГІЛЯВА′ЦЬ (гіляваць) *незак. тр.* Бегаць, насіцца (аб жывёле). Се́ньня го́рача, бу́дуць каро́вы гіляваць. *Гар.*

ГІ′РКАЦЬ (гі́ркаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Гаварыць злосна. Чаго́ ты гі́ркаеш, як на сваё? *Прудз.*

ГІЧА′ННЕ (гіча́нё) *ніяк.* Бурачнік. Схаджу́ каню́шы́нкі тру́сікам нарву́. А мо́жа й ні пайду́ ў каню́шы́нку, гіча́ня падкі́ну. *Сав.*

ГЛУБАЧЭ′Й (глубачэ́й) *прысл.* Глыбей. Паткапа́й глубачэ́й я́мку, бу гэ́так ме́лка карэ́ньне не памёсьціцца. *Ліс.*

ГЛУ′МІЦЦА (глу́міцца) *незак. тр.* Псаванца. Навары́ла ка́шы, а ніхто́ ні е́сьць, дак сэ́рца бали́ць, што глу́міцца. *В. В.*

ГЛУХА′Я СЦЯНА′ (глуха́я сьцяна́) *будаўн.* Сцяна з суцэльных бярвенняў, без вокан і дзвярэй. Ба́чыш, хату паста́віў глухо́й сьцяно́й на ву́ліцу, разгарадзі́ў перага-ро́ткай на дзьве палаві́ны. *Белар.*

ГЛУХІ′ ГРЫБ (глухі́ грып). Невядомы. Глухія грыбы́ ні зьбіра́йця, іх жа ні мо́жна е́сьці, бо патру́ціцяся. *Р. П.*

ГНІЛЯ′К (гніля́к) *мужч., неадабр.* Хваравіты. Так усё жыцьцё гніляко́м пражы́ў, чаго́ то́лькі не рабі́лі. *Зап.*

ГНУ′ШКА (гну́шка) *жан.* 1. Днушка. Ні стаў скавара-ду́ на насто́льніцу, вазьмі́ гну́шку і паста́ў. *Кам.* 2. Падстаўка пад чыгуны. Дава́й сюды́ гну́шку, скварадзе́ не хачу́ на стол ста́віць, гара́чая ве́льмі. *Кірк.*

ГНЯЗДО′ (гняздо́) *ніяк.* Выемка на канцы бервяна, у якую кладуць другое бервяно, каб вылажыць вугал будыніны. Ро́ўна кладзі́ бервяно́, а то ву́гал скры́віш. *Бяс.*

ГО′ВАР (го́вар) *мужч.* Размова, гаворка. У нас зь ім зусі́м другі́ го́вар бу́дзя пра гэ́ту спра́ву. *Так.*

ГО′ЙСАЦЬ (го́йсаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Шпарка хадзіць, ездзіць. Кап ён ні го́йсаў на лісапе́дзі па ву́ліцы так, усё было́ б до́бра. *Р. П.*

ГО′НЯ (го́ня) *жан.* Доўгая паласа жыта. Даўне́й як вы́ганеш пятна́ццаць го́ней, так утомі́ся, што й нох не павалачы́. *Р. Ч.*

ГО′ПНУЦЬ (го́пнуць), -у, -еш; *зак. тр.* Упасці. А ён го́пнуў, дак нагу́ і зламо́ў. *Р. П.*

ГО′РЫН (го́рын) *мужч.* Мулінэ. Суке́нка ў маёй дачкі́ го́рынам вы́шыта. *Кам.*

ГРА′БІЦЬ (гра́біць), -бл-ю, -іш; *незак. тр.* Грэбці. Адзі́н раз на казьбе́ пан і па́рабак гра́білі се́на. Пан награ́біў пласт і ка́жыць: «О гэ́та маёй каро́ве, бо я малако́ п'ю зь яе». *Мік.*

ГРА′МАЦЬ (гра́маць) *жан.* Грамата. Ране́й дык не вучы́лі до́бра гра́маці, кап то́лькі распіса́цца ўме́лі — і ўсё тут табе́. Усё ро́ўна про́стаму мужыку́ і́ншай рабо́ты не было́, а то́лькі ара́ць, се́яць, жаць, што́ та́я гра́маць. *Бяс.*

ГРАЦКО′ВАЯ КРУПА′. Грэчневыя крупы. Учо́ры ў Мі́нск е́зьдзіла ды купі́ла грацко́вай крупы́. *Бяс.*

ГРУ′ЦКА (гру́цка) *жан., памяньш.* ад груца. Тро́ба кап капу́стачка ўпро́ла ды гру́цка ўвары́лася — вось тады́ бу́дзе і на ра́ніцу і на абе́т. *Пал.*

ГРЫБАВО′ЧАК (грыбаво́чык) *мужч.* Грыбнік, які ведае, дзе растуць грыбы. Грыбаво́чык ён до́бры, але ж кап каму́ другому́ сказа́ць... *Хал.*

ГРЫ′ВЕНЬ (гры́вень) *мужч.* Манета ў 10 кап. Хаце́ла купіць ко́хту, але не хапі́ла аднаго́ гры́ўня. *Кук.*

ГРЭ′БЕНЬ (грэ′бінь) *мужч.* Прылада часаць лён. Жме́нькі мя́тага лёну тады́ чэ́шым. Такія дрыўля́ныя грабяні́ былі́, з дубо́вых пла́шак паро́бляны, у гэ́ту пла́шку ўбі́ты дубо́выя зубы́, і мы чэ́шым пе́рвы рас. Гэ́та атні́ма́юцца камлі́ і вярхі́: вярхі́ го́ршыя, камлі́ ле́пшыя. *Пап.*

ГРЭ′ЙКА (грэ́йка) *жан.* Грэлка. У вас мо́жа грэ́йка е, а то так зуб бале́ць. *Св.*

ГУГНІ′ВЫ (гугні́вы) *прым.* Гугнявы. Ёсьць у нас на сяле́ гугні́вы Я′шка, дык нічо́га не разабра́ць, што ён гаво́рыць. *Кук.*

ГУЛЯ′ЦЬ (гуля́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Заляцацца. Ме́ньшы да а́рміі не жані́ўся, гуля́ў то́лькі зь дзе́вачкай. Вярну́ўся, забра́ў яе і жыве́ цяпе́р. *Бяс.*

ГУННО′ (гунно́) *ніяк.* Гумно. Вот жы́та ўрадзі́ла сяго́лета, цэ́лае гунно́ снапоў накла́лі. *Р. Ч.*

ГУНО′РНАЯ (гуно́рная) *прым.* Ганарлівая. Бач, яка́я гуно́рная, як пае́хала ў го́рат, дык і нос задра́ла. *Бяс.*

ГУ′НЬКА (гу́нька) *жан.* Дзяруга. Гу́нькай ло́шкі засьці́ла́ем у бу́дны дзень. *Уж.*

ГУНСПО́′Д (гунспо́т) *мужч.* Вешалка ў паліто (у мове старэйшых). Пальто́ ў яе прыго́жае, а гунспо́д адарва́ны і прышы́ць ня мо́жа. *Мал.*

ГУ′РА (гу́ра) *жан.* Гара. У нас нім а́ гу́раў, а ў другі́х мяста́х дак і гу́ры вялі́кія і каме́ньняў мно́га. *Р. П.*

ГУРКО′ЎНІК (гурко́ўнік) *мужч.* Агурочнік. Гурко́ўнік пасо́х, гурко́ў не бу́дзе. *Чар.*

ГУ′СКІ (гу́скі) *толькі мн. Гл.* бабок. На тым бало́ці мно́га гу́сак расьце́. *Р. П.*

ГУСЦЕ′РАЗНЫ (гусьце́ражны) *прым.* Вельмі густы. Прыго́жая была́ дзеўка і ко́сы ў яе гусьце́ражныя былі́. *Кам.*

ГУСЦЯРНЯ′К (гусьцярня́к) *мужч.* Густы падлесак. Чаго́-чаго́, а я́гат хвата́я. Круго́м жа лясы́. По́йдзіш за ро́чку, тро́хі по́ля — і ляско́к. Або з го́тага канца́. Ву́ліца канча́іцца — і адра́зу гусьцярня́к. *Белар.*

ГУ′ТА (гу́та) *жан.* Шклозавод. Каля мо́гілак гу́та стаяла, за́раз яна́ разва́леная. *Стар.*

ГЛЫТ (глыт) *мужч.* Глыток. Адзі́н глыт вады́ глыну́ла се́ньні, у ро́ця ўжо перасо́хла. *Р. Ч.*

ГЭ′ЙСЯ (гэ́йся) *займ.* Гэта. На́ гэ́йсю ху́стку надзе́нь, а ў мяне́ друга́я е́сіка. *Мац.*

ГЭ′НДЗЯ (гэ́ньдзя) *прысл.* Там, у тым месцы. Сяць, дачка́, піса́ць гэ́ньдзя, на то́е кро́сла, там сьвятле́й,— ніпамы́сная і ва́ша рабо́та: і дзяце́й вучы́ і да стары́х прыхо́дзь. *Яц.*

ГЭ′НУДЫ (гэ́нуды) *прысл.* Туды. Дзе го́та Ю′зік? Няўжо́ гэ́нуды пайшо́ў? *Мац.*

ГЭ′САЛЬ (гэ́саль) *мужч., зневаж.* Прайдзісвет. Гэ́ны гэ́саль па усёй зямлі́ дзяцёй маé. *Кам.*

Д

ДАБРАВІ′ТЫ (дабравíты) *прым.* Добры. А ён чалавéк дабравíты, нямá чагó і казáць. Што не папрасí — усё зрóбіць. *Хож.*

ДАБРА′К (дабрáк) *мужч.* Баравік. Пайдýць дажджы́, дак бýдзем дабракí зьбірáць і сушы́ць. *Р. Ч.*

ДАВЕ′ДКІ (давéткі) *толькі мн.* Наведванне. Як пашлá ўчóра ў давéткі — і сёньня німá. *Ліс.*

ДАГЛЯДА′ЦЦА (даглядáцца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Рабіць хатнюю работу. Маé дзéткі, німá мне часý, трэ́ба ш яшчэ́ даглядáцца ісьцí. Вы прыдзíця пазьнéй, дак я мóжа што ўспóмню і раскажý вам. *Бяс.*

ДАЖДЖУ′ЙКІ (дажджýйкі) *толькі мн.* Кароткія гумавыя боты. Дажджýйкі абувáй на балóта і на дошч. *Борк.*

ДАЛЁ′ЗНА (далёзна) *прысл.* Вельмі далёка. Мы ў грыбы́ рэ́тка калí хóдзім, бо да лéсу далёзна. *Дук.*

ДА′ЛІ (дáлі) *прысл.* Далей. Атайдзí трóхі дáлі, а так мне нічóга не відáць. *Кам.*

ДА ПО′СЛЕДКУ (да пóсьлетку) *прысл.* Да канца. У яго нікóлі не хапае цярпéньня давéсьці прáцу да пóсьлетку. *В. В.*

ДАРМО′ (дармó) *прысл.* 1. Нічога. Дармó, не шкадýй ты гэ́ту пабíтую шкля́нку. *Дубр.* 2. Добра. Наш стары́ ўжо дармó сябé атчувáе, а то такí **быў, лець хадзíў.** *Суц.* 3. Добры. Хлóпцы яны дармó — вéльмі паслухмя́ныя. *Кац.* 4. Дарэмна. Дармó паўставáлі з рáніцы, дошч такí ўлупíў, ні выйсьці. *В. В.*

ДАСЦІПНА′Я (дасьціпнáя) *субст. прым.* Добрая гаспадыня. Ат сусéткі ніякай жы́зьні нямá. Кáжа, што яна дасьціпнáя. Дзе ж янá дасьціпнáя, калí мужы́кá давялá да таго́, што павéсіўся. Не мог ужы́цца зь ёй. *Бяс.*

ДАЎБІ'НА (даўбі́на) *жан., зневаж.* Высокая худая жанчына. Сястра́ мая́ худа́я была́, дык усе каза́лі: «Вот даўбі́на». *Бяс.*

ДАЎМІ'ЦЦА (даўмі́цца) *зак. тр.* Дадумацца. Даўмі́лася тако́ю халадзі́наю без пальта́ выпраўля́ць. *Ліс.*

ДАЎНЕ'Й (даўне́й) *прысл.* Даўжэй, больш. І не ве́даю, што табе́ расказа́ць. Не така́я ш яшчэ́ й стара́я я, другія ш больш ве́даюць, даўне́й жылі́, мо́жа б вы да каго́ с старэ́йшых схадзі́лі. *Белар.*

ДВАРЫ'ШЧА (дварышча) *ніяк.* Падворак. У іх усягды́ дварышча чы́ста вы́мецена і прыбра́на. *Пільк.*

ДВУХПУЦЯВЫ' (двухпуцявы́) *прым.* Двухкалейны. Цяпе́р усю́ды двухпуцява́я жале́зная даро́га, а быва́ла паязды́ разьміна́юцца на разье́здах, або павіне́н перача́каць на ста́нцыі, пака́ другі́ разьміне́цца. *Белар.*

ДЖА'БКА (джа́пка) *жан.* Матыга. Вазьму́ джа́пку і пайду́ ве́чарам крыху́ агаро́т папалю́. Со́нца схава́лася, у галаву́ пе́кчы не бу́дзе. Я заўсе́ды ве́чарам палю́. *Р. Ч.*

ДЖМЫ'ХНУЦЬ (джмы́хнуць), -у, -еш; *зак. тр.* 1. Чмыхнуць. Яна́ так мо́цна джмы́хнула, што ўсе агляну́ліся. *Бяс.* 2. Уцячы. Дзе там іх зло́віш: як джмы́хнуць у кусты́ — то́лькі іх і ба́чылі. *Чар.*

ДЖУПЛЯВА'ЦЬ (джуплява́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Рваць. Ну і наджуплява́лі вы кве́так. *Кам.*

ДЖЫГІ'Р (джыгір) *мужч.* Ёрш. Мой дзя́цька злавіў на ву́дачку двух джыгіро́ў. *В. В.*

ДЖЭ'ГАЦЬ (джэ́гаць), -ю, еш; *незак. тр.* Ківаць. Не джэ́гай ла́ўку, сядзі́ спако́йна. *Кам.*

ДЗЕ'ЎКА (дзе́ўка) *жан.* Дзяўчына. По́мню, на та́нцы мы ў другу́ю дзярэ́ўню хадзі́лі, у Гаяны́, а там за дзявок бі́лі нас, каб мы ня адбіва́лі ў і́хніх хло́пцаў. Як нас мно́га, то яны́ ня ле́зуць, а як аста́ўся хто ў дзе́ўкі, то так усы́плюць, што ён ледзь наза́т прыпаўзе́. *Белар.*

ДЗЁР (дзёр) *мужч.* Адзёр. У той год усе дзе́ці вёс-

кі перахварэ́лі на дзёр, так часа́ліся, чырво́ныя во́чы былі́. *Граб.*

ДЗІРЭ́ЎКТАРКА (дзірэктарка) *мужч.* Дырэктар. Ка́жуць, учо́ра прые́хаў но́вы дзірэ́ктарка школы. *Узгур.*

ДЗВЯГА́ЛКА (дзьвяга́лка) *жан.* Будынак, дзе знаходзіцца дзвіжок. У нас даўно́ дзьвяга́лка свая́, яна́ дае сьвет і другім ве́скам. *Кам.*

ДЗЕТАВО́ДУХА (дзетаво́духа) *жан.* Куранятніца. Вот га́ткая дзетаво́духа, зусім не глядзіць куряня́т. *Р. Ч.*

ДЗЕ́ТУХА (дзе́туха) *жан.* Квактуха, якая водзіць куранят. Вой, дзе́туха зьвяла́ не́дзе куряня́ты. *Р. Ч.*

ДЗЕРАВЯ́ШКІ (дзераві́яшкі) *толькі мн.* Абутак на драўля́най падэшве. Куды́ ты папе́рлася ў дзераві́яшках. Но́гі наб'е́ш, по́куль схо́дзіш у ту́ю ве́ску. *Р. Ч.*

ДЗЕРВЯНЕ́ЦЬ (дзервяне́ць) *незак. тр.* Дранцвець. Сядзе́ла, по́куль но́гі не пача́лі дзервяне́ць. *Чар.*

ДЗЁ́РЦІ (дзёрці), -у, -эш; *незак. тр.* Драць, таркаваць. За́ўтра ра́на пабуджу́, панімаяш што, і ты бу́дзяш дзёрці (бульбу), а я бу́ду пячы́ (бліны).— А як яе дзёрці?— А вот так! *Мік.*

ДЗЯВО́ЧЧЫНА (дзяво́ччына) *жан.* Дзявочасць, дзявочыя гады. Раскажу́ пра сваю́ дзяво́ччыну. Жда́лі мы каля́т. Тады́ жані́лі Цярэ́шку. У Цярэ́шца станаві́ліся с аннаго́ бо́ку дзе́ўкі, з другога́ — хло́пцы. А дава́лі каму́ ро́ўную па́ру, ка́му́ няро́ўную, хоць і ні хаце́ў, але старо́га дава́лі. Сьме́ху было́. *Луб.*

ДЗЯВО́ШЧА (дзяво́шча) *ніяк.* Маладосць. Я дзяво́шча свайго́ і не ўба́чыла. Вы́шла ў шасна́ццаць год за́муж за тако́га, што й рабіць ня ўме́я нічога, сама́ заўсе́ды ўпе́радзі, а ён за маімі плячы́мі жыве́. *Бяс.*

ДЗЯЙНІ́Ў (дзяйні́к) *мужч.* Сметнік. Занясі́ ба́нкі на дзяйні́к, ды сядай дра́нку е́сьці. *Мац.*

ДЗЯЛЯ́НЬКА (дзяля́нька) *жан.* Участак лесу, прызначаны для вырубкі. Вы́значылі ў нас дзяля́ньки, дык ве́льмі мно́га ле́су бу́дзе вы́рублена. *Гіл.*

ДЗЯРНО′ (дзярно́) *ніяк.* Дзёран. Трэ́ба іці нарэ́заць дзярна́ ды апкла́сьці клу́мбу. *Чар.*

ДЗЯРУНЫ′ (дзяруны́) *толькі мн.* Бульбяная бабка. Настружы́ карто́шкі по́ўную міску, дзяруны́ бу́ду пячы́. *Кук.*

ДЗЯЦЕ′ (дзяцё́) *ніяк.* Дзіця. Мы даўне́й ці гэ́так жылі́. І трэ́ба было́ пра́сьці, і дзіцё́ трэ́ба калыха́ць. Адна́ нага́ ў по́чапца, а друго́й калаўро́т ці́сьніш. *Сцеш.*

ДНА (дна) *ліч.* Адна. Дажыва́ю я свой век дна. *Кук.*

ДО′ГЛЯДЫ (до́гляды) *толькі мн.* Агледзіны. Ме́лася да мяне́ жанчына́ прыйсьці ў до́гляды. *Кам.*

ДО′ДНЕЧКАМ (до́днечкам) *прысл.* Досвіткам. Ве́даяш, мо́жа ні забы́лася Макры́на, ко́лькі трэ́ба было́ напра́сьці на дзе́вяць гу́бак верацяно́м? Ды пра́лі не дня́мі, а вечара́мі і до́днечкамі, а цэ́лы дзень малаці́лі жы́та цапа́мі ды на кулі́ ператраса́лі. *Пал.*

ДО′ЙНІЦА (до́йніца) *жан.* Дайніца. Уве́чара надаі́ла по́ўную до́йніцу. *Р. Ч.*

ДОЙСЦЬ (дойсьць) *прысл.* Досыць. Што тады́ было́?! Мох учы́цца папо́ў сын, пано́ў сын, папо́ва дачка́, па́нава дачка́, яшчэ́ хто бага́ты — мох учы́ць — і дойсьць. А цяпе́р усё перавярну́лася. *Мік.*

ДО′РЖНІК (до́ржнік) *мужч.* Спецыяльны загон у двары для хатняй жывёлы. К сьвя́ту трэ́ба до́ржнік прыбра́ць, найпе́рш сабра́ць вы́сахшы гной, папрыбіва́ць ляці́н, запра́віць ве́сьнічкі, бо ўжо ж закрыва́юцца і каро́ва з це́лям выхо́дзіць на падво́рык. *Меж.*

ДОС (дос) *прысл.* Дастаткова. Дос ужо вам зу́бы тачы́ць. *Узгур.*

ДО′СТКА (до́стка) *жан.* Купіў до́стак на пол, ды мно́га асталося. *Ліс.*

ДО′ЎНІШНЯЕ (до́ўнішняе) *прым.* Старое, былое. Вы, відаць, хо́чаце ве́даць до́ўнішняе, бо ўсю́ды хо́дзіце і ўсё распы́таеце. *Р. Ч.*

ДО′ЎНЯ-РАЗДО′ЎНЯ (до́ўня-раздо́ўня) *прысл.* Даўным-даўно. Ба́ба до́ўня-раздо́ўня пра́ла та́льку. *Р. П.*

ДРА′БА (дра́ба) *жан.* Кляча. Хіба ж на мы́ла здаць дра́бу гэ́ту. *Нар.*

ДРА′НКІ (дра́нкі) *толькі мн.* Бліны з таркаванай бульбы. Хазя́йка этай карто́шкі надра́ла і пячэ́ць бліно́ў, дра́нкі, а тады́ нальле́ць сьмята́ны, е́сьця. Уку́сна. *Мік.*

ДРА′НКІ (дра́нкі) *толькі мн.* Коўдра. Быва́ла, дзе́тачка, і дра́нкам былі́ ра́ды, бо пад і́мі це́пла спаць, цяпе́р на іх на́ват не глядзя́ць, усе ма́юць адзія́лы. *Р. Ч.*

ДРАНЬ (дрань) *жан.* 1. Галінкі, расшчэпленыя на дзве палавіны. Трэ́ба мне надра́ць дра́ні на ко́шык. *Гіл.* 2. Дранка. Яе ха́та пакры́та дра́ньню. *Р. Ч.*

ДРА′ЧКА (дра́чка) *жан.* Тарка. Дзе гэ́та на́ша дра́чка? Трэ́ба бу́льму драць, яе нема́. *Ліс.*

ДРУЖЫ′НА (дружы́на) *жан.* Родныя маладых. Дружы́ны мно́га прые́хала: і ма́ці, і ба́цька, і це́тка, а ха́тка мала́, а разьмя́сьціць усіх на́да. *Р. Ч.*

ДРУ′КІ (дру́кі) *толькі мн.* Прыстасаванне для сушкі сена. Там каля то́ку стаяць высо́кія сосно́выя дру́кі, ба́чыце? *Пільк.*

ДРЫ′ЖНІК (дры́жнік) *мужч. Гл.* дзя́йнік. Ну як жаты глады́ш разьбі́ла? Вы́нясі яго́ на дры́жнік. *Нав.*

ДРЫ′НДА (дры́нда) *жан.* Тоўсты сагнуты дрот, на якім катаюцца зімой дзеці. Калі́ са́нак нема́, дык дзе́ці дры́нды ро́бяць ды ката́юцца. *Борк.*

ДРЫ′НКАЦЬ (дры́нкаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Брынчаць. Ат, дры́нкае не́шта, як ні сваі́мі рука́мі. *Ліс.*

ДРЫ′НЬКА (дры́нька) *жан.* Пуня. Да зімы́ лю́дзі гато́вы: по́ўныя дры́нькі се́на і сало́мы назапаса́лі. *Борк.*

ДРЭ′НЧЫЦЦА (дрэ́ньчыцца), -у-ся, -ыш-ся; *незак. тр.* Капрызіць. Такі́ пал падня́ўся ў мало́га, усю но́чаньку дрэ́ньчыўся, чуць ра́ніцы дажда́ліся. *Заб.*

ДУБАЛЬТО′ЎКА (дубальто́ўка) *жан.* Вялікая суконная хустка фабрычнага вырабу. Каб дубальто́ўку ўзяла́, то і ў пле́чы цяпле́й было́ п. *Н. Д.*

ДУЖАВА′ТЫ (дужава́ты) *прым.* Вялікі. Яны́ ўжо былі́ дужава́тыя хло́пцы, але яшчэ́ нічо́га не панімалі. *Ліс.*

ДУЖЭ′Й (дужэ́й) *прысл.*, вышэйш. ступень ад дужа. Горай. З вульля́ вы́ліцелі пчо́лы, як накі́нуліся на міне́, ста́лі жа́ліць. Я ські́нуў ма́йку, нача́ў ей маха́ць, но пчо́лы разазьлі́ліся йшчэ дужэ́й. От быў мне сма́шны мёд, чуць ні памёр. *Белар.*

ДУ′ЛЯ (ду́ля) *жан.* Від грушавага дрэва. Пра́ма пад акно́м расла́ ду́ля, ох гру́шкі былі́ — сма́чныя, сма́чныя. *Узгур.*

ДУ′НДЗІЦЬ (ду́ндзіць) *незак. тр.* Ссаць. Ён, як бычо́к наш, усё ду́ньдзя і ду́ньдзя. *Гар.*

ДУНДУ′К (дундук) *мужч., неадабр.* Хмуры, невясёлы чалавек. Чаму́ ты заўсёды хо́дзіш такі́ дундук? *Р. Ч.*

ДУПЛЯ′НКА (дупля́нка) *жан.* Разнавіднасць вулея. С трына́ццаці гадо́ў займа́юся з гэ́тымі пчо́ламі, за свой век ба́чыў ро́зныя ву́льлі. І дупля́нкі ў мяне́ былі́, але цяпе́р дупля́нак нама́. У дупля́нках яны там сабе́ хазяява́. до́бра пчо́лкам у дупля́нках. *Белар.*

ДЫГА′ТЫ (дыга́ты) *прым.* Цыбаты. От пяту́х дыга́ты ў На́сьці. *Нар.*

ДЫ′ГАЦЬ (ды́гаць) *незак. тр.* Моцна біцца (аб сэрцы). Як тро́хі параблю́, так і ды́гае сэ́рца, так і ды́гае. *Бр.*

ДЫ′ГУСЬ (ды́гусь) *прым.* Вялікі. Ну і ды́гусь твой сыно́чак. Яшчэ́ пятна́ццаці нама́, а за ба́цьку вышэ́йшы. *Граб.*

ДЫМАКУ′Р (дымаку́р) *мужч.* Дымар. Я шчэ малы́ быў, але, по́мню, ве́льмі любі́ў мёд. А тады́ мёд быў ого які́ сма́чны, бо ўво́лю яго́ не было́. Я, по́мню, узяў дымаку́р, налажы́ў шчэ́пак і парашы́ў сам доста́ць ме́ду з вульля́. *Белар.*

ДЭ′РБЫ (дэ́рбы) *адз.* дэрба. Рэбры. Вы́сахла, адны́ дэ́рбы тарча́ць, як мо́жна, і куды́ ма́тка глядзе́ла. *Раўч.*

Е, Ё

ЕКАТА′ЦЬ (екатáць), -у, -аш; *незак. тр.* Гаварыць. За сцянóй нéхта глýха екатáў: камýсьці пагражáў, другíх угавóрваў. *Узгур.*

Е′СТАНЬКІ (éстанькі) *памяньш.* ад есці. Е′станькі хацéла, жыць хацéла, ні бáцькі ні мáцяры ні былó, хáта згарэ́ла, вярнýцца ні былó куды́, гóра застáвіла, рóзуму дадалó. Ні с кім ні рáдзячыся самá самýю ўладкóўвала ў жы́зьні. *Паг.*

Е′СТЫ (éсты) *займ.* Гэты. Я ўсё падрáт круціла з éстага бóку, а палóсы застаю́цца на экрáне. *Чыж.*

Ё′СІКА (ёсіка) *дзеясл.* Ёсць. Такí нож і ў мянé ёсіка, бáцька з гóраду прывёс. *Мац.*

Ё′МКА (ёмка) *прысл.* Добра, хораша, трапна. Мне спадабáўся той хлóпец. Так ёмка ямý аткáзваў, што тамý й пярэ́чыць не былó як. *Р. Ч.*

Ж

ЖАБЕ′НІЦЦА (жабéніцца), -ю-ся, -іш-ся; *незак. тр.* Раздумваць. Нáдта ты спакóйны, мнóга яшчэ́ складáць што ў чамадáн трэ́ба, а ты жабéнісься: аднó гавóрыш, то зусім іншае. Зьбірáйся скарэ́й і пайдзём. *Граб.*

ЖАКЕ′Т (жакéт) *мужч.* Пінжак. А гэ́ты во жакéт мой Кóля аддáў бáцьку, яму шчэ дóбра бýдзе каля хáты насіць. *Р. Ч.*

ЖА′ЛАВАЦЬ (жáлаваць), -ую, -еш; *незак. тр.* Шкадаваць. Нямá за што жáлаваць яе, зарабíла дóбра, і не бéдная самá. *Неж.*

ЖАЛЯ′ЗКА (жаляска) *ніяк.* Лязо ў гэбліку. Сáшкова жаляска зусім ступілася, нямá чым дóскі габляваць. *Кам.*

ЖАНА′ЦІК (жанáцік) *мужч.* Жанаты мужчына. Усхадзíўся наш жанáцік, ні аднóй вечарынкі ні прапýсьціць. *Ліс.*

ЖАЎНА′ (жаўна́) *жан.* Дзяцел. Галава́ ў жаўны́ дужава́тая. *Кам.*

ЖА′РНУЦЦА (жа́рнуцца), -у-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Стукнуцца. З разьбе́гу так жа́рнуўся, аж уваччу́ пацямне́ла. *Узгур.*

ЖА′РНУЦЬ (жа́рнуць), -у, -еш; *зак. тр.* 1. Моцна ўдарыць. А ён як жа́рнуў мяне́ па галаве́, дык аж у вача́х пацямне́ла. *Кухц.* 2. Стукнуць. Як жа́рня ў акно́, дык шы́бы і паляце́лі. *Кам.*

ЖА′ТКА (жа́тка) *жан.* Жняярка. Перш у нас жы́та жа́лі ўручну́ю, пасьля паявілася жа́тка, а цяпе́р і зусім до́бра — канба́йн і сажне́ й змало́ця. *Бяс.*

ЖА′ХАЦЬ (жа́хаць) *незак. тр.* Грымець. Нада́ўначка як жа́хнуў гром, дык адра́зу двух жарабя́так забіў. *Р. Ч.*

ЖА′ХНУЦЬ (жа́хнуць), -у, -еш; *зак. тр.* Моцна ўдарыць. Як жа́хнула яна́ мне па руцэ́, чуць рука́ не атвалі́лася. *Чар.*

ЖБАНО′К (жбано́к) *мужч.* Збанок. Га́ля, пада́й другі́ жбано́к, а то ў гэ́ты малако́ ўжо ні ўла́зіць. *Бяс.*

ЖНІ′ЎНІК (жні́ўнік) *мужч.* Ржэ́ўнік. Ты, уну́чак, за́рас сьпі, а калі со́нца высо́кае пады́мецца, тады́ ты і пры́дзеш, на жні́ўнік каро́ў пагоні́м. *Р. П.*

ЖНЯЯ′Р (жняя́р) *мужч.* Механізатар, які абслугоўвае жняярку. Быва́ла, по́йдзім жаць, жняяры́ малы́я снапкі́ кіда́юць, а як разазьля́цца, дык кіда́лі мно́га сало́мы. А нам гэ́тыя ку́чы трэ́ба было́ і зьвяза́ць, і паста́віць, і знасі́ць. *Бяс.*

ЖО′ЛАБ (жо́лап) *мужч. Дук. Жыр. Цял.* Прыстасаванне ў выглядзе скрынкі, куды кладуць сена карове. Цялу́шка вы́расла, і ёй жо́лап вялікі трэ́ба зрабіць. *Кам.*

ЖЫВУ′ТКІ (жыву́ткі) *прым.* Жывы. Нічо́га, нічо́га, жыву́ткі бу́дзеш, яшчэ́ і ў акаме́дзію (акадэмію) вучы́ца пае́дзеш. *Св.*

ЖЫ′ГАЎКА (жы́гаўка) *жан.* Крапіва. У ле́се зале́зьлі ў жыгаўке́, усе но́гі паапяка́лі. *Узгур.*

ЖЫ′ДКІ (жы́ткі) *прым.* 1. Гнуткі. О, гэ́ты дубе́ц жы́ткі, мне такі́ і патрэ́бны. *Луц.* 2. Слабы. Ён жа зусі́м яшчэ́ жы́ткі, глядзі́, як хіста́ецца пад ме́хам. *Луц.*

ЖЫ′ПСКА (жы́пска) *жан.* Суп з мясам. Здае́цца, каб жы́пскі пад'е́сьці, а то ўсё сухо́е ядзі́м. *Бяс.*

ЖЫ′ЗНЯ (жы́зьня) *жан.* Жыццё. Цяпе́р така́я харо́шая жы́зьня. *Кам.*

ЖЫКУ′ЧКА (жыку́чка) *жан.* Крапіва з дробным лісцем. Ру́кі маé гара́ць агнём, гра́ды пало́ла, дык жыку́чкай абжы́кала. *Р. Ч.*

ЖЫ′ЛА (жы́ла) *агульн., неадабр.* Скупы. Ну і жы́ла, свайму́ ро́днаму пашкаду́е, а ўсё ў кладо́ўцы зава́лена ро́зным добро́м. *Граб.*

ЖЫ′ЛЛЕ (жы́льля) *толькі мн.* Жылы. Так мо́жна і жы́льля падарва́ць. *Чар.*

ЖЭ′МКА (жэ́мка) *жан.* Тэмпература. Вой, якая жэ́мка высо́кая ў дзіця́ці, і дахтары́ хо́дзюць, усё ро́ўна нічо́га не памага́е. *Бяс.*

З

ЗАВАЛІ′ЦЬ (заваліць), -ю, іш; *зак. тр.* Закрыць (дзверы). Патрэ́бна заваліць істо́пку, бо но́чы цёмныя, мо́гуць жу́лікі забра́цца. *Узгур.*

ЗАВА′ЛЬНАЯ (зава́льная) *прым.* Старая, трухлявая. Е′йна ха́тка стаіць така́я зава́льная. *Р. Ч.*

ЗА′ВІДКІ (за́віткі) *толькі мн.* Зайздрасць. За́віткі с сярэ́дзіны чалаве́ка з'ядаюць. *Буз.*

ЗАВА′ДЛІВЫ (завідлівы) *прым.* Зайздросны. На́ш суся́т на́тта ш зава́длівы. *Клет.*

ЗАВІ′ДНІК (завіднік) *мужч.* Зайздросны чалавек. Завіднік гэ́ты завідуе ўсямý чужóму, а ка́п сваё нажы́ць, дык ляну́ецца. *Бяс.*

ЗАВІХА′ЦЦА (завіха́цца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Спяша́цца працава́ць. А ні я завіха́ўся, а ні я бу́ду завіха́цца. *Хал.*

ЗАГАНУ́ЦЬ (загану́ць), -н-у, -н-еш; *зак. тр.* Загадаць. Я вам магу́ загану́ць зага́тку, дак і ня ве́даеце што. *Так.*

ЗАГАРНУ́ЦЬ (загарну́ць), -у, -еш; *зак. тр.* Завязаць. Дай я табе́ ху́стачку загарну́. *Кам.*

ЗАГРАЗНІ́ЦЬ (загразьні́ць), -ю, -іш; *зак. тр.* Забрудзіць. Быва́ла ш, як по́йдзем танцава́ць, дык хло́пец во́зьмя ў ру́ку плато́чак, і ру́ку, што на сьпіне́, абгарне́ плато́чкам ды так і танцу́я, кап пла́цьця ні загразьні́ць. *Бяс.*

ЗАГРАХАТА́ЦЬ (заграхата́ць) -у, -аш; *зак. тр.* Загрукаць. Не́хта мо́цна заграхата́ў на падло́зе: шум, скры́пнулі палаві́цы. *Узгур.*

ЗАГУБІ́ЦЬ (загубі́ць), -л-ю, -іш; *зак. тр.* Згубіць. Загубі́ла сшы́так, ня ве́даю, дзе і шука́ць. *Крок.*

ЗАГУ́СЛА (загу́сла) *прысл.* Згусцела. Кру́пнік зусім загу́с, няма як е́сці. *Узгур.*

ЗАДЛЯКА́ЦЦА (задляка́цца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Загаварыцца. Ой, кап ты згарэ́ла, задляка́лася я з ва́мі, а сьвіня́ ўлезла ў агаро́т. *Цял.*

ЗАДО́ЎЖЫЦЦА (задо́ўжыцца), -у-ся, -ыш-ся; *зак. тр.* Затрымацца. Трэ́ба было́ лячы́цца, а я задо́ўжылася. *Кам.*

ЗАДРЫМА́ЦЬ (задрыма́ць), -л-ю, -л-еш; *зак. тр.* Задрамаць. Здае́цца, ледзь задрыма́ў, а ўжо і паднім а́цца пара́. *Узгур.*

ЗАДУША́ЦЦА (задуша́цца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Задыхацца. Так се́рца бали́ць, што як ідзе́ш, аш задуша́ешся. *Кам.*

ЗАДУ́ЦЬ (заду́ць), -ю, -еш; Затушыць. Заду́й аго́нь, се́на ж бліска, загарэ́цца мо́жа. *Узгур.*

ЗАДЗЕ́РА (задзе́ра) *агульн.* Задзіра. Ну і задзе́ра ж Іва́наў сын: ко́лькі ні прасі́лі, каб ні чапа́ў яну́шкаўскіх хло́пцаў, дык не, ні вы́дзяржаў і палёс у дра́ку. *Бяс.*

ЗАЕ́СЦА (заёсца), -м-ся, -і-ся; *зак. тр.* Разлавацца. Ну чаго́ заёўся так? Зьбіра́йся барджэ́й ды паёдзем, Пятро. *Кузьм.*

ЗАЖА́ЛІЦЬ (зажа́ліць) *зак. тр.* Насадзіць джалаў. Я кінуў дымаку́р і наўцёкі, а пчо́лы за мно́й! Ляце́лі за мной і жа́лілі, зажа́лілі мяне́ ўсяго́. Я пайшо́ў ік ма́мцы, ына мне павыцягала жа́лы. *Бяс.*

ЗАЗУ́БІЦЦА (зазу́біцца) прарасці. Ужо жы́та даўно́ зазу́білася. *Р. П.*

ЗАІКА́ТЫ (заіка́ты) *прым.* Заіка. У нас два браты́ е́сьць заіка́тых, дык так цяшка іх слу́хаць. *Папл.*

ЗАІКЛІВЫ (заіклівы) *прым. Гл.* заікаты. Ну й заіклівы, слова ня скажа! *Кальч.*

ЗАЙСЦІ́СЯ (зайсьціся), ду-ся, -сь-ся; *зак. тр.* Зайсці. Ты паглядзі, Раіначка, яка́я цяпе́р жысь па́нская. Як зо́йдзісься да любо́га ў ха́ту, як у пако́і па́нскія. *Пал.*

ЗАЙСЦІ́СЯ АД ГОРА (зайсьціся ад гора). Многа пережыць. Бацькі́ зайшлі́ся ад гора, не ве́далі, што ім рабіць. *Мядз.*

ЗАКАНДЫ́БАЦЦА (закандыбацца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Унадзіцца. Закандыбалася лісá да на́шых хутаро́н. *Бар.*

ЗАКЛО́КАЦЬ (заклокаць) *зак. тр.* Заквактаць. Заклокала ку́ра, трэба пасадзіць, а то ня бу́дзе цыпляня́так. *Р. Ч.*

ЗАКРА́ДКА (закра́тка) *жан.* Паліца. Мо ты, дзет, закра́ткі папрыбіва́яш? *Кам.*

ЗАКУ́ТАЦЬ (закутаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Зачыніць. Дзіця́тка, заку́тай дзьве́ры. *Кам.*

ЗАЛАВІ́ЦЬ (залавіць), -ул-ю, -іш; *зак. тр.* Злавіць. Ішла́ я с по́ля, а мяне́ ў даро́зі дошч залаві́ў і вымачыў усю́. *Кам.*

ЗАЛАТО́ЎКА (залато́ўка) *жан.* Манета ў 15 капеек. Я се́ньня знайшла залато́ўку. *Кук.*

ЗАЛЯЙЦА́ЦЬ (заляйца́ць), -аю, -еш; *зак. тр.* Запрэгчы. Што ш ты за хло́пец, што ня мо́жаш каня́ заляйца́ць. *Гіл.*

ЗАМАЦАВА́ЦЦА (замацава́цца), -ю-ся, -еш-ся; *зак.*

тр. Добра ўладкавацца. Калі ёсьць у нача́льстві свая́ рука́, то ў го́радзі мо́жна замацава́цца. *Кам.*

ЗАМА́НУ́ЦЦА (замануцца) *зак. тр.* Захацецца. Замануўлася, дый пашла́ ў го́рат, кап купіць чаго́-не́будзь на суке́нку. *В. В.*

ЗАМЭ́НЧЫЦЬ (замэнчыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Замучыць. Прые́халі не́мцы і сагна́лі ў склеп. Некато́рых адра́зу замэ́нчылі, а мяне́ адзін ве́льмі мо́цна бію́ тако́й рызі́нкай з булдо́й. Ле́дзьве вы́трывала. *Бяс.*

ЗАМКА́ЦЦА (замка́цца) *незак. тр.* Замыкацца. Замка́йся і больш мы цібе́ ні тро́нем. *Кам.*

ЗАПІНА́ЛКА (запіна́лка) *жан.* Занавеска. Ко́йка сястры́ за запіна́лкай стаіць, а я тут сплю. *Кл.*

ЗАПЛЯНТА́ЖЫЦЬ (заплянта́жыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Затаптаць, забрудзіць. Так заплянта́жылі падло́гу, як была вечары́нка, што чуць дамы́лася. *Уж.*

ЗАПО́ВІНЫ (заповіны) *толькі мн.* Заручыны. Учо́ра ў на́шай Мары́лі запо́віны былі́, за́муш дзе́ўка по́йдзе. *Р. Ч.*

ЗАПО́РЦІЦЦА (запо́рціцца), -ч-у-ся, -ці-ш-ся; *зак. тр.* Захварэць. Нядаўна мая каро́ва запо́рцілася, ду́мала здо́хне, а яна вы́жыла. *Р. Ч.*

ЗАПЭ́НДЗАНЫ (запэ́ндзаны) *дзеепрым.* Недагледжаны. Для таго́ ж запэ́ндзаны хло́пяц — ледзь но́гі цягне. *Алях.*

ЗАРО́БІЦЬ (зарóбіць), -ю, -іш; *зак. тр.* Зарабіць. Се́лета на палявы́х ён зарабі́ў шмат. У нас пла́цяць до́бра не то́лькі шта́тніку. *Меж.*

ЗА́САЎКА (за́саўка) *жан.* Месца ў плоце, праз якое можна пралезці ў агарод. Во праз за́саўку лесь. *Кал.*

ЗАСЛО́Н (засло́н) *мужч.* Услон. Упе́рат у ха́тах ста́лі засло́ны, а ціпе́рака ва ўсіх сту́лы е́сьцяка. *Кам.*

ЗАСМУГО́ЛІЦЬ (засмугóліць), -ю, -іш; *зак. тр.* Забрудзіць. Вот ужо засмугóліў касьцю́м, што і ні адмы́ць ніяк. *Бяс.*

ЗАСО́ВАЛКА (засо́валка) *жан.* Зашчапка. Гэ́та вакно́ не закрыва́ецца, засо́валка сапсава́лася. *Кук.*

ЗАСТА́ЛА́ЧЫЦЦА (засталачыцца), -ус-я, -ыш-ся; *зак. тр.* Забегацца. За гэ́тымі каро́вамі засталачылася, аш но́гі забале́лі. *Кам.*

ЗАСТАЛУ́ЧЫЦЬ (засталучыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Засланіць. Атхініся, ні засталучуй сьвет. *Кам.*

ЗА́СТУВАЦЬ (застуваць), -ю, -еш; *зак. тр.* Засланяць святло. Ні за́ступі, а то я ні магу́ ні́тку ўцягну́ць у іго́лку. *Цял.*

ЗАСТЫ́ЛІЦА (застылі́ца) *жан.* Халоднае. Мой, была́, заб'е́ сьвіньню́ пат каля́ды. Пато́м нава́рым засты́лі́цы з нох сьвіны́х, галавы́ і ядзім з бульбай. *Р. Ч.*

ЗАСУ́НУЦЬ СЕ́НЦЫ. Заперці. Не буць, Ва́ня, до́ўга, бо засу́ну дзьве́ры. *Кам.*

ЗАСУКА́ЦЬ (засука́ць), -ч-у, -ч-аш; *зак. тр.* Закасаць. Засука́й мне руба́шку, ды крэ́пка, каб не атсука́лася. Буду́ ру́кі мыць. *Ліс.*

ЗАСЦІЛА́НКА (засьці́ланка) *жан.* Самаробны палавік. Ма́ці на́ша ўме́е ткаць засьціла́нкі. *Мац.*

ЗАТО́ХНУЦЦА (зато́хнуцца), -у-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Задыхнуцца. Праве́тры ха́ту, а то зато́хнуцца мо́жна. *Ліс.*

ЗА́ТЫЧАК (за́тычак) *мужч.* Запечак. Як узьле́зеш на за́тычак, то там і це́пла, і до́бра, так і цэ́лы дзень там прася́дзіш. *Р. Ч.*

ЗАЎСЮ́ДЫ (заўсю́ды) *прысл.* Заўсёды. Ні ве́даю чаму́, але́ ён заўсю́ды такі невясёлы быў. *Нар.*

ЗАЎСЯГДА́ (заўс'агда́) *прысл.* Заўсёды. Ну і непасе́да, заўсягда́ не́куды бяжы́ць. *Граб.*

ЗАЎЧЭ́СНЕ (заўчэ́сьня) *прысл.* Загадзя, своечасова. До́бра, што пасе́ялі заўчэ́сьня жы́та, а то ціпе́р і ча́су нема́. *В. В.*

ЗАШЫ́ЦЦА (зашы́цца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Не справіцца з работай. Рабо́ты было́ шмат і яна́ зашы́лася зь ёй. *Кам.*

ЗАЧЫ'НАК (зачы́нак) *мужч.* Пяколак. Стань на стул, зь яго ўзьлесь на зачы́нак, а тады́ і на печ. *Чар.*

ЗАЯ'ДА (заяда) *жан., неадабр.* Сварлівы, заядлівы. Як шчэ́пяцца, то ні разьвёсьці — аба́я ла́дныя заяды. *Ліс.*

ЗБЛАЖА'ЦЬ (зблажа́ць), -ю, -еш; *зак. тр.* Пахудзець. І чаго́ гэ́та ты так зблажа́ла, як пугаўё станчэ́ла: мо́жа хво́рая, ці з ім, му́жам, дачу́шка, нява́жна жывёца? *Узгур.*

ЗБОЖ'Е (збож'е) *зборн.* Збожжа. Мы ш пасьля́ вайны́ збо́ж'я ні палуча́лі. *Кам.*

ЗБАГАЦЕ'ЦЬ (збагацёць), -ею, -еш; *зак. тр.* Разбагацець. Гэ́ны ўжо як збагацёў, дык на лю́дзі і во́чы не ка́жа. *Гіл.*

ЗБА'ЯЦЬ (зба́яць), -ю, -еш; *зак. тр.* Расказаць казку, байку. Ба́бушка, збай ба́сыню, а не дык ка́зку. *Хож.*

ЗБІЦЬ (зьбіць), -ю, -еш; *зак. тр.* Зваляць. Саб'юць валёнкі до́бра ў сусе́дзяў, у нас не так палуча́ецца. *Гіл.*

ЗБРЫСЦІ' (збрысьці), -д-у, -дз-еш; *зак. тр.* Сыйсці. Ве́шаім мы на ко́няй бляша́нкі ат кансе́рваў, каб яны не збрыда́лі, а то ў нас ко́ні брыду́чыя. Як збрыдзе́ куды́, дык не найсьці, паку́ль сам не прыдзя. Адзін рас як збрыў у нас конь, дык цэ́лую нядзе́лю не было́. *Белар.*

ЗБЭ'РСАЦЬ (збэ́рсаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Звязаць. Ці ско́ра ты гэ́тыя наскі збэ́рсаеш? *Кам.*

ЗВЕ'ДАЦЬ (зьве́даць), -ю, -еш; *незак. тр.* Ведаць. До́бра ці́пер жыву́ць, мно́га чаго́ ма́юць, дык вось яна не зьве́дае, што надзява́ць. *Р. Ч.*

ЗВЕКАВА'ЦЬ (зьвекава́ць), -ю,- еш; *зак. тр.* Пражыць жыццё. Мая ма́ма зьвекава́ла, а ў бальні́цы не была́. Што за чалаве́к: зьвекава́ў, а ро́зуму не набра́ўся. *Н. К.*

ЗВЕ'РГНУЦЬ (зьве́ргнуць) *зак. тр.* (аб жыве́ле). Нарадзіць раней тэрміну. Ле́тась на́ша каро́ва зьве́ргла. *Цял.*

ЗВУЧЫ'ЦЦА (звучы́цца), -у-ся, -ыш-ся; *зак. тр.* Пры-

вучыцца. Звучы́лася ты, дзе́ўка, на ба́цькавай шыі сядзе́ць. *Ліс.*

ЗВЯРЦА́ДЛА (зьвярца́дла) *ніяк.* Люстэрка. Паглядзі́ся ў зьвярца́дла, пе́кная, нічо́га і́ншага не ска́жаш. *Вішн.*

ЗВЯТА́ВАЦЬ (зьвята́ваць), -у-ю, -у-еш; *зак. тр.* Разлічыцца, аддаць доўг. Зьвяту́й сусе́ццы і больш не бяры. *Св.*

ЗГАЛЕ́ЦЬ (згале́ць), -ю, -еш; *зак. тр.* Выглядаць нядобра апранутым. Без ма́ці зусім згале́лі дзе́ці: усё ў рва́ні, мурза́тыя і гало́дныя. *Меж.*

ЗГАМБАВА́ЦЬ (згамбава́ць), -ую, -еш; *зак. тр.* Зганьбіць. Такія я́блыкі згамбава́ў, а яны ж румя́ненькія, сьве́цяцца ўсе́. Ле́пшых не зно́йдзе. *Граб.*

ЗГАНДЛЯВА́ЦЬ (згандлява́ць), -ю-ю, -ю-еш; *зак. тр.* Купіць. Згандлява́ў мне ба́цька бярве́ньне на дом, а калі́ пачалі́ будава́ць дом, дык бярве́ньне аказа́лася трухля́вым. *Гіл.*

ЗГАРУ́СЦІЦЬ (згару́сьціць), -у, -іш; *зак. тр.* Выціснуць, пусціць. Цяпе́р і маладая́ на вясе́лі нівóднай сьлязі́нкі ні згару́сьціць — сьмяе́цца, на маладо́га ды на ка́мо́рку пагля́дае. *Суд.*

ЗГО́МТАЦЬ (зго́мтаць), -аю, -еш; *зак. тр.* Прыбіраць (неакуратна). Пакі́даў усё, згомтаў у адну́ ку́чу. Нямá кап хоць раз зрабі́ў убо́рку як сьлет. *Граб.*

ЗГРУНТАВА́ЦЬ (згрунтава́ць), -ю, -еш; *зак. тр.* Збудаваць. Вярну́ліся мы зь ле́су — дзярэ́ўні нямá, пагарэ́ла ўсё. Сын старэ́йшы с а́рміяй на́шай пашо́ў немца біць, а мы ж жо́нкай удваі́х згрунтава́лі зямля́нку й жылі, пака́ сын прышо́ў з вайны́. *Белар.*

ЗГРЭ́БСЦІ (згрэ́псьці), -у, -еш; *зак. тр.* Забраць. Не́мцы яго згрэ́блі і павялі́. *Сав.*

ЗДА́ЦЦА (зда́цца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Вельмі стаміцца. Ён ужо саўсі́м здо́ўся, ляжы́ць і ні ўстаé. *В. Р.*

ЗДЭ́ЧНЫ (здэ́чны) *прым.* Тутэйшы. Яна ні здэ́чная, а с-пат Магілёва, а сюды́ за́муш вы́шла. *Кам.*

ЗЕ′БЛІЦЬ (зе́бліць), -ю, -іш; *незак. тр.* Зябліць. Пасьля́ ле́та зе́бляць жы́тнішча. *Р. В.*

ЗЕ′ЛЛЕ (зе́льля) *толькі адз.* Водарасці. Ране́й ра́чка чы́стая была́, цяпе́рака уся зарасла́ зе́льлям. *В. В.*

ЗЖА′ГЦІ (зжа́хці), -у, -еш; *зак. тр.* Спаліць. Не́мцы ўсю́ на́шу ве́ску зжа́глі. *В. В.*

ЗЛАДЗІ′НА (зладзі́на) *мужч.* Злодзей. Вось які́ зладзі́на е́ты чалаве́к быў, кап то́лькі ўле́сьці апкра́сьці чалаве́ка. *Р. Ч.*

ЗЛА′ПАЦЬ (зла́паць), -ю, -еш; *зак. тр.* Злавіць. Не́мцы яе ў на́шай ве́сцы і зла́палі. *Белар.*

ЗМАХНУ′ЦЬ (змахну́ць), -у, -еш; *зак. тр.* Салгаць. Ен сыча́с выма́іць блакно́т, запісываіць маё і́мя, фамі́лію. Я хацёў перш змахну́ць, запіса́ць Іва́н Пятро́віч Міха́йлаў і ідзі́ шука́й міне́, ды ду́маю, не, так дзе́ла ня по́йдзіць. Дазнаіцца, зна́іш, бу́дзіць у шку́ру. *Мік.*

ЗМЯНІ′ЦЦА (зьмяні́цца), -ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Пераапрануцца. Мы парці́за́нам е́сьці дава́лі і зьмяні́цца. *Кам.*

ЗНАЦЬ (знаць) *незак. тр.* Відаць. Бураке́ пасадзі́лі даўно́ і ратке́ знаць. *Кам.*

ЗНЕЎДАЛЕ′ЦЬ (зьнеўдале́ць), -ю, -еш; *зак. тр.* Захварэць. У іх хло́пчык, маладзе́й ад майго́ на два гады́, знеўдале́ў і яго́ ў бальні́цу пакла́лі. *Мядз.*

ЗНІ′ЦЕЙКУ (зьні́цейку) *прысл.* Знянацку. Зьні́цейку наступі́ў на касу́ і парэ́заў нагу́. *Ліс.*

ЗРА′ЗАЧКУ (зра́зачку) *прысл.* Адразу. Не буць там до́ўга, ідзі зра́зачку дамо́ў. *Кам.*

ЗУБАСКА′ЛЬ (зубаска́ль) *мужч., неадабр.* Асоба, якая без прычыны смяецца. Ну і зубаска́ль ты бесталко́вы, памаўча́ў бы хоць, паку́ль старэ́йшыя гаво́раць. *Граб.*

ЗУ′НДАЛЬ (зу́ндаль) *мужч., неадабр.* Маўклівы чалавек. Што ў яго не пыта́ліся, гэты зу́ндаль ня вы́мавіў ні сло́ва. *Крок.*

ЗЫГАВА′ЦЬ (зыгава́ць) *незак. тр.* Гізаваць. Гады́ са два наза́т заступі́ў я цяля́т па́сьвіць. Хай іх хале́ра

во́зьме, гэ́та ўжо ні скаці́на. Як пачне́ зыгава́ць, хвасты́ ўгару́ і хто куды́. Хай яны пы́лам по́йдуць с тако́й скаці́най. *Белар.*

ЗЫГУ́ТА (зыгу́та) *жан., лаянк.* Дзыбатая жанчына. Зыгу́та гэ́та то́лькі пла́ча, што ў яе нямá дапамо́гі, але спраўля́ецца. *Ліс.*

ЗЫКАВА́ЦЬ (зыкава́ць) *незак. тр.* Гізаваць. Каро́вы як пачалí зыкава́ць, дык хоць ты плач. *Чар.*

ЗЯВА́ЦЬ (зява́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Пазяхаць цэлы дзень. Сёньня не́шта зява́ецца, віда́ць, дождж по́йдзе. *Ліс.*

ЗЯЛЕ́ЗНІЦА (зяле́зьніца) *жан.* Жалезны грэбень з зубамі-цвікамі часаць лён. Ма́ці, быва́ла, по́сьля за́зімку, падрабі́ўшыся на хазя́йсьцьві, здыміць з запе́чку по́сьцілку з ле́нам, унясе́ць зяле́зьніцу і чэ́шыць. А тады й я памага́ць ста́ла. Але паку́ль наўчы́лась, дык усё ру́кі абдзіра́ла на цьвякí ў зяле́зьніцы. Лён густы́, во́зьміш па́сму, на руку́ накру́ціш, ды па зяле́зьніцы хвасто́м лёну́, а цьвякí во́стрыя, таркучыя — усе, быва́ла, ру́кі крыва́віла аб зяле́зьніцу. *Пап.*

ЗЯЛЕ́НУХА (зяле́нуха) *жан.* Недаспелыя ягады. Наéўся зяле́нухі і кача́ецца жыватом. *Ліс.*

ЗЯРО́ДЫ (зяро́ды) *толькі мн.* Азярод. Зяро́ды ў нас саўсі́м благія, здаецца, што вось-вось разва́ляцца, не будзе на чым се́на сушы́ць. *Р. П.*

ЗЯРО́Д (зяро́т) *мужч.* Азярод. Нясí бульбо́ўнік на зяро́д раскладзí. *Чыж.*

І

ІЗМЭ́НЧЫЦЬ (ізмэ́нчыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Замучыць. Так яго ізмэ́нчылі не́мцы, ама́ль да са́май сьме́рці. *В. Р.*

ІМША́РЫНА (імша́рына) *жан.* Месца, дзе расце толькі арэшнік. У нас імша́рынай завýць ме́сца, дзе расьце́ адзін арэ́шнік. *Р. Ч.*

ІМШАРЭ'ЦЬ (імшарэ́ць) *незак. тр.* Шарэць. Ды гэ́та як імшарэ́я трэ́ба ісьці ў лес. *В. В.*

І'ННЫ (і́нны) *займ.* Іншы. І'нны рас я не магу́ рабі́ць. *Дук.*

ІСК (іск) *мужч.* Новы рой. Дзьве́ сям'і́ ня мо́гуць быць у ву́льлі, яны бо́руюцца — като́ра като́ру вы́гане. Тады́ ма́тка пакіда́е ву́лей, калі́ іск но́йдзе до́брае ме́сца. Абы́чна ў ле́се, на стары́м дзе́раве з дупло́м, лю́бяць гніль, запах. *Белар.*

І'ХІ (і́хі) *займ.* Іх. І'хі хло́пец ве́льмі до́бры. *Дук.*

ІСПО'ДНІК (іспо́днік) *мужч.* Жаночая кашуля з белага паркалю. Га́нна дык заўсе́ды іспо́днік з кару́нкамі шы́я. *Мац.*

К

КАБЛУ'К (каблу́к) *мужч.* Вертыкальны абруч у кошыку, за які бяруцца рукамі. Адзі́н каблу́к ужо́ гато́вы. *Гіл.*

КАБЫ'ЛЫ (кабы́лы) *толькі мн.* Грыбы. Кабы́лы мо́жна атва́рваць і марынава́ць. *Ліс.*

КАБЫЛЯ'НЯЦ (кабыля́няц) *мужч.* Апендыцыт. Палажы́лі яго́ ў бальні́цу, зрабі́лі апера́цыю і вы́разалі кабыля́няц. *Кам.*

КАВЕ'НЯ (каве́ня) *жан.* Прылада для адграбання попелу ў печы. Была́ каве́ня, але не́як усу́нула ў са́мы жар, дык яна палавіну адгарэ́ла. Мужыка́ нема́, дык яшчэ́ й не зрабі́ла нова́е кавяні́шча. *Бяс.*

КАГАМЕ'Т (кагаме́т) *мужч.* Качалкі. Даўне́й узя́ў кагаме́т ды пакача́ў, што табе́ трэ́ба, а цяпе́рака ўжо́ уцю́х. *Р. Ч.*

КА'ДРАЛЬ (ка́драль) *жан.* Кадрыля. Быва́ла, былі́ мы малады́я, по́йдзім на вічары́нку альбо́ сва́дзьбу. Маладзе́ш танцу́іць ва́льсы, по́лькі, кракавя́к, ка́драль; адзе́ўшыся краси́ва, хто гуля́я, хто шпацыру́я... *Мік.*

КАДЗЕ' (кадзе́) *прысл.* Толькі што. Кадзе́ пяць ча-

со́ў было́, а ўжо сем! Дык калі́ ж гэ́та я пасьпе́ю ўсё зрабіць? *Лыс.*

КАДО́ЎБЕЦ (кадо́ўбец) *мужч.* Бочка. Га́нначка, бяры́ вады́ ў тым кадо́ўпцы, што пад вакно́м стаіць. *Р. Ч.*

КО́ЖАН (ко́жан) *займ.* Кожны. Ко́жан рас по́зна дамо́ў прыхо́дзіць. *Р. Ч.*

КАЗА́ (каза́) *жан.* 1. Мерка для вымярэння плошчы, у выглядзе́ лі́тары А (2 метры). Каза́ не́дзе пад паве́цьцю, вазьмі́ і по́йдзем ме́раць со́ткі. *Меж.* 2. Сагнуты дрот, на якім дзеці катаюцца на лёдзе. Ката́ўся мой Ко́лька на казе́, звалі́ўся, дык уве́сь нос абадра́ў. *Кук.*

КАЗЁ́Л (казёл) *мужч.* Грыб масляк. Казло́ў мно́га, але́ не́шта чарві́выя. *В. В.*

КАЗЁ́НКА (казёнка) *жан.* Сяке́ра. Дай ты казёнку, твая́ ж во́страя, не стой, ба́чыш, час ідзе́. *Слаб.*

КАЗЯНЯ́ (казяня́) *мужч.* Казляня. Казяня́ быў ужо вялі́кі, сам піў малако́. *Хал.*

КАЙРО́Т (кайро́т) *мужч.* Кола ў калаўроце. Я пра́ла, а ён, бе́днянькі, руку́ ў кайро́т усадзіў. Без рукі аста́ўся, яна ё, да не рабо́тае. *Р. Ч.*

КАЛАМУ́Т (каламу́т) *мужч.* Вір. У на́шуй ро́ўцы нямно́га каламу́таў, але́ што ёсць, дак вялі́кія. *В. В.*

КАЛАТУ́ШКА (калату́шка) *жан.* Драўляная прылада, якой раскалочваюць муку. Я старо́му гаварыла, каб зрабіў калату́шку, а то нама́ чым парася́ці муку́ раскала́ціць у гара́чай вадзе́. *Р. Ч.*

КАЛДО́БА (калдо́ба) *жан.* Выбоіна. Ну і калдо́ба зрабі́лася на даро́зе, ні праехаць. *Суд.*

КАЛЯЯ́ (каляя́) *жан.* 1. Чыгунка. Філе́на як рабі́ла на каляі́ ў Масквé, прысыла́ла Стэ́фца ні́так на пірабі́ранікі. Усяля́кіх прысыла́ла. *Фал.* 2. Чарга пасвіць кароў. Я́сік, ты ж глядзі́, за́ўтра на́ша каляя́ на па́сту. *Мац.*

КАЛІБЕ́ЛЬ (калібе́ль) *жан.* Дзіцячая калыска. Быва́ла, пало́жыш дзіця́ ў калібе́ль, а сам по́йдзеш на рабо́ту, яно цэ́лы дзень і праляжы́ць. *Р. Ч.*

КА́ЛІВА (ка́ліва) *прысл.* Крыху. Дай ты мне хоць ка́ліва ара́хаў, а то сварыцца бу́дзем. *Хац.*

КАЛІ́ЎЕ (калі́ўе) *ніяк.* Бульбоўнік. Уво́сень дык жжа́лі і ссушы́лі на зі́му калі́ўе. *Хац.*

КАЛО́ДА (кало́да) *жан. Гл.* ядзерка. Кало́да, кало́да, што за́ўтра бу́дзе — дождж ці пага́да? *Уж.* Тоўстая непаваротлівая жанчына. Стаіць, як кало́да, хай бы памагла́ рабіць. *Цял.*

КАЛЫМА́ЖКА (калыма́шка) *жан.* Тачка. Уну́к мне дро́вы на калыма́шцы прывёс. *Р. Ч.*

КАЛЫ́СКА-ПАЛАТНЯ́НКА (калыска) *жан.* Палатняная калыска накшталт заплечнай ношкі, у якой клалі дзіця. А як по́йдзем у по́ле, дык мало́я за пле́чы ў калы́ску-палатня́нку ды яду́ перад сабо́й, за тры кіларме́тры на ву́зенькую ні́ўку жаць да по́ту. *Пал.*

КАЛЫ́СКА (калы́ска) *жан.* Паглыбленне ў адным бервяне, у якое кладуцца іншыя, каб не раскачваліся пры перавозцы. Глядзі ж, Мікола, кап калы́ска была́ нямелкая. *Чыж.*

КАЛЫХА́НКА (калыха́нка) *жан.* Гушкалка. Павёсілі калыха́нку на дрэ́ва ды гушкаюцца. *Кам.*

КАЛЯВІ́НА (калявіна) *жан.* 1. Каляіна. Ты па гасьцінцы едзь, а то на той даро́зе адны́ калявіны. *Заям.* 2. Мокрая сенажаць. Лён яны́ заўсе́ды ў калявіне сла́лі. *Заям.*

КАЛЯ́НКІ (каля́нкі) *адз.* калянка. Кавалачкі бульбы ў супе. Парася́ткі каля́нкі павыбіра́лі, а ю́шку кі́нулі. *Чыж.*

КАМЕ́ШНІК (каме́шнік) *мужч.* Куточак пры печы. Каме́шнік малы́ і цымя́ны, а ён усё туды́ ле́зе. *Хал.*

КАН (кан) *мужч.* Бітон. Я́ня, ты ні ві́дзяла, я ту́така кан на малако́ ішчо́ адзі́н ста́віла? Хто гэ́та сяго́дня дзяжу́рыць? Мо́жа ён ві́дзяў? *Яц.*

КАНТА́К (канта́к) *мужч.* Прылада для перакручвання калоды на месцы пры пагрузцы. Бяру́ць канта́к і падкладаюць яго́ пат кало́ду, тады́ і грузіць ляхчэ́й. *Гіл.*

КАНЧЫ'ЦЬ (канчы́ць), -у, -ыш; *зак. тр.* Скончыць, закончыць. Я прыхо́джаю ро́біць, а ён ужо хлеў канчы́ў. *Чыж.*

КАПАНІ'ЦА (капаніца) *жан.* Лапата. Ці мо́жаце вы даць мне на не́йкі час капаніцу сваю, у маёй ру́чка зламалася, а зрабіць ру́чку нямá каму́, час бяжы́ць, не вы́капаеш карто́плю, дажджо́м зальé. *Меж.*

КАПА'ННІК (капáньнік) *мужч.* Той, хто капае бульбу. Ко́лькі капáньнікаў бу́дзець зваць Тэ́кля? Глядзі́, кап хапіла, бо назáўтра каня́ не дадуць і карто́пля застанéцца. *Меж.*

КАПТУ'Р (каптýр) *мужч.* Частка печы над топкай. Каптýр зарудзéў, трэ́ба ў субо́ту пабяліць. *Чыж.*

КАРАГА'Ч (карагáч) *мужч.* Ручнік. Мая́ мáма мне но́вы ружо́вы карагáч купіла. Бáчыш? *Ст.*

КАРАНІ'К (каранік) *мужч.* Вулей. У нас то́лькі адзін каранік стаіць, вунь пчо́лы зь яго ляцяць. *Борк.*

КАРТО'ПЛЯ (карто́пля) *жан., зборн.* Бульба. Ці мно́га засталóся выбіра́ць карто́плі, марозэ́ ш напіра́юць. *Меж.*

КАРЧЫ'СТЫ (карчы́сты) *прым.* Кусцісты. Рэ́тка се́ялі бу́льбу і сьпéе такáя карчы́стая. *Буз.*

КАСАВА'ЦЬ (касава́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Крэсліць. Піша і сам касу́е, піша і касу́е, а чаго́? *Буз.*

КАСМАВЕ'ШКА (касмаве́шка) *жан.* Галавешка. Да затушы́ касмаве́шку, дыміць жа. *Слаб.*

КАСЫ'НКА (касы́нка) *жан.* Кішэчны тлушч. Вунь ко́лькі касы́нкі надзе́рлі, дам і табе́. *Гіл.*

КАСЯ'К (касяк) *мужч.* Касынка. Вунь які́ стро́йны касяк павязáла. *Нар.*

КАЎГАНУ'ЦЬ (каўганýць), -у, -еш; *зак. тр.* Штурхануць. Ён мне як каўганýў у плéчы, я так на плот і паваліlася. *Ар.*

КАЎЗА'ЦЦА (каўзáцца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Слізгацца. Усе дзéці на перапы́нку вы́йшлі каўзáцца на лёт. *Хут.*

КА′ЎКА (ка́ўка) *жан.* Галка. На по́лі вясно́й заўсе́ды ка́ўкі мітуся́цца. *Бар.*

КАЎМЕ′Р (каўме́р) *мужч.* Каўнер. Каўме́р такса́ма тро́ба ўгада́ць прышы́ць. *Нав.*

КАЛЬБЕ′ЛЬ (кальбе́ль) *жан.* Калыска. Ране́й кальбе́лі з кары́ рабі́лі, а ціпе́р купля́юць. *Кап.*

КАЛЯСНІЧО′К (калясьнічо́к) *мужч.* Няпоўны воз сена. У яго́ яшчэ́ заста́ўся калясьнічо́к се́на. *Р. Ч.*

КАЛЯШЫ′ЙНІК (каляшы́йнік) *мужч.* Шарф мужчынскі, звязаны з суконных нітак. Завяжы́ каляшы́йнік, ма́ці так стара́лася для цябе́, ды і хо́ладна. *Мац.*

КАМАКІ′ (камакі́) *толькі мн.* Бульбяная каша, пюрэ. Гаспада́р заўсе́ды мо́ўчкі есьць ці то камакі́, ці то квас, уся ро́ўна. *Кузьм.*

КАМО′РКА (каморка) *жан.* Кладоўка. Прынясі́ с ка-мо́ркі са́ла, ключ у кішэ́ні майго́ каптана́. *Р. Ч.*

КАМЫ′ (камы́) *толькі мн.* Гарохавы суп. Еў камы́ і хвалі́ў, а я яшчэ́ ру́лі сма́чныя зрабі́ла. *Масц.*

КАМЯКІ′ (камякі́) *толькі мн.* Бульбяная каша. У Чурылаві дык на ка́шу з карто́плі ка́жуць камякі́. *В. В.*

КАМІНА′Р (камінар). Чалавек, які чысціць коміны. Ну і зама́заўся ты, як камінар які́, то́лькі во́чы і бліш-ча́ць. *Бяс.*

КАМЯНІ′ЦА (камяні́ца) *жан.* Куча каменняў. Мы адра́зу пае́дзем да той камяні́цы, што адра́зу за ве́скаю. *Кам.*

КАНА′ФА (кана́фа) *жан.* Дыван. Кана́фа — гэ́та вялі́кая і шырачэ́зная карва́ць з дро́ва з высо́кай сьпі́нкай і пары́ламі. На ёй мо́жна сядзе́ць і спаць, матра́с пала-жы́ўшы. *Акал.*

КАНДУ′Ш (канду́ш) *мужч.* Сяннік. Усе кандушы́ ў вугле́ скла́лі, по́тым разьбяру́цца. *Кузьм.*

КАНДЫБА′ЦЬ (кандыба́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Ісці павольна. Вунь стара́я Насту́ля кандыба́я па ву́ліцы. *Кам.*

КАНСЕ′РВЕННЫ (кансе́рвянны) *прым.* Кансервава-

ны. Назьбіра́лі чарве́й кансе́рвянную ба́нку — і на ры́бу. *Кам.*

КА′НТАР (ка́нтар) *мужч.* Чэпчык. Ета ж го́рача было́, дык я ка́нтар на галаву́ адзе́ну і со́нца не так пячэ́. *Р. Ч.*

КАПАНІ′ЦА (капаніца) *жан.* Жанчына, якая капае бульбу. Дзе ж гэ́та на́ша капаніца? Мо́жа да сястры́ пайшла́ капа́ць? *Суд.*

КАПЕРАЦІ′Ў (капераці́ў) *мужч.* Магазін. У наш капераці́ў прывязьлі́ шмат ху́стаў, плю́шавікаў, сачко́ў. *Заб.*

КАПТУ′Р (капту́р) *мужч.* 1. Высокая прычоска з доўгіх валасоў. І што цяпе́р за мо́да! Зро́біць капту́р на галаве́, што бу́сел гняздо́. *Уж.* 2. Дзіцячы галаўны ўбор. Надзе́нь мало́му капту́р. *Цяр.*

КАПЦО′ЎКА (капцо́ўка) *жан.* Ранняя бульба. Вазьмі́, Варывон, каня́: сёньня трэ' капцо́ўку паганя́ць. *Р. Ч.*

КАРАВА′ЦЬ (караваць) *жан.* Ложак. Калі́ яму зраби́лася дрэ́нна, то дзе́ці пяране́сьлі яго́ на караваць. *Р. В.*

КАРА′ВЫ (кара́вы) *прым.* Брудны. Памы́йся, ні хадзі́ кара́вы. *Цял.*

КАРАДНІ′К (караднік) *муж. Гл.* каранік. А вунь, ві́дзіш, караднікі́ с пшчо́лкамі стаяць. Калі́ ні бу́дзіш мяне́ слу́хаць, уну́чак, пшчо́лка ўку́сіць цябе́, яна́ ўсё чу́іць, што ты ро́біш. *Яц.*

КАРАНДА′Ш (карандаш) *мужч.* Малое дзіця. Не шуміце тут, карандашы́, а то з-за вас нічо́га не чува́ць у ха́це. *Р. Ч.*

КАРАНІ′К (каранік) *мужч.* Кароннік, разнавіднасць вулея. Я не змагла́ п жыць у го́радзе, там жа лю́ду, як пчол у каранікў, так шмат. *Хож.*

КАРАСІ′Н (карасін) *мужч.* Газа. У кра́мі ні было́ карасі́ну, дык мне прышло́ся ісьці ў сусе́дняю ве́ску. *В. В.*

КАРА′ЧЫК (кара́чык) *мужч.* Вялікі палец на назе. А маё ты дзіця́тка, дзе ш ты зьбі́ла кара́чык? Ідзі́, я дам табе́ тра́пачку, прамы́й, а ў бутэ́ляццы ёт ё, зальём. *Р. Ч.*

ҚА′РКІ (ка́ркі) *толькі мн.* Павозка. Ране́й мо́ладзь весяле́й жыла́, сабяру́цца, пася́дуць на ка́ркі ды ў лес. *Бяс.*

ҚАРО′ВА БРА′ЖНАЯ *лаянк., перан.* Чаго́ ты ле́таеш, як каро́ва бра́жная? Што я табе́ благо́га зрабі́ла? Ці я твой уча́стак запаха́ла? *Бяс.*

ҚАРО′НКІ (каро́нкі) *толькі мн.* Карункі. Апшы́ла я сабе́ ко́хту каро́нкамі. *Кук.*

ҚАРТА′Қ (карта́к) *мужч.* Мужчынская безрукаўка. Пашы́ла я свайму́ Лякса́ндру карта́к цёплы на зіму́. *Кук.*

ҚАРТУ′ЛЬ (карту́ль) *мужч., лаянк.* Чалавек малога росту. А мой брат, като́ры на вайне́ загі́нуў, вот жа малы́ быў. Мы на яго́ так браха́лі: «Карту́ль, карту́ль». *Бяс.*

ҚАРЭ′МЫСЕЛ (карэ́мысял) *мужч.* Каромысла. Яна́ не́сла ваду́ на карэ́мысьле. *В. Р.*

ҚАЎБУ′Х (каўбу́х) *мужч.* 1. Свіны страўні́к. Начыню́ каўбу́х мя́сам, а зімо́й усё за малі́нку по́йдзе. *Н. К.;* 2. *перан.* жывот. Іш ты яе, набі́ла каўбу́х, дык і не павёрнецца. *Н. Д.*

ҚАЎГА′РКА (каўга́рка) *жан.* Кружка. Прынясі́ мне каўга́рку, ды хуччэ́й, бо лю́дзі чака́юць, каб вады́ напіцца. *Р. Ч.*

ҚАЧА′НІК (кача́нік) *мужч.* Арэх. Хадзі́лі ў качаны́, дык цэ́лую то́рбу кача́нікаў прыне́сьлі, а ў адны́м ме́сцы было́ мно́га рассы́пана мінулаго́дніх кача́нікаў, відаць, вавёрчыны. *Граб.*

ҚАЧҚЕ′Т (качкёт) *мужч.* Шапка. Уну́чак, чаму́ ш ты качкёт не надзе́ў, а то ву́шы адме́рзнуць. *Р. Ч.*

ҚА′ША З МАСЛЁ′НІКАМІ (ка́ша з масьлёнікамі). Бульбяная каша з канапляны́мі клёцкамі. Таўку́ць з бу́льбы ка́шу і сы́пяць гэ́тыя масьлёнікі ў ка́шу. Гэ́та і ёсь ка́ша з масьлёнікамі. *Рад.*

ҚАШЭ′ЛЬ (кашэ́ль) *мужч.* Қошык. Пайшла́ і насабіра́ла по́ўны кашэ́ль дзікіх ігру́ш. *В. Р.*

КВАСЬ (квась) *жан.* Квас. Цэ́лы збан ква́сі нарабі́ла, а за два дні і нямá. *Бяс.*

КВАРТО́ЎКА (кварто́ўка) *жан.* Паўлітровая бутэлька. Стаяць кварто́ўкі дзве на палі́цы. *Р. Ч.*

КВАСО́ЛЬ (квасо́ль) *жан.* Фасоля. Квасо́ль вы́палала, а гаро́х так і аста́ўся. *Ліс.*

КВА́ШАНКА (ква́шанка) *жан.* Кіслае малако. Бяры́це, дзяўчáткі, ква́шанку. Яна́ не ве́льма шчэ кі́слая. *Р. Ч.*

КВІТ (квіт) *мужч.* Квітанцыя. Лясні́чы адда́ў майму́ гаспадару́ квіт на ру́кі. *Гіл.*

КВО́ХАЦЬ (кво́хаць) *незак. тр.* Квактаць. Ку́рыца кво́хала не́дзе за куста́мі. *Ліс.*

КЕ́МКІ (ке́мкі) *прым.* Кемлівы. Ке́мкая яна ў нас, до́ўга гаварыць і ня тро́ба. *Хож.*

КІ́ДКА (кі́тка) *жан.* Вялікі ахапак сена. Дзя́цька но́ччу кі́дку прыцягну́ў. *Кірк.*

КІДЭ́РМА (кідэ́рма) *жан.* Клін у адзенні. А ты пашы́й у кідэ́рмы андара́к, бу́дзе выгля́дней. *Р. Ч.*

КІЕ́ЎКА (кіе́ўка) *жан.* Галоўкі чарота. Вунь каля бе́рага ў вадзе́ кіе́ўкі расту́ць. *Мац.*

КІ́ЛБА (кі́лба) *жан.* Рыба пячкур. На́шы рыбало́вы кі́лбы налаві́лі, на́ват ванѓо́р папа́ўся. *Бар.*

КІНДЗЮ́К (кіндзю́к) *мужч.* Страўнік. У нас каро́ва до́брая, малака́ мно́га, дык я дава́ла малако́ а́ннаму́ се́ду. Ён быў хво́ры, палаві́ну кіндзюка́ вы́разалі ямý, е́сьці нічо́га не мох. *Бяс.*

КІ́ПЯЦЕНЬ (кіпя́цянь) *мужч.* Вар. Тро́ба ш ісьці́ мукý кі́пятнямі запа́рыць. *Кам.*

КІРМАШО́ВЫЯ (кірмашо́вы) *прым.* Верхнія пярэднія зубы. На́ша бабу́ля ўсё хва́ліцца, што ў яе кірмашо́выя зу́бы захава́ліся. *Хал.*

КІ́СНУЦЬ (кі́снуць), -у, -еш; *незак. тр.* Смяяцца. Чаго́ ты кі́сьнеш бес прычы́ны? *Кам.*

КЛАЧА́НКА (клача́нка) *жан.* Коўдра, сшытая з двух саматканых посцілак. Ху́ценька кладзі́ся і накрыва́йся клача́нкай. *Ган.*

КЛІНЫ́ (кліны́) *толькі мн.* Прарэх у штанах. Ужо такі ён чалаве́к, ве́чна з рашпі́лянымі клінамі хо́дзя. *І. Гар.*

КЛО́ПАЛКА (кло́палка) *жан.* Квактуха. Ране́й не было́ ча́су глядзе́ць за кло́палкай, кі́неш яе, дык палавіны кураня́т і нямá. *Р. Ч.*

КЛЫ́НДА (кле́ында) *жан.* Страва з ільнянога семя. Упе́рат я люби́ла гэ́тую кле́ынду, а ціпе́р не́што ні хо́чацца яе е́сьці. *Кук.*

КЛЫ́НДЫ (кле́ынды) *толькі мн.* Ногі. Нахадзі́лася за дзень: і за кане́м схадзі́ць, і плушка́ расстара́цца. Ве́дама, без мушчы́ны жыву́. Кле́ынды ледзь цяга́ю. Ля́жу ў пасьце́ль — аж мле́юць. *Р. П.*

КЛЫГУНІ́ХА (клыгуніха) *жан., неадабр.* Жанчына, якая ўсё стогне. Яна́ ко́лькі жыве́, сто́лькі сто́гне, клыгуніха гэ́та. *Бяс.*

КЛЫ́ШКА (кле́ышка) *жан.* Замочак. У мяне́ яно́ й нічо́га нямá ў ім, палатна́ ё скру́тачак і паркáль бе́ленькі ляжы́ць, ды я й паве́сіла кле́ышку, а то дзе́ці вы́мажуць рукáмі, вядо́ма, са двара́. *Р. П.*

КЛЯНО́ЎНІК (кляно́ўнік) *мужч.* Участак лесу, дзе расце клён. На тым ме́сцы упе́рад рос непраходны кляно́ўнік, а за́раз вы́рубілі. *Гіл.*

КНА́ТКА (кна́тка) *жан.* Цэўка. Кро́сны ткáла ўвесь дзень, а дзяцёй застаўля́ла кна́ткі круці́ць. *Бяс.*

КО́ЛІЯ (ко́лія) *жан. Гл.* калея. Учо́ра ў по́ле ганя́ў каро́ў Савэ́рка, а се́ньня прыйшлá ко́лія мне́. Папрасі́ла я свайго́ ўну́ка, каб адбы́ў ко́лію, а самá пайшлá жаць траву́. *Кор.*

КО́НСКІ ВОЎК (ко́нскі воўк). Вялікі сівы воўк ростам з жарабя. На ўзле́сьсі ба́чыў ко́нскага ваўка́. *Кам.*

КО́ЛЬКА (ко́лька) *прысл.* Колькі. Ко́лька я знахо́дзіў такіх гне́здаў у ле́сі. *Кам.*

КО́ПКА (ко́пка) *жан.* Месца, дзе ставяць скавароды. Пайду́ тро́ха падбяру́ ў ко́пцы, а то абы-чаго́ панастаўля́лі, што і скавaро́д нямá дзе падзе́ць. *Бяс.*

КО́РПАЦЦА (ко́рпацца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Рабіць павольна. Ко́рпаяцца цэ́лы дзень, а рабо́ты той ні відаць. *В. В.*

КОТ (кот) *мужч.* Вечарынка. Ве́чарам бу́дзям гуля́ць ката́. *В. В.*

КО́ЎЗАЦЦА (ко́ўзацца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Варочацца. Я доўга ко́ўзалася ў пасьце́лі, по́куль засну́ла. *В. В.*

КО́ЎЗАНКІ (ко́ўзанкі) *толькі мн.* Катанне з ледзянóй гары. То́лькі празьвіне́ў званóк, як мы з усіх нох пабе́глі на коўза́нкі. *Бяс.*

КО́ЎТУХ (ко́ўтух) *мужч.* Катух. Загані́, сынóк, парсю́ка ў ко́ўтух. *Уж.*

КО́ТАНКА (ко́танка) *жан.* Расліна, якая скошваецца для сіласу. Папа́сьцілі тро́шкі цяля́т на кле́віры, а тады́ ўзаралі і пасе́ялі гарóх на ко́шанку.

КРАКО́ВІК (краковік) *мужч.* Кракавяк. Я, як была маладáя, мазу́рку любíла танцава́ць, краковіка ў чаты́ры па́ры хадзíлі, кадры́лю танцава́ць. Мяне́ й цяпе́р, стару́ю, як яка́я гуля́нка, бяру́ць танцава́ць. *Бяс.*

КРА́ЛЯ (кра́ля) *жан., неадабр.* Ганарлівая дзяўчына, якая любіць ўпрыгожвацца. Паду́маеш, кра́ля така́я знайшла́ся: як пашы́та, так і зно́сіцца, а гэ́тыя хвальбóны і сама дарóбіць. *Рудн.*

КРАМЯ́НЫ (крамя́ны) *прым.* Худы. І хто яе ве́дая, чаго яна така́я крамя́ная, і есьць дóбра, а ўсё нічóга. *В. В.*

КРАСЕ́ННАЕ (красе́ннае) *прым.* Вытканае на кроснах. У мяне́ ўжó усе́ красе́ннае звóдзіцца, таксáма бóлей магазíннага. А я так прывы́кшы да красе́ннага. *Фал.*

КРА́СІЦЦА (кра́сіцца), -у-ся, -іш-ся; *незак. тр.* Ужываць касметыку для твару. Уста́ласьці на яе́ нямá. Кра́сіцца, што аж бры́тка глядзе́ць. Усё ры́ла закры́та, як скары́нкаю. *Узгур.*

КРА́СКІ (кра́скі). Хатнія кветкі. Бывáла, зóйдзеш у хáту, а ў яе кра́скі ўсю́ды стаяць. *Р. Ч.*

КРАСНЯ́К (красьняк) *мужч.* Падасінавік. Се́лята

по́вен лес уся́кіх грыбо́ў: і лісі́чак, і ба́бачак, і красня-ко́ў. *Кам.*

КРАСУ́ЛЯ (красу́ля) *жан.* Радуга. Як красу́ля на не́бе, ка́жуць, дошч тры дні бу́дзе. *Р. Ч.*

КРАХМАЛЁ́ЎКА (крахмалёўка) *жан.* Вадкая страва з малака, яек, крухмалу, тлушчу. Нікóлі крахмалёўку ня е́ла? То сядáй з нáмі. *Суц.*

КРУГЛЬ (кругль) *мужч.* Фундамент. Ста́ршы аддо́ў прыка́с і рабо́чыя ху́тка зрабі́лі кругль для гэ́тага до́ма. *Р. Ч.*

КРУГЛЯ́К (кругля́к) *мужч.* Трава з круглымі лістамі. Ні асака́, а кругля́к, то і со́хня до́бра. *Кам.*

КРУЦЕ́ЛКА (круце́лка) *жан.* Гарэзлівая дзяўчына. Ну і круце́лка ж у цябе́ дачка́: на месцы і міну́ты не ўсядзі́ць, то тут, то там, усё ска́ча. *Узгур.*

КРЫВУ́ЛІ (крыву́лі) *толькі мн.* Прычэп да воза, што выкарыстоўваецца пры перавозцы доўгіх бярвенняў. Як ні круці́, хло́пцы, а крыву́лі да во́за тро́ба. *Чыж.*

КРЫВЫ́ (крывы́) *прым.* Зайздросны. Га́нна вельмі́ ж крыва́я, кап прыме́ла, дык усё п загро́бла сабе́. *В. В.*

КРЫ́ЗКІ (кры́скі). Махры. У міне́ яшчэ́ адна́ ху́стка засталáся с кры́скамі. *Кам.*

КРЫКСУ́Н (крыксу́н) *мужч.* Крыклівае дзіця. Ну і крыксу́н, у каго́ ён уда́ўся. *Чар.*

КРЫ́САЧКІ (кры́сачкі) *толькі мн.* Збо́рачкі. Я сваю суке́нку бу́ду шыць у кры́сачкі. *Р. Ч.*

КРЫЖЫ́ (крыжы́) *толькі мн.* Прылада для размотвання маткоў пражы. Уну́чак, пада́й мне крыжы́, буду разма́тваць пражу́. *Р. Ч.*

КРЭ́СКА (кре́ска) *жан.* Рыска. Завязьлі́ мы гэ́ную канюшы́ну на база́р у Даўгі́нава, прадалі́ і купі́лі мне пе́кную таку́ю ху́стку квя́тамі вялікімі чырво́нымі і кре́сачкі чо́рныя. *Яз.*

КУБА́РКА (куба́рка) *жан.* Кубак з бляхі, з прыкручанай драцянай ручкай. Ле́пей вазьмі́ куба́рку і налі́ мне ў сагóн вадзі́цы, по́йдзім цялу́шачку паіць. *Яц.*

КУБА́РКА (куба́рка) *жан.* Коўш драўляны з каротkай ручкай. Калі́ вады́ хо́чаш, то вазьмі́ вунь куба́рку ды набяры́. *Калод.*

КУ́БЕЛ (ку́бел) *мужч.* Кацёл, чан. Наняла́ся бялі́зну мыць. Чаты́ры ку́блы стая́лі: ле́тняя вада́, гара́чая вада́, хало́дная вада́, прахла́дная вада́,— э́та чаты́ры ку́блы з вадо́й. *Паг.*

КУБЁ́ЛАК (кубёлак) *мужч.* Кубелец. Быва́ла, наробя́ ра́жак, кубёлкаў, бо́як, узло́жа на плечы сабе́ штук дзе́сіць, Фядо́сцы сто́лькі ж — і папёрлі ў Пле́шчаніцы. *Мал.*

КУГА́ШКА (куга́шка) *жан.* Пасудзіна, якой чэрпаюць у лазні ваду. За куга́шку не было́ як узя́цца го́лай руко́й, гэ́так яна́ нагрэ́лася. *Хац.*

КУ́ДЛА (ку́дла) *жан., пагардж.* Распусніца. Скруці́лася саўсі́м дзе́ўка, ку́длаю ста́ла. *Бр.*

КУЛІ́НА (куліна) *жан.* Спакойная затока ў рацэ. На на́шай Бяро́зе ад адно́й Чыжа́хі да Перавозу тры кулі́ны. *Чыж.*

КУ́ПЛЕНЫЯ (ку́плены) *прым.* Прыезджыя. Ту́бельцы дру́жна жыву́ць, а ку́пленых людзе́й стара́юцца хоць як-не́будзь зьнява́жыць. *Бяс.*

КУ́РА (ку́ра) *жан.* Курыца. Шафёр е́хаў на машы́не і ва́шу ку́ру забіў. *Кам.*

КУ́РАВА (ку́рава) *ніяк.* Пыл. У ха́це ўжо ку́рава мно́га, бо я на рабо́це, а бабу́ля ўвесь час сьпіць на ляжа́нцы. *Кузьм.*

КУРА́ЛЬ (кура́ль) *мужч.* Лучына. Быва́ла, уста́ніш, ды ні па часа́х, а па пятуха́х, ды ні за лямпачкай, а за кура́лем, у часы́ чаты́ры, ды тро́ба ў сту́пя таўкачо́м гру́цы натаўчы́, пасушы́ць на пры́пячку ў по́лымі, зварыць ды сямёйку пакарміць. *Пал.*

КУ́РНІК (ку́рнік) *мужч.* Месца, дзе сядзяць куры. Усе ку́ры ў ку́рнік пасе́лі? Зажані́ яшчэ́ вунь адну́. *Гіл.*

КУРО́ДЫМІЦЦА (куро́дыміцца) *незак. тр.* Дыміц-

ца. Нéйкія дзьвé галавéшкі куро́дымяцца ў пéчы, залíць трэ́ба. *Бяс.*

КУРО́САННЕ (куро́саньне) *ніяк.* Курасадня. Маé ку́ры ўжо даўно́ на куро́саньні сядзя́ць, а чаго́ éта ты сваіх ня заганя́яш? *Р. Ч.*

КУРЫ́ЦЬ (куры́ць), -у, -ыш; *незак. тр.* Вэндзіць. Сусе́дзі ко́жны гот ку́раць кумпя́к, не́як і мы рас папро́бавалі, панра́вілася. *Бяс.*

КУСА́ННІКІ (куса́ньнікі) *толькі мн.* Аб'едкі. Скажы́, дзе гэ́тыя куса́ньнічкі дзява́ць? *Кам.*

КУСА́ЧЫ (куса́чы) *прым.* Куслівы. Про́шлы гот у нас рой узьня́ўся. Сеў у садо́чку, на галíнку се́лі пчо́лы. Я́блынька мале́нькая, я дзяржу́ яе за ко́ньчык, каб саўсім ні зламáлася. А пчо́лы нічо́га, ні пакуса́лі. А мо́жа гэ́та сорт такí, што някуса́чыя. *Бяс.*

КУ́ФАР (ку́фар) *мужч.* Шафа. Пла́цьця но́выя ў ку́фры вісяць. *Р. В.*

КУФА́ЙКА (куфа́йка) *жан.* Фуфайка. Надзе́ла п куфа́йку, дык і цёпла было́ п. *Чар.*

КУ́ХАЛЬ (ку́халь) *мужч.* Кружка. Была́ ў ле́се сасьмя́гла, прыйшла́ дадо́му, дык цэ́лы ку́халь вады́ вы́піла. *Кук.*

КУ́ХЦІЦ (ку́хціц) *мужч.* Сундук. Мае по́сьцілкі ляжа́ць у ку́хціцу. *В. В.* Не́мцы як прышлí з во́быскам, дык ма́ці запе́рла яе ў ку́хціц. *Кам.*

КУ́ЦЬКА (ку́цька) *жан.* Кавалак рафінаду. Я люблю́ піць чай с ку́цькаю, а сало́ткага не люблю́. *Р. Ч.*

КУЧКАВА́ЦЦА (кучкава́цца) *незак. тр.* Збірацца ў чароды. Што гэ́та тако́я, што бацяны́ кучку́юцца? Шчэ ш ім ра́на. Што гэ́та яны ўжо во́сянь ско́рую чу́юць, ці што? *Каб.*

Л

ЛА́ВА (ла́ва) *жан.* Вялікі кавалак зямлі. Се́ньня апало́ла таку́ю вялíкую ла́ву бурако́ў. *Кам.*

ЛАГ (лах) *мужч.* Жэрдка, якую прыстаўляюць да ваза. Ла́гі прыстаўля́юць да во́зу і ко́цяць па іх дрэ́вы. *Гіл.*

ЛАГЧАВІ́НА (лахчавіна) *жан.* Лагчына. І якра́з жа во тут во, на кладбі́шчы, за гэ́тымі во па́мятнікамі, Со́калаў з атра́дам засе́ў, у гэ́тай во лахчавіне, і як далі́ прыка́с, парціза́ны як чхну́лі с усіх старо́н, то хваці́ла там і паліца́ям, і не́мцам. *Мік.*

ЛАДЫ́ШКА (лады́шка) *жан.* Збанок без ручкі. Ямý што, лады́шку малака́ вы́піў і на двор пабе́х. *Бр.*

ЛАЖБЕ́НЬ (лажбе́нь) *мужч., лаянк.* Гультай. Лажбе́нь ты, вазьмі́ся за рабо́ту, а то нічо́га ні заро́біш на зі́му. *Кам.*

ЛАЖБЕ́Й (лажбе́й). Гультай. Вот не́йкі лажбе́й, саба́к ганя́е, а нічы́м не зо́ймяцца. *Кам.*

ЛАЛЭ́Й (лалэ́й) *агульн., абраз.* Чалавек з вельмі тоўстымі губамі. Гу́бы ў яго то́ўстыя і кру́глыя, як у сапра́ўднага лалэ́я. *Крок.*

ЛА́ПАЦЬ (ла́паць), -ю, -еш; *незак. тр.* Чапаць. Не ла́пай мяне́, бо дам. *В. В.*

ЛАПАТУ́Н (лапату́н) *мужч., неадабр.* Чалавек, які многа гаворыць. Ну і лапату́н жа еты Андрэ́й, нагаво́рыць, нагаво́рыць, а зрабіць ня зро́біць. *Р. Ч.*

ЛА́ПІК (ла́пік) *мужч.* Плямачка. На памідо́ры ла́пік зялёны, гэ́та ён бу́дзе псава́цца. *Чар.*

ЛА́ПІНКА (ла́пінка) *жан.* Пустое месца на полі, не пакрытае гноем. Ба́цька ўсё крычы́ць на нас: «Растраса́йце до́бра гной, кап ла́пінкі нідзе́ не асталó́ся!» *Бяс.*

ЛАСКАТА́ЦЬ (ласката́ць), -у, -аш; *незак. тр.* Балбатаць. Сабяру́цца і ласко́чуць, і ласко́чуць, калі́ яны ўжо сьці́хнуць? *Р. Ч.*

ЛАТУХЕ́Я (латухе́я) *жан.* Драная бульба. А латухе́ю хто зьдзёр? Нікаму́ дзе́ла да е́тага нет. *Р. Ч.*

ЛАТУ́ШКА (лату́шка) *жан.* 1. Драўляная лыжка. У нас шчэ дзеравя́нныя лату́шкі ест, і́мі е́сьці лепш — не го́рача. *Р. Ч.* 2. Гліняная міска. Даўней такі́х мі́сак не бы́ло́, а былі́ анны́ лату́шкі з гліны. *Р. Ч.*

ЛАТУ́ШНІК (лату́шнік) *мужч.* Каша з яец і пшанічнай мукі. Цэ́лы чыгу́н лату́шніку наварыла. *Р. Ч.*

ЛАЎЧЭ́Й (лаўчэ́й) *прысл.* Лепш. Лаўчэ́й было́ п, кап ты не цяга́ўся ўсю ноч, а лёх ды спаў. *Ліс.*

ЛАХМА́НІК (лахма́нік) *мужч.* Блузка. Адзін лахма́нік адзе́ла, дык хо́ладна, трэ́ба ісьці цяплей адзе́цца. *Кам.*

ЛА́ХТА (ла́хта) *агульн., неадабр.* Чалавек, які хутка і без толку гаворыць. З гэ́тай ла́хтай і спрача́цца ня трэ́ба было́, сэ́нсу нама́. *Кірк.*

ЛЕВАРУ́КІ (левару́кі) *мужч.* Ляўша. Левару́кі, а пі́ша пра́ваю. *Граб.*

ЛЕ́ДЗВІ (ле́дзьві) *прысл.* Ледзь. Ле́дзьві ні заблудзі́ла се́ньня ў ле́сі. *В. В.*

ЛЕКАТА́ЦЬ (леката́ць), -ч-у, -ч-аш; *незак. тр.* Дрыжаць ад холаду. Не лекачы́ — ідзі́ апраніся, ста́не цяпле́й і ты супако́ішся. *Меж.*

ЛЕ́СКА (ле́ска) *жан.* Лесвіца. Вазьмі́ у Рыго́ра ле́ску, трэ́ба на гару́ зла́зіць. *Кам.*

ЛЕ́СКІ (ле́скі) *толькі мн.* Лесвіца. Чаму́ з агаро́да ле́скі не прыне́сла? Мне ж на гару́ се́на зане́сьці на́да. *Луц.*

ЛЕ́ТНІ (ле́тні) *прым.* Чуць цёплы. Вада́ асты́ла, чуць ле́тненькая. *Ліс.*

ЛЕ́ТНІК (ле́тнік) *мужч.* 1. Жаночы лёгкі жакет без падкладкі. Быва́ла, мы ле́тнік адзя́ём, як ідо́м у цэ́ркву, а тады́ зноў зьніма́ем. *Р. Ч.* 2. Шлях, па якім ездзяць толькі ўлетку. Ты пыта́ла, дзе мае дзе́ці падзе́ліся, а яны́ вунь па ле́тніку ў лес пайшлі. *Р. Ч.*

ЛЕ́ТАЧКА (ле́тачка) *жан.* Ляток. Стары́ до́бра даглядаў пчо́лак. На зі́му абло́жа пчол картапля́ньнікам, се́нам, пакі́не адкры́тай ле́тачку, каб ды́хаць ім мо́жна было́. *Бяс.* Мала́я дзі́рачка, праз яку́ю пчо́лкі вылята́юць, заве́цца ле́тка. *Там жа.*

ЛЕ́Я (ле́я) *абраз.* Тоўстая жанчына. Та́я ле́я ізно́ў мае гуркі патапта́ла. *Кам.*

ЛЕ́ПАЛКА (ле́палка) *жан.* Прылада для зніш[illegible]

мух. Сто́лькі мух развялó́ся, што ні лёпалка ні памага́е ні што другóе. *Кам.*

ЛЁ′ТАМ (лётам) *прысл.* Бягом. Вéчна ўсё лётам ды лётам, нямá калí пасядзéць ні мінýты. *Бяс.*

ЛЁ′ХА (лёха) *жан.* Адтуліна ў падмуроўцы. Лёхі на зíму затыкáюць, кап пол не настывáў. *Бр.*

ЛІДА′ІК ((лідáік) *мужч.* Ташната. Гэ́та ж трэ́ба так мнóга калыхáцца, што прышóў ды й гавóрыць: «Мáма, мне вéльмі плóха, лідáік вéрне». *Р. Ч.*

ЛІПНЕ′Г (ліпнéх) *мужч.* Сушанае лісце ліпы. Ліпнéх тожá élі з гóра. *Бяс.*

ЛІСА′ВЫ (лісáвы) *прым.* Ласкавы, тактоўны. Ён такí лісáвы, усягды́ пагавóрыць с чалавéкам, пасьмяéцца. *Цяр.*

ЛІСТАНО′ШКА (лістанóшка) *жан.* Лістаношка газэ́ты нясé, пастаю́ забярý. *Заб.*

ЛО′ЖА (лóжа) *жан.* Ложак. Я ні даю́ сваю́ лóжу закрывáць кáпай, ні люблю́. Кóлісь у мóдзе былó лажы́ць на лóжу падýшак цэ́лую гарý, навéрх я́сікі. *Фал.*

ЛОЙ (лой) *мужч.* Авечы тлушч. Зарэ́залі авéчку, дак натапíлі дзьве мíскі лóю. *В. В.*

ЛО′КША (лóкша) *жан.* Локшына. У крáму лóкшы прывязьлі, бáбы маментам расхватáлі. *Заб.*

ЛО′ПАТ (лóпат) *мужч.* Шум. Надаéлі гэ́тыя гýсі, такí ш лóпат паднíмуць, што хоць вýшы затыкáй. *В. В.*

ЛО′ПАЦЕНЬ (лóпацень) *мужч., асудж.* Жанчына, якая многа і без толку гаворыць. Мая́ сусéтка такí ўжо лопацéнь, лапóча, лапóча без канцá і ўсё бес тóлку. *Бяс.*

ЛОЎЖ (лоўш) *мужч.* Куча вецця́ў. І што толькі ў гэтым лесе нарабíлі? На кожным кроку ляжыць лоўш, нельга прайсьці. *Цяр.*

ЛУ′ТЫ (лýты) *толькі мн.* Лыка. Бывáла, як спляцéш лáпці з лýты, дык хóдзіш у іх усю́ды, бо адзéць больш нічóга не былó. *Р. Ч.*

ЛУЧНІ′К (лучнік) *мужч.* Дзірка. Тóлькі сéньня адзé-

ла но́ваю во́пратку, а як паглядзе́ла ў люстэ́рка, дак у ёй то́лькі адны лучніке́. *Р. Р.*

ЛЬГА (льга) *прысл.* Магчыма. Зра́зу дык было́ льга жыць, а по́тым ста́ла зусім не́льга. *Кухц.*

ЛЭ′ГУР (лэ́гур) *мужч.* Парадак. Ясі ты без ніякага лэ́гуру. *Цял.*

ЛЮБО′СЦІ (любо́сьці) *толькі мн.* Любошчы. Адно́йчы мы йшлі́ прас кано́плі даха́ты і ні зна́лі, што наш разгаво́р патслу́хваюць на́шы дзяцюкі. Усе дзе́ўкі раска́зываюць пра сваé любо́сьці, ну й мяне́ нячы́сьцікі за язы́к пацягну́лі расказа́ць пра Даніпа́та. *Пуз.*

ЛЮСТЭ′РКА-ТРАЯ′Ґ (люстэ́рка-траяк) *ніяк.* Трыльяж. Зайдзі ў ко́жнага ха́ту — вы́малявана, вы́крашана, у любо́га до́брага люстэ́ркі-траякі, ра́дзівы, целявізары. Што гэ́та, шуце́йная дзе́ла — така́я жысь. *Мік.*

ЛЯ′ДА (ля′да) *прысл.* Дрэнна. Мой ону́к ля́ды пі́ша, усé цятра́дзі замо́рзаныя і сам замо́рзаны. *Р. Ч.*

ЛЯДА′ТЫ (лядаты) *прым.* Стары чалавек. Лядаты, а які́ яшчэ́ жва́вы. *В. В.*

ЛЯЖА′ЙКА (ляжа́йка) *жан.* Ляжанка. Напалі́ла ляжа́йку, узьле́зла на́нач, вы́гралася, дак і ка́шаль пярасто́ў. *Цял.*

ЛЯЖА′Ґ (ляжа́к) *мужч.* Разнавіднасць вулея. Ра́мачныя во́леі ў гэ́тым го́дзе прадала́, нямá каму́ даглядáць, асталі́ся кало́ды-ляжакі, ляжа́ць пад я́блынямі ў агаро́дзе. *Бяс.*

ЛЯ′ЗАЦЬ (ля́заць), -аю, -еш; *незак. тр.* Лазіць. Гляджі́, сыно́к, не ля́зай абы́ куды́. *Якш.*

ЛЯЗГАТА′ЦЬ (лязгата́ць), -ч-у, -ч-аш; *незак. тр.* Крычаць, лаяцца. Пяраста́нь ты лязгата́ць на ўсé сяло́. *В. В.*

ЛЯКАТА′ЦЬ (ляката́ць), -у, -аш; *незак. тр.* Дрыжаць. У дзьвéрцы сту́каюць, а я сяджу́ і лякачу́. *Св.*

ЛЯНУ′ХА (лянýха) *жан.* Вадкая страва са свежай капусты. Сяго́ньня на абе́т у нас лянýха, як прасі́лі. *Масц.*

ЛЯ′ПАЦЬ (ля́паць), -ю, -еш; *зак. тр.* Гаварыць абышто. Ён цэ́лы ве́чар ля́паў абы-што́. *Р. Р.*

ЛЯ′ПАЦЬ (ля́паць), -ю, -еш; *незак. тр.* Стукаць. Усё ля́пая і ля́пая па сталé, ні супако́іцца. *В. Р.*

ЛЯ′ПАЦЬ КІ′ШКАЙ (ля́паць кі́шкай). Галадаць. Стара́йцяся вы́браць карто́плю, а то бу́дзяця зімо́ю ля́паць кі́шкай. *В. В.*

ЛЯ′ПНУЦЬ (ля́пнуць), -у, -еш; *зак. тр., перан.* Сказаць абы-што. Вось ля́пнула, дык ля́пнула, і слу́хаць бры́тка. *Уж.*

ЛЯСЕ́′НКА (лясе́нка) *жан.* Торбачка. По́ўную лясе́нку яды́ набра́ла. *Р. Ч.*

ЛЯ′СКАЦЬ (ля́скаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Стукаць. Прышо́ў уве́чары з гульні і дава́й ля́скаць у дзьве́ры. *В. В.*

ЛЯТУНЫ′ (лятуны́). Хлопцы-аднагодкі, падлеткі. Вот гэ́тыя лятуны́, вам спако́ю ні даю́ць. *Кам.*

ЛЯ′ХА (ля́ха) *ніяк.* Рэха. Ціха́ ў ле́сі, то́лькі ля́ха адгука́ецца. *Р. В.*

М

МАГАЗІ′НШЧЫЦА (магазі́ншчыца) *жан.* Прадаўшчыца. Не́калі як Ба́йдурыха была́ магазі́ншчыцай, мно́га тава́раў было́, а цяпе́р як дзе́ўкі ста́лі таргава́ць, дык нема́ нічо́га. *Белар.* Цэ́льны дзень магази́н закры́т, ма́быць, магазі́ншчыца ў го́рат паéхала. *Там жа.*

МА′ГЛІ (ма́глі) *толькі мн.* 1. Прыстасаванне для прасавання вымытай бялізны. Трэ́ба бялізну паці́га́ць, выраўнава́ць, тады́ ў ма́г′лі вы́маг′ляваць. Ма́глі такія от ік у нас кро́сны, Ма́нька. Пало́жыш на э́тыя от як кро́сны, закру́ціш — і гла́дзінькая бялі́зна выхо́дзіць с катко́ў, ва́лікаў такіх. *Паг.* 2. Пранік і качалка. Трэ́ба ўзяць у Ма́ні ма́глі і пакача́ць насто́льнікі. *Борк.*

МАДЭ′ДА (мадэ́да) *жан.* Модніца (у адносінах да жанчыны, якая любіць модна апранацца). Гля́ньце, лю́дзі, што гэ́та мадэ́да са сваéй спадні́цаю нарабі́ла: паначапля́ла істу́шкаў, панашыва́ла гу́зікаў, на́ват там і дзе не трэ́ба. *Меж.*

МАЗГАВІ'НА (мазгавіна) *жан., зневаж.* Галава. За́раз як дам гэ́тай се́ткай па гэ́тай дурно́й мазгавіне. *Кам.*

МАЗЕ'ЛІК (мазе́лік) *мужч.* Подмазка. Быва́ла: «А каб цябе́ ко́ршун». Кот мазе́лік пане́с, што патэ́льню ма́заць. А цяпе́р во са́ла ляжы́ць, і ко́шка не бярэ́ць. Скажаш, ніпра́ўды? *Мік.*

МАЗЕ'ПА (мазе́па) *агульн., неадабр.* Размазня (аб чалавеку). Наштó ш ты на яго мазе́па сказа́ла? *Буз.*

МА'ЙТКІ (ма́йткі) *толькі мн.* Штаны. І сам ён хло́пец мóдны, і ма́йткі ў яго́ мóдныя. *Мал.*

МАКЕ'РКА (макéрка) *жан.* Бляшаная баначка. У макéрку даўнéй гро́шы склада́лі на хранéне. *Р. Ч.*

МАКРЫ'ЦА (макры́ца) *жан., бат.* Пустазелле, якое расце на вільготных месцах. Макры́цу на́тта дóбра рваць. *Цяр.*

МАЛЕ'НЧЫЦЦА (малéнчыцца), -у-ся, -ыш-ся; *незак. тр.* Паводзіць сябе, як малыя дзеці. Вялíкія дзéўкі, а малéнчацца. *Кам.*

МАЛЬДАВА'ЦЬ (мальдава́ць), -ую, -еш; *незак. тр.* Адзначаць. Чаго́ ты не прыйшóў? Перат схóдам усіх прысýтных мальдава́лі. *Бар.*

МАНЕ'РКА (манéрка) *жан.* Чашка. Купíла я ўчóра ў магазíня манéрачку, цяпе́р бýду зь яе чай піць. *Кук.*

МАНЮ'К (маню́к) *мужч., зневаж.* Ілгун. Каму́ што надýмае зманé, тóлькі усьпіва́й яго слýхаць, вот маню́к. Усé на вéсцы завýць яго маню́к. *Бяс.*

МАЛО'ЦЬ ЯЗЫКОМ *перан.* Гаварыць што папала. Слуха́й яе, што яна́ языко́м мéля. *В. В.*

МАНІ'ЦЫ (маніцы) *толькі мн.* Спелыя каноплі. Ранéй сéялі канóплі, дык як яны́ пасьпéюць, іх называ́юць маніцамі. *Цяр.*

МАНЮ'КА (маню́ка) *агульн.* Ілгуння. Была́ нявéстка праўдзіва і жóнка маню́ка. От пякýць ала́ткі, а дзет на пéчы сядзíць і зла́зіць не хóча. Нявéстка гавóра дзéду: «Я табé дам анну́ ала́тку і анну́ сква́рку». Ска́жа так і дасьць, як сказа́ла. Як жóнка пячэ́ ала́ткі, тóжа гавóра:

«Я табе́ дам анну́ ала́тку і сква́рку». Ска́жа так, а сама́ дасць анну́ ала́тку і дзьве́ сква́ркі. Так дзет і гаварыў, што ў яго́ нявёстка праўдзі́ва, а вось жо́нка манюка. *Белар.*

МАРМУ′ЛЬ (мармуль) *мужч.* Негаваркі чалавек. Такі́ ўжо́ мармуль, сло́ва зь яго́ не вы́цягнеш. *Бяс.*

МАРЫНА′РКА (марына́рка) *жан.* Пінжак. Падляці́ ў кра́му, там фа́йныя марына́ркі прывязьлі́. Ка́жуць, зра́ньня й ясёнкі былі́. *Заб.*

МАСЛЁ′НКІ (масьлёнкі) *толькі мн.* Тоўчанае льняное семя з соллю. Наваруў шаймо́раў по́ўны чыгу́н бу́льбы, вы́сыплю на стол, дзе́ці мака́лі і́мі ў масьлёнкі і е́лі. *Бяс.*

МАСЛІНО′К (масьліно́к) *мужч.* Баціставая хустка. Уну́чка прыве́зла мне масьліно́к і я яго адра́зу завяза́ла на галаву́. *Р. Ч.*

МАТА́НУ′ЦЬ (матану́ць), -у, -еш; *зак. тр.* Махнуць. Матану́ў конь хвасто́м чуць ні па вача́х. *Ліс.*

МА′ТКА (ма́тка) *жан.* Ласкавы зварот да жанчыны. У нас гаспада́р ласка́вы, да ўсіх жанчы́н зьвярта́ецца: «ма́тка ты мая́». *Кузьм.*

МАТУ′З (матуз) *мужч.* Вузкі доўгі кавалачак матэрыі, падобны на вяроўку. Дай матуза́ яко́га завяза́ць мех. *Цяр.*

МАТУ′ЛЯ (матуля) *жан.* Хрышчоная маці. Трэба было́ б да матулі́ схадзіць, а да браце́ньніка ўжо за́ўтра. *Суд.*

МАХЛЯ′Р (махля́р) *мужч., неадабр.* Ілгун. Ня слу́хай гэ́тага махляра́, ён дахале́ры нагавары́ць мо́жа. *Суд.*

МАХРА′Ч (махра́ч) *мужч.* Кавалак саматканага палатна з махрамі, заплеценымі ў косы. Як махрачо́м сьцебану́ ко́лькі разо́ў — тады́ слу́хаецца. *Мац.*

МАЦАВА′ЦЬ (мацава́ць), -ц-ую, -еш; *незак. тр.* Пагражаць. У той ха́це так мацава́ў мне ўчора́. *Кузьм.*

МАЦЁ′РАЗНА (мацёразна) *прысл.* Вельмі моцна. Трыма́ў ён так мацёразна, што вы́рвацца ні было як. *Кам.*

МАЧ (мач) *мужч.* Сахор. У суседзяў мач вазялі́, бо свайго́ ня ма́ем. *Кузьм.*

МАЧУ́ЛА (мачу́ла) *жан.* Загніўшая сажалка. Ту́хлае пав'е́тра? Гэ́та ад мачу́лы так нясе́, яна недале́ка. *Дубр.*

МІ́ЗЯНКА (мізянка) *жан.* Морква. У нас усе́ дзе́ці ве́льмі мізянку лю́бяць. *Мал.*

МІРГАВА́ЦЬ (міргава́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Меркаваць. Я ш кажу́, сынок, што́ тр'э́ба міргава́ць, каму́ мо́жна гро́шы пазыча́ць, а каму́ і ні ва́рта. *Цял.*

МІТНУ́ЦЦА (мітну́цца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Прамільгнуць. Мітну́ўся як пу́ля і лаві́ яго. *Ліс.*

МЕ́ЛЬНІК (ме́льнік) *мужч.* Млынар. Ня вязі́ муку́ ў млын, ме́льніка на машы́не не́дзе павязьлі́ ў го́рат. *Р. Ч.*

МЛЕ́ЧНІЦА (мле́чніца) *жан.* Пасудзіна накшталт шафы, у якой захоўваецца малако. За́рас з мле́чніцы прынясу́ малака́. *Кам.*

МЛІН (млін) *мужч.* Блін. Мама́ ўме́е мліны́ пячы́ ве́льмі сма́чныя, а я яшчэ́ не навучы́лася. *Аз.*

МНОЖ (мнош) *зборн.* Мноства. Той гот у нас така́я мнош я́блыкаў была́. *Кам.*

МОСТ (мост) *мужч.* Падлога. У нас на кварці́ры ста-я́ў до́ктар, бы́ў дужа краси́вы, малады́, дове́рлівы такі́. Як пры́дзем да яго́ мост мыць, дык ён заўсягда́ дасьць што-не́будзь: ці канхве́ту, ці кансе́рвіну. *Белар.*

МУКАМО́ЛЬНЯ (мукамо́льня) *жан.* Млын. Гэ́ты ячмень і пшані́цу завязі́ на мукамо́льню, перапусьці́ праз жо̀рны. *Меж.*

МУ́МРЫЦЬ (му́мрыць), -у, -ыш; *незак. тр.* Есці. Дарма́ што маленькі, а му́мрыць за траіх. *Раўч.*

МУ́РЫН (му́рын) *мужч., неадабр.* Маўклівы чалавек. Ой, му́рын, ма́ўчы́ць, надзе́ўся і сядзіць. *Р. П.*

МУ́РЗАЦЦА (му́рзацца) *незак. тр.* Абвалакацца хмарамі. Ніба зноў му́рзаецца. *Кам.*

МЫ́ЛІЦЦА (мы́ліцца), -ю-ся, -іш-ся; *незак. тр.* Гаварыць многа і няпраўду. Перста́нь ты ўжо мы́ліцца, ле́пей вазьмі́ вунь дзяркач ды сьце́ны абатры́. *Зап.*

МЭ́НЧЫЦЦА (мэ́нчыцца), -у-ся, -ыш-ся; *незак. тр.* Мучыцца. Час мэ́нчыўся каля ме́ха, чуць завяза́ў. *Ліс.*

П

ПАВАДЗЭ′НЕ (павадзэ́не) *ніяк.* Прывілеі. Цяпе́р на́шым жанчы́нам павадзэ́не, што каб маёй жонцы тако́е, дык сто гадо́ў жыла п. Радзі́ла — й дня німа́ як паляжа́ць, бо ні́ва ш стаіць. А цяпе́рака паку́ль радзіць, два ме́сяцы аддыха́е, і пасля́ ро́даў два. Мая гэ́тага не ве́дала. *Бяс.*

ПАДБАРО′ДАВІЧ (падбаро́давіч) *мужч.* Падбародак. У майго́ дзя́цькі губа́ ве́рхняя была́ така́я раздво́еная, бы ў за́йца, і падбаро́давіч о такі. *Бяс.*

ПАДГАЛО′СКА (падгало́ска) *жан.* Пагалоска. Пачу́лі падгало́ску і разьнесли па людзе́х. *Вішн.*

ПАДЖЫЛЫ′ (паджылы́) *прым.* Стараваты. Купі́лі мы ха́тку паджы́лаю, тро́шкі падрамантава́лі ды й жывём. *Бяс.*

ПАД ІХ. Да іх. Пад іх лес бліжэ́й, чым пад нас. *Кам.*

ПАКЕ′ПЛІВАЦЬ (пакіпліваць), -ю, -еш; *незак. тр.* Насміхацца. З цёмнага чалаве́ка заўсёды пакіпліваюць. *Цял.*

ПА′ДКІ (па́ткі) *прым.* Схільны да чаго-небудзь, ласы на што-небудзь. Ого! Ён ве́льмі па́ткі да чужо́га, а кап свайго́ чаго́ аддаць... *Прудз.*

ПАДЛІ′ЖНІЦА (падлі́жніца) *жан.* Падліза. Яна к ко́жнаму падлі́жніца і вы́прасіць, што ёй трэба. *Бяс.*

ПАДЛО′ГА (падло́га) *жан.* Стажар'е, памост пад стог. Мой суго́ньня падло́гу пад сто́гам па Падлу́жжы раскі́даў, дык каза́ў, сто мышэ́й на ві́лы ўспаро́ў. *Януш.*

ПАДЛО′ЖЫНА (падло́жына) *жан.* Адна дошка ў падлозе. Згніла́ адна́ падло́жына ля падму́рка, бо ве́льма сы́ра было́. *Кук.*

ПАДНЯБЕ′ННЕ (паднябе́ньне) *ніяк.* Верхняя частка печы. І ха́та стара́я, і печ ужо развáльваецца, усё паднябе́ньне вы́сыпалася. Як зіму́ зімава́ць бу́ду, дык і ня ве́даю. *Бяс.*

ПАДО́ЛАК (падо́лак) *мужч.* Падол. Увесь падо́лак змок, пакуль дабіра́лася. *Суд.*

ПАДСУ́МНІК (патсу́мнік) *мужч.* Сумка для ключоў веласіпеда. Палажы́ ключы́ ў патсу́мнік. *Р. Г.*

ПАДУЖА́ЦЬ (падужа́ць), -ю, -еш; *зак. тр.* Паправіцца. Я ду́мала, вясно́й падужа́ю. *Кам.*

ПАДХАПІ́ЦЦА (патхапіцца) *зак. тр.* З'явіцца. Падхапілася хма́рка, а ў мяне́ се́на яшчэ́ с по́ля ні зьве́зяна. *Сак.*

ПАД'ЯЛДЫ́КНУЦЬ (пад'ялды́кнуць), -у, -еш; *зак. тр.* 1. Падкалупіць. То́лькі і глядзіш, кап каго́ пад'ялды́кнуць. *Бр.* 2. Падкусіць. Пад'ялды́кнулі лю́дзі, а ты і пове́рыў. *Чар.*

ПАЗАЎЧО́РЫХ (пазаўчо́рых) *прысл.* Пазаўчора. Маладзе́ц, Фе́дзя, што нам пазаўчо́рых памо́х дро́вы разгрузіць. *Баг.*

ПАЗЫ́ҚАЦЦА (пазы́кацца) *зак. тр.* Загізаваць. Адабра́ў пан цялу́шку ў дзе́да і пасе́ць са сваёй скаці́най. А гэ́та было́ ле́там. А гэ́тыя каро́вы як пазы́каліся, гэ́та цялу́шка адра́зу да дзе́да на двор і прывіла́ па́нскія каро́вы дзе́ду на двор. А дзет тады́ іх запе́р. *Луб.*

ПАДВАЗО́ННІК (падвазо́ньнік) *мужч.* Вазонніца. Пасадзі́ вазо́н у падвазо́ньнік. *С. Д.*

ПАЖА́ЛАСНА (пажа́ласна). Ҡалі ласка. Зайдзіце, пажа́ласна, да мяне́. *Калод.*

ПАҚ (пак) *мужч.* Скрыня, у якую ссыпаюць зерне. Пак ужо спаражні́ць тро́ба ды вы́несці пасушы́ць. *Сл.*

ПАҚВЭ́ҐАЦЬ (паквэ́гаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Пайсці вельмі павольна. Міну́тку аддыхну́ла, ды й памале́ньку паквэ́гала. *Бяс.*

ПАЛ (пал) *мужч.* Тэмпература. Такі́ пал падня́ўся ў мало́га, дро́ньчыцца, пры́дзіцца, віда́ць, ве́сьці ў бальні́цу. *Заб.*

ПАЛАВІ́ЧКІ (палаві́чкі) *толькі мн.* Разрэзаная папалам і звараная бульба (у мундзірах). Та́та, ідзі́ е́сьці! Ма́ці ўжо палаві́чкі адвярну́ла, вы́сыпала ў мі́ску. *Мет.*

ПАЛА́ТАЦЦА (пала́тацца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Пажывіцца. Пала́тацца ля іх мо́жна, то́лькі не зява́й. *Чар.*

ПАЛА́ТКІ (пала́ткі) *толькі мн.* Вяроўкі, на якіх носяць сена, салому і інш. Вазьмі́ пала́ткі, ды пайдзе́м прынясе́м се́на каро́ві. *Кам.*

ПАЛА́ПІЦЦА (пала́піцца) *зак. тр.* Паласавацца. Вот пала́піўся кот каўба́самі, с су́мкі ў сусе́ткі сьцягну́ў. *Р. Г.*

ПАЛАСЯ́СТАЯ (палася́стая) *прым.* Паласатая. Вой, не́йкая ры́ба палася́стая се́ньня ў магазіне, ка́жуць на́дта сма́чная. *Бяс.*

ПАЛАЎНІ́К (палаўні́к) *мужч.* Палавік. Даўне́й палаўні́кі ва ўсіх саматка́ныя былі́, а за́раз ва ўсіх купле́ныя, бо малады́я ўжо і ткаць не ўме́юць. *Р. Ч.* Самаробны палавік. Мы ўсе палаўні́кі тка́лі, кап прыгажэ́й было́, а цяпе́р купля́юць. *Р. Ч.*

ПАЛАЦЯ́ННЫ (палаця́нны), *прым.* Палатняны. А наўле́чкі былі́ ўсе с уста́ўкамі, пра́ўда, палаця́нныя былі ўста́ўкі, але вы́бялім, пакача́ім на ра́се, бе́лыя-бе́лыя ро́бяцца. *Фал.*

ПАЛГА́Н (палга́н) *мужч.* Сякач. Я стара́, мае дзе́тачкі, ця́гаю бу́льбу сь пе́чы, а пато́м яе на́да вы́вернуць, пасячы́, а палга́н ця́шкі, рукі адрыва́е. *Цял.*

ПАЛЕ́ДЗЕЦЬ (пале́дзець), -у, -іш; *зак. тр.* Паглядзець. Саро́ка пале́дзяла і пале́цяла. *Дукор.*

ПАЛЕ́ЦЕЦЬ (пале́цець), -ч-у, -іш; *зак. тр.* Паляцець. Самале́т пале́ціў, памаха́й ру́чкай. *Кл.*

ПАЛІ́ЧКА (пале́чка) *жан.* Вісячы шкафчык. Ло́шкі і ме́іскі мы заўсе́ды склада́ем у пале́чку. *Р. Ч.*

ПАМЯЛО́′ (памяло́) *ніяк.* Венік. Вунь стаіць памяло́ ў куце́, дык ім мяці́ падло́гу. *Чар.*

ПАКА́МІСЬ (пака́місь) *прысл.* Пакуль. Пака́місь я тут з ва́мі стае́ў, мо́жа ўжо суп зварыўся. *Кам.*

ПАЛАТНЯ́НКА (палатня́нка) *жан.* Калыска, завешаная палатном. Мае дзе́ці ўсе ў гэ́тай палатня́нцы спа́лі. *Борк.*

ПАЛУ′КІШАК (палу́кішак) *мужч.* Плеценая павозка. Сядзе́ў я ў палу́кішку, сядзе́ў і засну́ў, ледзь не зваліўся. *Гіл.*

ПАЛЯ′НУЦЬ (паля́нуць), -у, -еш; *зак. тр.* Паглядзець. Паля́нь, як хо́раша навокал, а ты ўсё ў ха́це ды ў ха́це. *Вішн.*

ПА-МАЕ′МУ (па-маему́) *прысл.* Па-мойму. Цяпе́р не глядзя́ць на чужы́ савет, што сва́е мазгі зробяць, так і до́бра. Ні па-маему́ заму́жжа, ні нара́віцца мне — й гаварыць ні хачу́. Пра́ўда. *Паг.*

ПАМАГА′ЧКА (памага́чка) *жан.* Памочніца. До́бра табе́ жыве́цца, Ма́нька, як у цябе́ памага́чка ёсьць. По́йдзіш на рабо́ту, а яна́ ўсё і зро́бя па хазя́йству: каро́ву падо́іць, сьвіне́й нако́рмя. *Бяс.*

ПАМАЎЗА′ *агульн.* Чалавек, які любіць залезці куды не трэба. Нідзе́ ад гэ́тай памаўзы́ не схава́ешся. *Цяр.*

ПАМАЦНІ′К (памацні́к) *мужч.* Памочнік. Да мяне́ памацнікоў з го́рада прые́хала, а рабіць ня ўме́юць. *Гіл.*

ПАМО′СТ (памо́ст) *мужч.* Падлога. Як пакра́сіў сын памо́ст, то намно́га ляхчэ́й мыць ста́ла. *Кук.*

ПАМЫ′Е (памы́е) *ніяк., толькі адз.* Памаўзлівы чалавек. Купі́ла я варэ́ньня, паста́віла ў шка́фчык. Ду́маю, зьем по́сьле. Наза́ўтра аткрыва́ю — нямá. От памы́е та́я Ра́я, пала́зіла дзе не трэ́ба. *Р. Ч.*

ПАНАВА′ЦЬ (панава́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Добра жыць. По́йдзем у лес, набяро́м харчо́ўкі ды бу́дзям панава́ць дзён тры. *В. В.*

ПА-НАД (па-нат) *прын.* Каля. Мы ляжа́лі па-над Дзвіно́ю, ажыда́лі кама́нды. *Кам.*

ПАВЭ′ДЛУГ (павэ́длух) *прысл.* У параўнанні. Цяпе́р павэ́длух даўне́йшага, дык куды́ ле́пей ста́ла жыць. *Кухц.*

ПАГО′Н (пагóн) *мужч.* Паша. Ра́ніцай каро́ў выганяюць на пагóн. *В. В.*

ПАГРАБНЯ′ (паграбня́) *жан.* Пабудова. Трэ́ба іці бу́льбу на паграбню́ з гаро́да прынесьці. *Цял.*

ПАДА'ЦЦА (пада́цца) *зак. тр.* Здацца. Ні зна́ю, ці гэ́та мне падало́ся, ці пра́ўда бы́ло, але і цяпе́р у ваччу́ стаіць. *Сак.*

ПАДБЕ'Л (падбе́л) *мужч.* Лякарства. Каб зажыла́ ра́на скарэ́й, трэ́ба падбе́лам пацярці. *Р. Ч.*

ПАВАРО'ТКА (паваро́тка) *жан.* Паварот. За паваро́ткай ракі шука́й сваіх гусе́й. *Чыж.*

ПАВЕ'СМА (паве́сма) *жан.* Дзесяць ручэек змятага лёну, дзесяць раз па шэсць жменек. Гэ́тыя вы́чышчаныя жме́нькі скла́дваім жме́нька да жме́нькі, шэсьць жме́няк — гэ́та ручэ́йка, і гэ́тых дзе́сяць ручэ́ек — гэ́та бу́дзе паве́сма, мы зва́лі паве́сма. *Пап.*

ПАБРЫ'НДАЦЬ (пабры́ндаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Пабадзяцца. Пабры́ндаў зве́чара па дзярэ́ўні і звалі́ўся спаць. *Ліс.*

ПАБЛАКА'ТА (паблака́та) *жан.* Блакада. Мой чалаве́к у Ленінгра́дзе ў паблака́це быў. *Кунц.*

ПАБО'ЎТАЦЬ (пабо́ўтаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Папаласкаць. Мае няве́сткі за́раз ня́ма́шака до́ма, пайшла́ на рэ́чку пабаўта́ць бялі́зну. *Р. Ч.*

ПАБА'ВІЦЦА (пабава́віцца), -ўл-ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Пастаяць, пагаварыць. Пабаўцяся з на́мі, у вас жа ча́су хвата́я. *В. В.*

ПАЛЕ'ГЛІЦА (пале́гліца) *жан.* Палеглая трава, збажына. Трэ́ба касу́ накляпа́ць, брыгадзі́р сказа́ў, каб я скасі́ў пале́гліцу ў Во́ўчым бало́ццы. *Бяс.*

ПАНІ'ЦЕЦЬ (паніцець) *зак. тр.* Зрабіцца тонкім. Бу́льба зусім бяс со́нца ў цяні паніцела. *Гіл.*

ПАНЦАКО'ВЫ (панцако́вы) *прым.* Пярловы. На абет мы ча́ста ва́рым панцако́вы суп. *Кам.*

ПА'ПЕЛЬНІК (па́пельнік) *мужч.* Фартух, вытканы з палатна. Па́пельнік і трапкачы́ вы́мыла, на плот павесі́ла. *Ар.*

ПАПЛАВЕ'Ц (паплаве́ц) *мужч.* Поплаў. Се́ньня се́на мы грэ́блі на паплаўцы́. *Кам.*

ПАРТКЕ' (партке́) *толькі мн.* Штаны. У нас на ве́с-

ці пабудава́лі камбіна́т бы́та, у які́м шы́юць партке́. *Чар.*

ПАРО́ЖНІ (паро́жні) *прым.* Не засланы. Телівізар трэ́ба накрыва́ць, а стол трэ́ба каб быў паро́жні. *Чар.*

ПАРО́НКІ (паро́нкі) *толькі мн.* Дробная бульба. У мяні́ карто́шка вы́шла бо́льша, дык я паро́нкі сьві́ньням вару́. Яны́ хоць і не спо́рны, але ш трэ́ба што вары́ць. *Р. Ч.*

ПАРЫ́ЛАЎКА (пары́лаўка) *жан.* Парыльня. А Зю́ня гэ́так до́ўга была́ ў гэ́тай пары́лаўцы, што як вы́шла с пары́лаўкі, дава́й млець. «Вой, ка́жа, нідо́бра, вой, нідо́бра, імчы́ ты мне чаго́, яко́й вады́». *Сів.*

ПАРЭ́НЖЫ (парэ́нжы) *толькі мн.* Парэнчы. Гляджі́, сы́нка, трыма́йся за парэ́нжы, а то кла́тка калы́шацца. *Р. Ч.*

ПАСА́ЖНЫ БЫЧО́К. Бычок, якога даюць на пасаг. Даў мне ба́цька бычка́ паса́жнага і вало́ку зямлі́. *Кам.*

ПАСКУ́ПВАЦЬ (паску́пуваць), -ю, -еш; *зак. тр.* Памыць, пакупаць. Загна́ў у рэ́ку ды паску́пуваў усіх дзяцёй. *В. В.*

ПАСО́БІЦЬ (пасо́біць), -б-лю, -іш; *зак. тр.* Дапамагчы. Хадзі́, Га́нька, пасо́б мне гэ́та се́на перане́сьці. *Бяс.*

ПАСПЫТА́ЦЬ (лён), -ю, -еш; *зак. тр.* Праверыць, ці вылежаўся лён. Паспыта́ць лён мы давяра́лі то́лькі Тамашу́. *Войр.*

ПАСТАЯ́ЛКА (пастая́лка) *жан.* Вяршок. Пастая́лку ма́ці вунь у той збан зьліва́е. *Бар.*

ПАСТРО́ІЦЬ (пастро́іць), -е, -іш; *незак. тр.* Падрыхтаваць есці. Уста́ла ра́на, пастро́іла е́сьці, усіх пабудзі́ла. *Акал.*

ПАСТРЭ́НЧЫЦЬ (пастрэ́нчыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Параіць. До́бра, што Са́ша пастрэ́нчыў абагна́ць карто́шкі, дык я і абагна́ла. *В. В.*

ПАСУ́ДАК (пасу́дак) *мужч.* Пасуда. Па хазя́йству чуць спраўля́юся — стара́я. Во ўну́чка мала́я, зна́іця, мне

памага́я рабі́ць што. І пол мяце́, і пасу́дак мы́я, і карва́ць ма́мчыну засьціла́я. *Белар.* Трэ́ба пасу́дак мыць, а то му́хі. *Там жа.*

ПАСЦЕ́ЛЬ (пасьце́ль) *жан.* Рад снапоў, пакладзеных на ток для маладзьбы. Шы́рай, шы́рай ро́бце пасьце́ль. *Чыж.*

ПА́СЫНАК (па́сынак) *мужч.* Бетонны слуп, які стаіць каля драўлянага электрычнага слупа. Ля гэ́тага сталба́ па́сынак разьбі́ўся. *Кам.*

ПАТАРГА́НЕЦ (патарга́нец) *мужч.* Рэмень. Супако́йся, бо за́раз дам патарга́нца. *Уж.*

ПАТАЛЬМА́ХА (патальма́ха) *жан.* Яечня. На сьне́даньне была́ патальма́ха с са́лам і ква́ва. *Уж.*

ПАТАПЦЫ́ (патапцы́) *толькі мн.* Страва з малака і кавалачкаў хлеба. Глядзі́, як з апеты́там дзе́ці патапцы́ ядзю́ць. *Кузьм.*

ПАТО́М *прысл.* Пасля. Кро́сны залива́ім ва́рам, а пато́м кладзе́м у сту́пу і таўчо́м. *Рат.*

ПАТРА́ВА (патра́ва) *жан.* Знішчэнне пасеваў. Ну й патра́вы ко́ні нарабі́лі. *Уж.*

ПАТРА́ЎКА (патра́ўка) *жан.* На кураціне з прыпрамі гатуюць адвар, перад падачай яго падкалочваюць муко́й. Засе́кла я ку́рку і наварыла патра́ўкі. Тры дні варыла патра́ўку с той ку́ркай. *Мал.*

ПАЎБРЫ́КУТАМ (паўбры́кутам) *прысл.* Галопам. Дзе́ці ўцяка́лі, калі́ ба́чылі, што каро́ва бе́гла с по́ля паўбры́кутам. *Р. П.*

ПАЎДЫВА́НІК (паўдыва́нік) *мужч.* Невялікі дыван на сцяне. Паўдыва́нік у мяне́ ўжо ве́льмі я́ркі, хаце́ла другі́ купі́ць, ды нямá. *Аз.*

ПАЎПА́ЛЬТАК (паўпа́льтак) *мужч.* Жаночае плюшавае паўпаліто. Я ма́ці паўпа́льтак купі́ла а ба́цьку яшчэ трэ́ба футэ́рак ку́піць. *Борк.*

ПАХО́НЦЫ *толькі мн.* Духмяныя прыправы. У мяне́ шмат пахо́нцаў, буду кіда́ць у ва́рыва, кап па́хла. *Кам.*

ПАЦУРБА́ЛКІ *толькі мн.* 1. Адыходы ад раслін.

Назьбірай якіх пацурба́лкаў з бура́чніку і дай каро́ве. *Рат.* 2. Галлё дрэ́ў. Вазьмі́ ўкі́нь у печ асі́навых пацурба́лкаў. *В. В.*

ПАЧЫКІЛЯ́ЦЬ (пачыкіля́ць), -ю, -еш; *зак. тр.* Пайсці кульгаючы. Трэ́ба па́йсці гля́нуць, хто там пачыкіля́ў к нам на двор. *В. В.*

ПАЧЫНА́ЛЬНІК (пачына́льнік) *мужч.* Запявала. Мары́ля ў нас пачына́льнік, яна заўсе́ды пачына́е пе́сьню. *Р. Ч.*

ПАЦЫ́РКАЦЬ (пацы́ркаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Падаі́ць. Трэ́ба пацы́ркаць каро́ву. *Кам.*

ПАЦЯРО́Б (пацяро́п) *мужч.* Палянка ў лесе, на якой засталіся яшчэ пні. Схадзі́це пазагара́ць на пацяро́п, там со́нца мно́га, бо ве́дама — ніштó не засланя́е, адны́ то́лькі пні там і мале́нькія ку́сьцікі. *Р. Ч.*

ПАЦЯРО́БКІ (пацяро́пкі) *толькі мн.* Лупіны. Трэ́ба суссе́тцы пацяро́пкі аднесьці, бо нема́шака ў мяне́ каро́вы, а ў яе есь. *Р. Ч.*

ПАШАХО́НЦЫ *адз.* пашахонец. Свавольнікі. Пашахо́нцы вы, перста́ньце свабо́льнічаць. *В. В.*

ПА́СТЫР (па́стыр) *мужч.* Пастух. Раска́зваюць, у ва́дным ме́йсьця быў бе́дный Васі́ль. Ён ганя́ў на па́сту ўсё ўрэ́мя, як сказа́ць, па-старо́му, быў па́стыр. Па́стыр быў дзераве́нскі і меў усяго́ казу́ с казьля́тамі і ку́рыцу сь ціпля́тамі. От як жыў. *Мік.*

ПЕ́ЛЬКА (пе́лька) *жан.* Палонка. Сяджу́ е́та я рас, чую крык дзіця́чы, я бягом туды, а там дзе́ці ўжо бе́гаюць і с пе́лькі рукі ба́чу. Е́то ш там Мі́шка, ака́зваіцца, быў. *Р. Ч.*

ПЕРАБІРА́НІК (перабіра́нік) *мужч.* Посцілка, тканая ў перабор. Мне нара́вяцца пірабіра́нікі. На́ша Стэ́фка ма́іць іх наткáўшы, вазі́ла ў Масквý на вы́стаўку аш. *Фал.*

ПЕРАБІ́ЎКА (перабіўка) *жан.* Перагародка. Ха́та як каза́рма ўсё ро́ўна, бесталко́вая, перабіўкі не́ту. Кап пе-

рабіў, быў бы толк, а бес перабіўкі парáтку нямá. *Белар.*

ПЕРАБЫЛО́СЯ (перабылóся) *зак. тр.* Перажылося. Ды нéяк перабылóся ўсё гóра. *Руб.*

ПЕРАГАВАРЫ́ЦЦА (перагаварыцца), -у-ся, -ыш-ся; *зак. тр.* Дамовіцца. Усё бýдзя добра, мы перагаварыліся, дзе сустрэ́цца. *В. В.*

ПЕРАДО́К (перадóк) *мужч.* Невялíкая лаўка. Сядзь на перадóк, аддыхні трóхі. *Чар.*

ПЕРАДО́ЎКА (перадóўка) *жан.* Вярóўка, якая перавязваецца паміж аглоблямі. Крэ́пка перадóўку зацягні, а то не давязéм. *Р. Ч.*

ПЕРАКАБУРНУ́ЦЦА (перакабурнýцца) *зак. тр.* Перакруціцца. Хвéдзя быў учóра ў пóлі, казáў, бáчыў самалёт ляцéў, ляцéў прáма, тады́ як перакабурнéцца! От іньцярэ́сна, што б то магло́ быць. *Белар.*

ПЕРАКАВЕ́Ц (перакавéц) *мужч.* Папярочная баразна. На перакаўцáх мы бýльбы не сáдім. *Кук.*

ПЕРАСТРУГА́ЦЬ (перастругáць), -ж-у, -ж-эш; *зак. тр.* Перачысціць. Калí было́ ў мяне́ на кварцíры шасьцёх хлóпцаў, дык кóжны дзень кош бýльбы перастружý, каб накармíць іх. *Кам.*

ПЕРАТО́ЧА (ператóча) *ніяк.* Месца ў хляве ля самых дзвярэй, не занятае загарадкаю. На пяратóчы цяпéр грáска, і я лéдзьві ні пагубля́ла галóшаў. *Кам.*

ПЕРАХО́ДАМ (перахóдам) *прысл.* Часова наведваюца куды пры пераходзе, пераездзе. Нéмцы ў нас былі перахóдам, а стаяць не стаялі. Блакáдай тóлькі навéдваліся, бо у нас парцізáнская зóна лічы́лася. *Белар.*

ПЕРАЦЯ́ЦЬ (перацяць), -н-у, -н-еш; *зак. тр.* Перакусіць. Я ўжо зубáмі нítку перацяў. *Уж.*

ПЕ́РУН (пéрун) *мужч.* Пярун. Нядáўна грымéла, грымéла, пéрун як доў у бярóзу, дык мы з лáўкі ўтрóх паськíдываліся. *Р. Ч.*

ПЕ́РЦІ (пéрці), -у, -эш; *незак. тр.* Шпарка бегчы. Куды ты так прэш, што аш пот сь цябé кáпае? *Кам.*

ПІЛІСКА́ЦЬ (пілісκáць), -ю, -еш; *незак. тр.* Пала-

скаць. Вада хлескае па берагу, калі піліскáеш бялізну, стоячы на кладцы. *Бяс.*

ПІЛІ′КАЦЬ (пілíкаць), -ю, -еш; *незак. тр.* 1. Граць. Мой чалавéк нéкалі пілíкаў на гармóніку. *В. В.* 2. Гаварыць. Пілíкае нéшта сабé пад нос. *В. В.*

ПІ′ЛЬНЯ (пíльня) *жан.* Лесапілка. Як будавáлі нóвую хáту, то мой Іван прывёз дóшак с пíльні. *Р. П.*

ПІ′МЫ (пíмы). Валёнкі. Зімá скóра. Дзéцям купíць трэ́ба і пальтó зімóвае, і шáпкі, і пíмы. *Р. П.*

ПІРУКА′РНЯ (піруκáрня) *жан.* Цырульня. Нáша вёска дабравáта: магазíн, піруκáрня есь, шкóла есь — усё што трэ́ба. *Р. П.*

ПІХТ (піхт) *мужч.* Піхта. Мы стаялі сóрак кілóметраў ад гóрада Іркýцка, ні знáю, як ён цяпéр завéцца, нáтта мнóга кéдра і пíхта. Зімóю яны ў ігóлкі аддзявáюцца, а так уródзе сухí лес. А калю́чкі мя́ккія, зялёна-сівавáценькія. *Белар.*

ПІЦАВА′ЦЬ (піцавáць), -ю, -еш; *незак. тр.* Працаваць. Калі ка мне дзéці прыéдуць, то ні мінýтачкі не пасядзя́ць. Усё піцýюць і піцýюць па хазя́йству, хóчуць, каб мне ляхчэ́й было́. *Бяс.*

ПІЦО′ГА (піцóга) *мужч.* Пісяг. Зусім нóвы стол, а ўжо стóлькі піцóгаў. *Цяр.*

ПІЯ′ЦЬ (піяць), -я-ю, -я-еш; *незак. тр.* Спяваць. Пэ́ўня, там на лýзе нáшы дзéўкі піялі. *Сак.*

ПЛАМІ′ДНЫ (пламíдны) *прым.* 1. Сквапны. Не буць ты такі пламíдны, пламíдначыць нікóлі да дабрá не давядзé. *Р. Ч.* 2. *Зневаж.* Чалавек, які вельмі многа есць. Цэ́лы дзень есь і ўсё яму мáла, вот ужо пламíдны. *Р. Ч.*

ПЛАТНЯ′К (платня́к) *мужч.* Мажны мужчына. Васíль быў такі харóшы, такі хлóпец быў платня́к, а сухóты ўвабрáлі. *Буз.*

ПЛАЎНІ′К (плаўнíк) *мужч.* Вуда. Куды́ ні зірнéш на ракý, усю́ды сядзя́ць рыбалóвы з плаўнікáмі, бо вéльма дóбра ры́ба лóвіцца ў нас. *Р. Ч.*

ПАТУ′ШНІК (патýшнік) *мужч.* Лодка, выдаўбленая

з дрэва. Мы на патýшніку вóзера пераплывáлі з аднагó на другí бéрах. *Р. Ч.*

ПЛАЦЕ́НАК (плацéнак) *мужч.* Палатно ў чатыры ніжы, і снавалася і ткалася фарбаванымі ніткамі, узор клетачкай. Ткáлі плацéнак. Ахварбýем нíткі, тады́ пáрачка зялéная, пáрачка чырвóная, пáрачка бéлая снуём — і гэ́ткі ўжо пéкны плацéнак вы́ччым на хвальбóны, на плáцьці. Бальшынствó ў два нíты́ крóсны былі. А як гэ́тыя хварбавáныя, плацéнкі гэ́тыя, шта ў клéтачку, шта снаваць і ткаць гэ́тым самым,— гэ́тыя ў чаты́ры нíты́ ткáлі. *Пап.*

ПЛАЦЕ́НКА (плацéнка) *ніяк.* Саматканае палатно. Пакýль с плацéнка сукéнку пашы́лі, а пóтым што кýпім. *Ган.*

ПЛЁТАЧКА (плётачка) *жан.* Сплеценая жгутом аснова, пляцёнка. Гэ́тыя крóсны здóймаіш са сьцяны́, спляцéш у плётачку, бо яны́ зблы́таюцца. Тады́ гэ́ту плётачку ў вар, вар гэ́ты ў нас луг звáўся, а тады́ папя́рыш і сýшыш. *Пап.*

ПЛО́ДНАЯ (плодная) *прым.* У яе было восем трусянят. Во плóдная! *Р. Ч.*

ПЛО́ЙМА (плóйма) *жан.* Мноства. Напладзíлі дзяцéй плóйму, а цяпéр гарýюць. *Уж.*

ПЛЮ́САЎКА (плю́саўка) *жан.* Плюшаўка. Я сваю́ плю́саўку нашу́ толька ў сьвя́та. *Р. Ч.*

ПЛЮ́СКАЎКІ (плю́скаўкі). Канцэлярскія кнопкі. Абóяў самá купíла ў Лагóйску, але забы́ла, што трэ́ба яшчэ́ клей або плю́скаўкі. *Бяс.*

ПЛЮ́ХА (плю́ха) *жан.* Шампіньёны. Плю́хі, калі іх усмáжыш у мáсьле, то вéльмі смáчныя. *Ст.*

ПЛЯТА́ННЕ (плятáньне) *ніяк.* Плот, пераплецены тонкімі пруцікамі. Ня лесь на плятáньне, бо завалíцца яшчэ́ мóжаш. *Р. Ч.*

ПОВШЭ́ХНЫ (повшэ́хны) *прым.* Пачатковы. Кóнчыў повшэ́хную шкóлу і хвáціць зь мянé. *Вішн.*

ПО́ГАЛАСКА (пóгаласка) *жан.* Гл.: падгалóска. Вот

пу́сьцілі по́галаску, што артысты прые́дуць, а яны́ не прые́халі. *Кальч.*

ПО́ДСВІНАК (по́тсьвінак) *мужч.* Падгадаванае, ладнае парася. У вас, ка́жуць, по́тсьвінак купіць мо́жна? *Нар.*

ПО́ДСІТАК (по́тсітак) *мужч.* 1. Частае сіта. Дзе́ці, дзе гэ́та наш по́тсітак, трэ́ба муку́ се́яць, а яго́ няма́ на цьвічку́. *Р. Ч.* 2. Шырокі кош з вяровачкамі, у які набіралася жыта для сяўбы. По́тсіткамі се́ялі жы́та і другое́ зерне. *Р. Ч.*

ПО́ЛАГ (по́лах) *мужч.* 1. Посцілка, у якой насілі траву. Вот каб быў у нас по́лах, то мы змаглі п сваю́ рабо́ту ху́тко зрабіць, а то но́сіш кашо́м — ве́льмі мару́дна. *Р. П.* 2. Мяшок, у якім носяць траву. А по́лах е́ты ўжо саўсім старэ́нькі. *Р. П.*

ПО́МАК (по́мак) *мужч., асудж.* 1. Гультай. Вот по́мак, ляжы́ць і ня павёрнецца, хоць бы па ваду́ схадзіў. *Р. П.* 2. Знесенае вадой бервяно. Хве́дар за дзень вы́лавіў каля дзеся́тка по́макаў. *Чыж.*

ПО́МАЧ (по́мач) *жан.* Дапамога. Табе́ то мая́ по́мач трэ́ба. *Цял.*

ПО́ПЛАЎ *мужч.* Луг. У нас на по́поплаві ўжэ траву́ се́юць. *Кам.*

ПО́ПРАДКІ (по́праткі) *толькі мн.* Зборышча, куды збіраліся дзяўчаты і пралі кудзелю. До́ўня мы зьбіра́ліся на по́праткі ў адну́ ха́ту, пра́лі ўсе ра́зам, шчэ хло́пцы прыхо́дзілі, дык саўсім ве́села было́. *Р. П.*

ПО́СТАСЦЬ (по́стасьць) *жан.* Постаць. Не́калі па́ні гаво́ра, каб займа́лі ву́зенькія по́стасьці, кап чы́ста ўсё жа́лі. *Бяс.*

ПО́ШАЛКА (по́шалка, по́шылка) *жан.* Навалачка. На сьве́жай по́шалцы дык аш спаць ляхчэ́й. *Бом.*

ПО́ЯС (по́яс) *мужч.* Прыстасаванне, якім замацоўваюцца кроквы. Дом ужо́ ху́тка зако́нчаць, бо засталó́ся то́лькі по́яс замацава́ць ды кры́шу накры́ць. *Р. П.*

ПРА́ВІЦЬ (пра́віць), -ўл-ю, -іш; *зак. тр.* Гаварыць,

апавядаць. Мне яшчэ́ та́та пра́віў, што калі́ пара́ за́муж ісьці́, вязу́ць дачку́ на база́р і крыча́ць: «Пасьпе́лая, пасьпе́лая!» Калі ўпадаба́е яе хлапе́ц, дык бярэ́ за́муш. *Мойс.*

ПРАГАВЭ́НДАЦЬ (прагавэ́ндаць), -аю, -еш; *зак. тр, неадабр.* Прагаварыць. Сабра́ліся ды і прагавэ́ндалі цэ́лы час. *Якш.*

ПРАМА́ЗАЦЬ (прама́заць), -у, -аш; *зак. тр.* Прагуляць грошы. Ко́лька ямў ні дава́й гро́шай, усё ро́ўна прама́жа. *В. В.*

ПРУЦІ́НА (пруці́на) *жан.* Прут, жэрдка. По́мню, у анно́й дзярэ́ўні начава́лі за Брэ́стам. Ву́ліца ро́ўная така́я, а пло́ту ня́ма. Ні анно́й пруці́ны нідзе́ нямашака, анны́ ака́цыі. Красіва так. *Белар.*

ПРАРЭ́ЗНІКІ (прарэ́зьнікі). Кеды. А вунь прарэ́зьнікі стаяць, хуччэ́й абува́й. *Р. Ч.*

ПРО́ВАР (про́вар) *мужч.* Бровар. Стары́ ба́яў, даўне́й ту́така про́вар быў, гэ́та зна́чыць вінаку́рны заво́т. *Вішн.*

ПРО́ЛАБКА (пролапка) *жан., перан.* Безнадзейная справа. Сам палес у про́лапку, сам і выбіра́йся. *Ліс.*

ПРО́ЛАМКА (проламка) *жан.* Палонка. Калі ўжо аддасі ёй што, дык як у яку́ю про́ламку, не спагоніш. *Н. К.*

ПРАТАН'ЦЬ (пратану́ць) *зак. тр.* Прапасці. Хай усё тут пратане́, мне ўсё роўна. *Уж.*

ПРО́ША (проша). *Гл.* пажаласна. Про́ша к нам на вячэ́ру, заці́рка ўдалася. *Суд.*

ПРО́ШЛАЯ ХАТА. Суседняя хата. Мо́жа вы, дзе́ткі, схадзілі бы ў про́шлую хату? *Р. Ч.*

ПРЫБАЛО́ТКІ. *адз.* прыбалотка. З'ядобныя грыбы, якія растуць каля балота. Прыбало́ткі — гэ́та грыбы, што расту́ць каля бало́та. Сма́жаныя яны́ на́тта сма́чныя. *В. В.*

ПРЫГРЭ́БКА (прыгрэ́пка) *жан.* Завалінка. Хадзе́м пасядзі́м на со́нейку на прыгрэ́пцы. *Ліс.*

ПРЫГРЭ́БКА (прыгрэ́пка) *жан.* Прыбудова над

пограбам. І мо́ркву, і бура́кі ў прыгро́пку згрузі́лі. *Ліс.*

ПРЫЖДА́ЦЬ (прыжда́ць), -у, -эш; *зак. тр.* Дачака́цца. Тако́га жыцця́ прыжда́лі, што хо́чацца жыць. *Кам.*

ПРЫЖУ́РЫЦЬ (прыжу́рыць) *зак. тр.* Змяніць колер ад агню, але не прагарэць. Прыжу́рала суке́нка на рукаве́, а я і не атчу́ла калі́. *Чыж.*

ПРЫЗЫВА́ЦЬ (прызыва́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Запрашаць. Марыя прызыва́ла мяне́ да сябе́ ў го́сьці. *Кам.*

ПРЫКЛА́ДЗІНА (прыкла́дзіна) *жан.* Мянушка.

— А чаму ягá Абэ́хам звáлі?

— Гэ́та такáя вяскóвая былá мянýшка, прыкла́дзіна. Быў бе́дны саўсі́м, дык на ягá нек лю́дзі бо́лій напада́лі, прыкла́лі гэ́тую мянýшку. *Зал.*

ПРЫЛЕ́ПКА (прыле́пка) *жан.* Прыбудо́ва. Мы за ха́таю прыле́пку будуем, там і спаць бу́дзем. *Стар.*

ПРЫЛО́ЎЧАНЫЯ (прыло́ўчаныя) *дзеепрым.* Прыстасава́ныя. Мы да тако́га жыццяя́ не прыло́ўчаныя. *Мядз.*

ПРЫМА́КА (прыма́ка) *мужч.* Прымак. Ка́цін прыма́ка паéхаў на кані́, му́сіць, па сéна. *Белар.*

ПРЫНО́ЖЫЦЦА (прыно́жыцца), -у-ся, -ыш-ся; *зак. тр.* Стаміцца пасля вялікага пераходу. Ледзь прыйшлі́, зусім прыно́жыліся, скарэ́й бы ўпáсьці на ло́шка. *Граб.*

ПРЫНЦЭ́СА (прынцэ́са) *жан.* Сукенка з шырокімі фальбонамі. Ганýля шыць умéе, дык і пашы́ла прыго́жую прынцэ́су. *Калод.*

ПРЫПУЦІ́ЦЬ (прыпуці́ць), -у, -іш; *зак. тр.* Уладкаваць. Дзéці былі́ малы́я, мéні клóпату было́, а цяпéр вы́расьлі, прыпуці́ць усіх трэ́ба. *Чар.*

ПРЫСІВІ́ЦЬ (прыпуці́ць), -у, -іш; *зак. тр.* Забяліць малаком. Малакá не хапáе, чамý ты так слáба суп прысівíла? *Кам.*

ПРЫ́СМЕРАК (пры́смерак) *мужч.* Змярканне. Як éзьдзіла ў Чэ́рвень, дык шла дамóў пры́сьмеркам, вось было́ страшна. *Р. П.*

ПРЫРУЧЫ́ЦЬ (прыручы́ць), -у, -ыш; *зак. тр.* Даручыць. Хве́дару прыручы́лі калга́сны сат вартава́ць, але ён ні згадзі́ўся. *Кам.*

ПРЫ́РЫЎКАМІ (пры́рыўкамі) *прысл.* Прыхваткамі, час ад часу. Ле́там дак яно вядо́ма, пры́рыўкамі толькі — хо́чацца ш і тра́вы пласт які ўкасіць. *Белар.*

ПРЫСКІ́ПАЦЦА (прыскі́пацца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Прычапіцца. Чаго ты ка мне прыскі́палася? *Чар.*

ПРЫСКРЫ́НАК (прыскры́нак) *мужч.* 1. Шуфляда. Вось у гэ́тым прыскры́нку ляжы́ць усё то́е, што патрэ́бна табе́, і шмі́нка твая́. *Борк.* 2. Адгародка ў скрыні, куды складваюць мяхі. От ідзі́це, я вам пакажу́ прыскры́нак. Тут мяхі́ ляжа́ць. *Р. Ч.*

ПРЫСТА́ВЫ (прыста́вы) *толькі мн.* Вароты. Нашы прыста́вы са скры́пам зачыня́юцца. *Ган.*

ПЫСТО́ІЦЬ (прыстоіць), -ю, -іш; *зак. тр.* Спыніцца на нядоўга. Здае́цца, прыстоіла на мінўтку, а це́мна ста́ла за́раз жа. *Чар.*

ПРЫ́ТКІ (пры́ткі) *прым.* Хуткі. Ну й пры́ткі ш ты, ужо́ і пасвары́цца ўсьпеў. *Кам.*

ПРЫ́ТНА (пры́тна) *прысл.* Старанна. Пасядзе́ла тры дні пры́тна і пасьці́лкі гато́вы. *Ліс.*

ПРЫ́ТЫЧКАМ (пры́тычкам) *прысл.* Вельмі рана, да ўсходу сонца. Гаро́т зусім заро́с, пало́ць нужна́. Я ўну́чцы і гавару́, каб уста́ла ды пры́тычкам і папало́ла, по́куль со́нца не ўзышло́. *Р. Ч.*

ПРЫХАРО́ШАНЫ (прыхаро́шаны) *дзеепрым.* Прыбраны. Маладая была́ прыхаро́шана, аш зіхаціць. *Кам.*

ПРЫЦЫ́ГАНЫ (прыцы́ганы) *прым.* Зусім змораны. Хаце́ла каня́ прасіць, а е́ты конь зусім прыцы́ганы. *Р. Ч.*

ПРЫЦЮ́ХКАЦЦА (прыцю́хкацца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Прывалачыся. Чаго́ ты сюды́ прыцю́хкаўся, што табе́, німа́ чаго́ рабіць? *Кам.*

ПРЫЧАПУ́РЫЦЦА (прычапу́рыцца), -у-ся, -ыш-ся; *зак. тр., неадабр.* Прыбрацца. Чака́й яе, калі́ яна́ прычапу́рыцца, і ў кіно́ спо́зьнімся. *Суц.*

ПРЫЧЫДВО́РЫ (прычыдво́ры) *толькі мн.* Жарты. Ну й здáтны ш чалавéк на прычыдво́ры! *Цял.*

ПСТРО́НГА (пстро́нга) *жан.* Стронга, фарэль. А нáшы вяскóвыя дзéці лéтась нéдзя за Альшэ́вам аглéдзілі малу́ю рэ́чку і хадзі́лі туды́ лавíць пстро́нгу. Нікато́рыя лáднага прынясьлí. *Ст. В.*

ПСТРЫ́КНУЦЬ (пстры́кнуць), -у, -еш; *зак. тр.* Сфатаграфаваць. Сéньня нас Гáля на пáмяць пстры́кнула. *Кам.*

ПУЗЫ́РЫЦЦА (пузы́рыцца), -у-ся, -ыш-ся. Злаваць. Так ужо пузы́рыцца, ло́пня зáрас ад злóсьці. *В. В.*

ПУЛЬГА́ЦЬ (пульга́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Кідаць. Жылі мы ў Германíі каля лáгера ваеннаплéнных. Хацéлася знаць, мо там éсьціка хто з нáшай дзярэ́ўні, і мы пульгáлі туды́ запíскі ў каменчыку церас плот. Так Нáдзя і прапытáла, што ў лáгеры быў яе мужы́к. *Бяс.*

ПУ́ДРАЧКІ (пу́драчкі) *толькі мн.* Каляровыя рамонкі. Цэ́лы гарóт пу́драчак насадзíла. *Кам.*

ПУ́НТАМІ (пу́нтамі) *прысл.* З перапынкам. Ён жа стамíўся, ішоў пу́нтамі, таму так дóўга. *Дзям.*

ПУПО́К (пупóк) *мужч.* Прылада ў касе для трымання яе рукой. За пупóк рукóй касу́ трымаюць. *Р. Ч.*

ПУСКА́ЦЬ (пуска́ць), -ю, -еш; *зак. тр.* Распаўсюджваць. А ён прышóў да нас у вёску і стаў пуска́ць сваю́ агіта́цыю. *В. В.*

ПУСКА́ЦЬ ВАЙНУ́. Пачынаць вайну. Наштó было́ пуска́ць вайну́, сто́лькі го́ра яна прынéсла людзя́м. *Кам.*

ПУСО́ЛЬ (пусóль) *жан.* Фасоль. Сéлета пасадзíла шмат пусóлі. хóпіць на ўсю зіму́. *Кам.*

ПУСТАЛЬГА́ (пустальга́) *агульн., неадабр.* Балбатлівы чалавек. Вот ужэ пустальга́, мéле абы-што, як ёй і язы́к не забалíць. *Бяс.*

ПУ́ТА (пу́та) *ніяк., перан.* Непісьменны чалавек. Чаго́ ты лаб'ешся з гэтым пу́там. *Кам.*

ПУ́ХНУЦЬ (пу́хнуць), -у, -еш; *незак. тр.* Многа спаць. Нічóга не рóбіць, пу́хне цэ́лы дзень. *Кам.*

ПУ'ЦКІ (пу́цкі) *адз.* пуцка. Шчокі. Нама́заў пу́цкі чырво́най фа́рбай і стаіць як дурны́. *Борк.*

ПЫЛЯНЯ'ТКА (пыляня́тка) *ніяк.* Кураня. Ко́лькі пыляня́так у вас вывелася сяго́лета? У мяне́ ш курыца дурна́я, патапта́ла сваё пыляня́ты. *Узгур.*

ПЫ'РСКАЦЬ (пы́рскаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Ціха смяяцца. Ты мне тут не пы́рскай у кула́к, бо я ўсё ро́ўна ба́чу. *Цял.*

ПЫТЛЁ'ЎКА (пытлёўка) *жан.* 1. Працэс, звязаны з ператварэннем зерня ў муку вышэйшага гатунку. І зацягну́лі мы на гэ́ты раз, другі́ дзень пытлёўку зако́нчыць не мо́жам. Пшані́ца, жо́рны і сі́тка ўжо перад вачамі стаяць. *Узгур.* 2. Пытляваная мука. Сі́тніцу пяклі́ не́калі с пытлёўкі. Во сма́чная была́. *Цял.*

ПЫ'ШКІ (пы́шкі). Мёрзлая бульба. Пасьля́ зімы́ адны́ пы́шкі засталі́ся ў зямлі́. Мы іх капа́лі і е́лі. *Кам.*

ПЭ'ЙСЫ (пэ́йсы) *толькі мн.* Доўгія валасы. Хаця п пэ́йсы ў касу́ запляла́. *Р. Ч.*

ПЯКО'ТА (пяко́та) *жан.* Спякота. Сёньня така́я пяко́та, што сьве́ту не ба́чу. *Бяс.*

ПЯЛЁ'ХНУЦЦА (палёхнуцца), -у-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Зваліцца. Ма́лец пя́лёхнуўся с ко́йкі і маўчы́ць. *Кл.*

ПЯНЬКО'ЎКА (пянько́ўка) *жан.* Вялікая хустка сваёй работы, ільняная. Пянько́вак цяпе́р дык і ня но́сяць, а даўне́й ба́бу бе́днай лічы́лі, калі сваёй пянько́ўкі ня ме́ла. *Аўг.*

ПЕРАПАРО'ЦЬ (пярапаро́ць), -у, -аш; *зак. тр.* Перавярнуць. Увесь ку́фар пярапаро́ла, а гэ́тай ху́стачкі так і ні знашла́. *Кам.*

ПЯРВЕ'Й (пярве́й) *прым.* Раней. Пярве́й і жыло́ся па-другому́, не заўсе́ды сыга́н бу́льбы быў на стале́. *Борк.*

ПЯРХА'ЦЬ (пяркаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Кашляць. Пярха́еш як у бочку, то табе купацца халады́мчаю. *Ліс.*

ПЯРЭ'БІРАК (пярэ́бірак) *мужч.* Ахапак сена. Даў пярэ́бірак се́на на про́бу каро́ві. *Кам.*

ПЯРЭ'ДНЯ (пярэ́дня) *жан.* Вяроўка, якой уціскаюць на возе сена, снапы і інш. Падай пярэ́дню, вунь на плоці вісіць. *В. В.*

ПЯЎЧЫ'ЦА (пяўчы́ца) *жан.* Жанчына, што сваімі песнямі славіць маладых на вяселлі. Ста́ршая ва́цьця садзіцца на куце́ с пірагом, а калі пачына́юць пець, зна́чыць, ва́цьця да́рыць пяўчы́цам пірох, гарэ́лку, канхве́ты. *Баг.*

ПЯХО'ТАМ (пяхо́там) *прысл.* Пешшу. Ране́й за 15 вёрст пяхо́там хадзілі, а цяпе́р ша́гу ні про́йдзя, на машы́ну патчэ́піцца. *В. В.*

ПЯЧА'ЙКА (пячáйка) *жан.* Пякота. Не́шта мне ні-до́бра се́ньня: ну́дзіць і пячáйка пячэ́. *Цял.*

ПЯЧКУ'Р (пячку́р) *мужч.* Пячнік. Прышо́ў да нас пячку́р но́вы, адне́куль здале́к, до́брыя пе́чы ро́біць. *В. В.*

Р

РА'БІК (ра́бік) *мужч., лаянк.* Чалавек з рабаціннем на твары. Ён мно́га спо́рваў гняздо́ў ла́стаўчыных, таму́ і рабы́. Усе завуць яго́ ра́бік. *Р. Ч.*

РАГАВІ'К (рагавік) *мужч.* Сала з галавізны. Ка́быць: «Ну чым жа ты цыга́начку надо́рыш?» А мы якра́з кабана́ закало́лі, дак я ду́маю, шко́да, ці што, да гэтыя пашчэ́нкі як абраза́ў, панімáяця, рагавік, гэ́тая са́ла прынёс і кажу́: «На́ табе, цыга́начка, і ідзі». Дак яна́: «Э-э-э, дзя́цька, не, я ні вазьму́, панімáяця, яно́ жы́рная. Да́йця ле́пяй бу́льбы». Ві́дзіш, як зьмяні́лася цяпе́р жыцьцё. Эта ш каб э́та пры По́льшчы я гэ́такі рагавік са́ла цыга́нкі адда́ў! Быць тако́га ні магло́! *Мік.*

РАГАВІ'ЧКА (рагавічка) *жан.* Сурвэтка. Мая́ ма́тка ве́льмі до́бра вышыва́я рагавічку. *В. В.*

РАГА'Ч (рага́ч) *мужч.* Керагаз. Суседка ска́рдзілася, што ў яе дрэ́нны рага́ч, не́льга зварыць па́есьці. *Р. Ч.*

РАГО'ЖА (рагóжа) *жан.* Мачалка. Куды́ ж гэ́та вы ў ба́ню без рагóжы пайшлі? *Борк.*

РАГО́ЖНІК (рагóжнік) *мужч.* Явар. Вось сьвя́та бывáе вясно́й, тады́ рагóжнік расьсьціла́юць у хáце, каб лéпей было́. *Р. Ч.*

РАДАВА́Я РАДЗЮ́ГА. Тканая у рады дзяруга. Радавы́х дзьве то́лькі вы́ткала, бо не патрэ́бна больш. *Кукш.*

РАДЗІ́НЫ (радзíны) *толькі мн.* Хрэсьбіны. Хýтка да цёткі на радзíны паéдзям. *В. В.*

РАДЗЮ́ГА (радзю́га) *жан.* Дзяруга. Ну й наткáла ж я цяпéр радзю́х, усíх дачóк адарý. *В. В.*

РАЗА́НЫ́ (разаны́) *толькі мн.* Абчышчаная бульба. Навары́ла сéньня разаноў, то дóбра наéліся, сáла нажáрыла пóўную скаварадý, макáлі разанáмі і елі. *Бяс.*

РАЗ-ДВА (раз-два) *прысл.* Вельмі хутка. Бяжы́, сынóк, да Сымóніхі і хай раз-два ідýць! *Дзям.*

РАЗБАЗЫ́РЫЦЬ (разбазы́рыць), -ю, -еш; *зак. тр.* Разбэсціцца. Адзін хлóпяц сярóт дзяўчáт, дак так разбазы́рыў, што аш стрáшна. *Цял.*

РАЗА́К (разáк) *мужч.* Асака. Лéтась мы хоць разакý вазы́ два накасíлі. *Кам.*

РАЗБУРЫ́ЦЦА (разбуры́цца), -у-ся, -ыш-ся; *зак. тр.* Абрадзіцца. Вунь Гэ́льчына нявéстка ўжо разбуры́лася, хлóпчык у яе. *Р. Ч.*

РАЗВА́ЖЫЦЬ (развáжыць), -ж-у, -ж-ыш; *зак. тр.* Развесяліць. От бáпка, як пагавары́ла са мнóй, так развáжыла мянé. *Зайцы.*

РАЗГУЛЬТА́ІЦЦА (разгультáіцца), -ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Разленаваццца. Як ён дýмае жыць, зусім разгультáіўся: то́лькі б вы́піць ды паспáць увóлю, а рабóту хто бýдзе рабíць? *Узгур.*

РАЗЕ́ВА (разéва) *жан., зневаж.* Разявака. І што ета за чалавéк, заўсёды спазняецца, куды́ б ён не ішоў, нездармá яго і завýць у вёсцы разéвай. *Р. Ч.*

РАЗІ́НЬКА (разíнька) *агульн., зневаж.* Няспрытны, някемлівы чалавек. Ні дзяўчы́на, а разíнька нéйкая расьцé. *Цяр.*

РАЗІ′НУЦЦА (разі́нуцца), -у-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Падняць крык, лаянку. На ўсё по́ле разі́нулася. *Ліс.*

РАЗЗЯ′ПІЦЬ (разьзя́піць), пл-ю, -іш; *зак. тр.* Разявіць. Разьзя́піць рот і хо́дзіць, мух ло́віць. *Ліс.*

РАЗРАБІ′ЦЦА (разрабі́цца), -ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Распаўнець. Вот Га́нна разрабі́лася, як печ то́ўстая. *Цял.*

РАЗУМО′К (разумо́к) *мужч.* Разумны. Ой, мой ма-ле́нькі разумо́к! *Хож.*

РАКЧЫ′СЯ (ракчы́ся) *незак. тр.* Адракчыся. Ні хо́чаце ракчы́ся дзяцёй, як Іван. *Кам.*

РАМАЦІ′ЗМА (раматы́зма) *жан.* Рэўматызм. Ране́й, дык і я памага́ла дачкі каро́ўку хава́ць, а цяпе́р стара́я, не магу́, раматы́зма ў мяне́ ў нага́х. *Белар.*

РАМІ′ЗНІК (рамі́зьнік) *мужч.* Чалавек, які званіў у час пажару. У нас былі́ такія рамізіі, там было́ прыкрэ́плена жале́за, і ў час пажа́ру рамі́зьнік быў напагато́ве і званіў, будзіў людзе́й на по́мач. *Р. Ч.*

РАНДЭ′ЛЬКА (рандэ́лька) *жан.* Каструлька. Ране́й у гаршчака́х вары́лі е́сьці, а цяпе́р у рандэ́льках. *Уж.*

РАПТУ′Х (раптух) *мужч.* Торба, у якую кладуць сена, калі едуць куды-небудзь. Раптух не забы́ў? Бяры́ мары́нарку ды паехалі. *Борк.*

РАСКІДА′ЦЬ (раскіда́ць), -ю, -еш; *незак. тр., перан.* Раздзяваць. Не раскіда́й яе, бо яна прасту́дзіцца ско́ра. Гэ́та като́ра дзіця́ прывы́кшы, дык яму нічо́га. *Р. Ч.*

РАСКО′Л (раско́л) *мужч., неадабр.* Гарэза. Ну й раско́л расьце́, вунь па лу́жынах шлёпае. *Зап.*

РАСКЯПІ′ЦЬ (раскяпі́ць), -пл-ю, -п-іш; *зак. тр.* Раскалоць, расшчапіць. Раскяпі́ палёна на трэ́скі. *Дук., Чар.*

РАСПАДА′ЦЦА (распада́цца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Разрывацца. Сто́лькі рабо́ты ле́там, што хоць ты распадзі́ся, а ўсю не перарэ́біш. *Кук.*

РАСПАХА′ЦЬ (распаха́ць), -ю, -еш; *зак. тр.* Разарваць. Ён кінуў у мяне́ сьне́гам, дык я яму за гэ́та распаха́ла праро́з у руба́шцы. *Кам.*

РАСПРА′ЖЫЦЦА *зак. тр.* Разварыцца. Та́я бу́льба, што распра́жыцца, ве́льмі сма́чная. *Кам.*

РАСПЫТА′ЦЦА (распыта́цца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Запытаць. «Пайду́ распыта́юся ў яе, ці пра́ўда гэ́та».— «Ну што, распыта́ўся?» *Вішн.*

РАСПЭ′ЙКАЦЬ (распэ́йкаць), -аю, -еш; *зак. тр.* Растраціць. Пайшла́ на база́р і ўсе гро́шы распэ́йкала. *Раўч.*

РАСТУ′ЧЫ (расту́чы) *прым.* Той, хто хутка расце і размнажаецца. А гэ́ны вазо́н мне з Украіны прывязьлі. Ён расту́чы такі. Адрэ́жу флянс с адно́й старане́, глянь, а ён ужо́ з другі́х расьце́. Красіва так цьвіце́. *Бяс.*

РАССАХАВІ′ЛЫ (рассахавілы) *толькі мн.* Драўляныя вілы на два зубы. Я′ська, бяры́ рассахавілы ды йдзём ржы́шча склада́ць. *Заб.*

РАСТО′РКАЦЬ (расто́ркаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Раздаць пакрыху. Расто́ркала ўсё семяно́, а цяпе́р сабе́ нема́. *Чар.*

РАСПУ′СТА (распу́ста) *жан.* Развадная жанчына. Пражыла́ ўвесь век распу́стаю. *Ліс.*

РАСТУ′РКАЦЬ (расту́ркаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Разбудзіць. Як зава́ліцца на се́на, не расту́ркаць. *Ліс.*

РАСХЛЯБА′СТАЦЬ (расхлябастаць), -ю, -еш; *зак. тр.* Разбіць. От дурні́ца, расхлябастала таку́ю міску, і дзе ў цябе́ во́чы былі́. *Бяс.*

РАСХО′ДАЦЬ, -ю, -еш; *зак. тр.* Растраціць. Яна́ дзе́сяць рубле́ў расхо́дала. *Цял.*

РАСХРЫ′СТА (расхры́ста) *агульн., неадабр.* Чалавек, які ходзіць заўсёды ў расшпіленай вопратцы. Зашпілі́ся, расхры́ста ты. *Кам.*

РАСШУМАЦЕ′ЦЬ (рашшумацёць), -ч-у, -іш; *незак. тр.* Разарваць (на кавалкі). Рашшумацёла пісьмо́, а цяпе́р сама шкаду́еш. *Узгур.*

РАСЦЯРО′Б (расьцяро́п) *мужч.* Высечаны ўчастак лесу. На расьцяро́бах цяпе́р пазе́мак мно́га. *Бяс.*

РАЎЗЬНЯ′ (раўзьня́) *агульн.* Плакса. Што з гэ́тай раўзьне́й рабіць, ніяк ні супако́іцца. *Кам.*

РЖО′ННЕ (ржо́ньне) *толькі адз.* Ржышча. Ржо́ньнем етым мо́жна ўсе но́гі скало́ць. *Бяс.*

РО′ДЖАНЫ (ро́джаны) *дзеепрым.* Народжаны. Ро́джаны казяня́ быў зусім мо́кры і мале́нькі-мале́нькі. *Хал.*

РО′ДЗІНА (ро́дзіна) *жан.* Род. Сяга́ньня ў на́шай дзярэ́ўні вясе́льля пачына́ецца. Бярэ́ Максі́маў Ва́ська дзяўчы́ну з до́брай ро́дзіны. *Заб.*

РО′ДНЯ (родня) *жан.* Радня. Ва ўсіх ро́дня не́йкая е, а я адна́. *Кам.*

РО′ІЦЦА (ро́іцца) *незак. тр.* Трызніцца. Ро́ілася пра сы́на ўсю ноч. *Ліс.*

РО′НДАЛЬ (ро́ндаль) *мужч.* Каструля з ручкай. Вазьмі́це, дзе́ці, у мяне́ гэ́ты ро́ндаль. *Кам.*

РО′ЙМА (ро́йма) *жан.* Беспарадак. Што гэ́та за ро́йма ў вас у хаце? *Чар.*

РО′ЧНІК (ро́чнік) *мужч.* Аднагодак. Вось гэ́ты то́фель мой, ро́чнік, ко́лькі я тут жыву. Як прые́хаў у Вялікія Гаяны — і зра́зу паса́дзіў. Ко́лькі я жыву́ тут, сто́лькі ён расьце́ на маёй сядзі́бе. *Белар.*

РО′ШАНЫ (ро́шаны) *дзеепрым.* Вырашаны. Ро́шаны ў цябе́ пры́клады? Тады́ кні́гу прынясу́. *Чыж.*

РУБІ′НКА (рубі́нка) *мужч.* Рубец тканіны. Дошч так намачы́ў, што сухо́й рубі́нкі ні было́. *В. В.*

РУКО′ЎКА (руко́ўка) *жан.* Рукавіца. Мо́ўра, глянь якія́ я табе́ руко́ўкі купі́ў у кра́ме. Цяпе́р тваі́ ру́кі ме́рзнуць не бу́дуць. *Узгур.*

РУ′МЗАЛА (ру́мзала) *агульн., лаянк.* Плакса. Вот ру́мзала гэта, це́лы дзе́нь ру́мзая. *Кам.*

РУНО′ (руно) *ніяк.* Воўна. Зняла́ руно́ с аве́чкі. *Р. Ч.*

РУ′ХНУЦЬ (ру́хнуць) *зак. тр.* Валам паваліць. У нас кусты́, ай-ей, ско́лькі малі́н! Як малі́ны пасьпе́юць, вот тагды́ ру́хнуць у лес і сваі́ і зь Мі́нску! Хто на аўто́бусе, а хто на машыне́ сваёй ка́ціць. Е′дуць і сваі́, і нача́льнікі ўся́кія е́дуць. *Белар.*

РУ′ЦЬВІНА (ру́цьвіна) *жан.* Балота. Ру́цьвіна там страшэ́нная, асьцяро́жна хадзі́. *Гіл.*

РУЧЭ′ЙКА (ручэ́йка) *жан.* Шэсць жмень змятага ў церніцы лёну, ачышчанага ад кастрыцы. Такія дрыўля́ныя мя́ліцы былі́, шыро́кія, і на гэ́тых мя́ліцах мы тром лён, дзіўча́ткі якія там няўме́йкі. А по́сьлі нас ба́бы старэ́йшыя чы́сьцяць на такія мя́ліцы ву́скія. Ужо вы́чысьцяць ягá і вя́жым ягá гэ́дык: гэ́тыя вы́чышчаныя жме́нькі скла́дваім жме́нька да жме́нькі, шэсьць жме́няк — гэ́та ручэ́йка. *Пап.*

РУ′ХАЦЬ (ру́хаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Ісці. Ужо ве́чар, трэ́ба дамо́ў ру́хаць. *Кам.*

РЫЖА′ (рыжа́) *жан.* Іржа. Усё вядро́ рыжа́ пае́ла. Но́вае на́да купіць, ды е́хаць за ім але́ка, ды і няма калі. *Дзям.*

РЫЗІНКА (рызі́нка) *жан. Гл.* адымалка. А мой Ю′зінька як аста́ўся за гаспады́ню, так я во ні магу́ знайсьці́ ні адно́й рызі́нкі. Чым тут вы́цягнуць саганы́ с пе́чы? *Яц.*

РЫ′НКА (ры́нка) *жан.* Міска. Як цябе́ сабіра́ла, ры́нку разьбі́ла і цяпе́р няма́ ў што ўліць булён, хоць ты на скавараду́ лій яго́. *Рудн.*

РЫ′ПАЛКА (ры́палка) *жан.* Дрэнны гармонік. Ры́палка, а не му́зыка, кінь ты ўжо. *Буз.*

РЫ′ШТА (ры́шта) *жан.* Канава. Пераско́чыў ры́шту і пабе́г дале́й, ці ж дагоніш яго? *Масц.*

РЭ′ГУЛ (рэгул) *мужч.* Канец. Ядýць, ядýць і рэ́гулу ім няма́. Трэ́ба які́ рэ́гул мець, а то е́сьці вам ні набра́ца. *Уж.*

РЭДЗЬ (рэць) *жан.* Столка. У мяне пасьці́лка ў дьве рэ́дзі была́. *Р. Ч.*

РЭ′ДКІ (рэ́ткі) *прым.* Рэдкі. Узышло́ жы́та і тако́е рэ́ткое, тако́е рэ́ткое, ну зусім. *Чыж.*

РЭ′ЗАЦЬ (рэ́заць) *незак. тр.* Балець. Так рэ́жа жывот, што спасу німа. *В. В.*

РЭ′ХВА (рэ́хва) *агульн., зневаж.* Дурань. Рэ́хва не́йкі, а ні чалаве́к, кручо́к вы́піў і ўжэ так брыдка вось п'я́ны. *Дзям.*

С

САГАНО́К (саганóк) *мужч.* Чыгунок. Дзе ш той ста́ры́ саганóк дзéўся? Нíма́ ў чым бу́льбы зварыць. *Уж.*

САГЛА́СЬСЕ (сагла́сьсе) *ніяк.* Згода. Маé дзéці ў сагла́сьсе жывýць, гля́нуць хóраша. *В. В.*

САГЛУМІ́ЦЦА (саглумíцца). Сапсавацца. Са́ла занясí ў кадóпчык палажы́, каб ня саглумíлася. *Кухц.*

САГРАБА́ЦЬ (сагрaбáць), -аю, -еш; *незак. тр.* Згрaбаць. У нас перш сéна ў кучы сагрaбáюць, кап затым хучэ́й у стагí ці кóпы кла́сці. *Гíл.*

СА́ДЗІЦЬ (сáдзіць) *незак. тр.* Ідзе (аб вялікім снезе). Ты глядзі, які сáдзіць, страшэ́нна. *Руб.*

САЛАДУ́ХА (саладýха) *жан.* Хлебны квас. Нарабíла саладýхі аж чатыры жбáнкі, дык мéншы і не адахóдзіцца — нáтта ж лю́біць: пабéгае пабéгае і за жбан. *Бяс.*

САЛАМЯ́НКА (саламя́нка) *жан.* Самаробны палавік з нітак і саломы. У іх уся́ хáта ў саламя́нках, бо сама́ ш тчэ. *Мац.*

САЛО́ХА (салóха) *жан., неадабр.* Неахайна апранутая жанчына, дзяўчына. Адна́ дачка́, і та́я салóха нéйкая, нічóга надзéць ня мóжа. *Буз.*

САМ ПРАЗ СЯБЕ. Самастойна. Сам прас сябé навучы́ўся іграць на баяне. *В. В.*

САЎЧУНЫ (саўчунэ́) *адз.* саўчун. Бліны. Я да мачáнкі яшчэ́ саўчунóў напякла́, бýдзем мáзаць. *Кам.*

САРАКІ́ (сарakí) *толькі мн.* Сорак дзён пасля смерці чалавека. Працíўна, калí на сарака́х нап'ю́цца і пяю́ць. *Р. П.*

САРГА́Ч (сарга́ч) *мужч.* Свіное карыта. Я люблю́, каб і ў свінéй было́ чы́ста. Унь і саргачы́ ў мяне́ чы́стыя. Кóжны рас мы́ю, як сьвíньня пад'ядýць. *Р. Ч.*

САЎГА́ЙЛА (саўгáйла) *агульн., зневаж.* Нервовы неспакойны чалавек. Саўгáйла ты, мéсца табé нікóлі ня знóйдзіцца пасядзéць, усё хóдзіш туды-сюды. *Бяс.*

СА'ХАРНІЦА (са́харніца) *жан.* Гарэлка, выгнаная з цукру. Ад гэ́тай са́харніцы зе́льмі галава́ бале́ць. *Бяс.*

СА'ЧАК (са́чак) *мужч.* Жакет. Адзе́нь са́чак і шаты-но́ўку, яна́ табе́ да тва́ру. *Пал.*

СВАДНЯ' (свадня́) *жан., неадабр.* Пляткарка. І што ета за жанчы́на? Усё спле́тні свадня́ разносіць. *Р. Ч.*

СВІСТУ'ЛЬНІКІ (свісту́льнікі) *толькі мн.* Малыя дзеці. Гэ́тыя сьвісту́льнікі то́лькі кру́цяцца пад рука́мі. *Кам.*

СВО'ЙЧЫК (сво́йчык) *мужч.* Трубка палатна. У маé кумы́ яшчэ два сво́йчыкі палатна. *Кам.*

СЕ'РЧЫКІ (се́рчыкі) *толькі мн.* Запалкі. На васімна́сьця капе́як дам сярчыкоў.— Васімна́сьця пу́шак мо́жа я і ў су́мку ні ўлажу́. А мо́жа й зьме́йсьцяцца? *Ст. В.*

СІНЮ'ХА (сіню́ха) *жан.* Грыб-паганка. Нікуды ён не ва́рты, нават у грыба́х не разьбіра́ецца якія до́брыя, сіню́х назьбіра́ў і цешы́цца. *Узгур.*

СІТЦО' (сітцо́) *ніяк.* Сузор'е Дзевы. Наш наста́ўнік гаварыў, што гэ́та відаць на не́бе Сітцо́, а як па-ва́шаму — ня ве́даю. *Бар.*

СІ'ЎЧЫК (сіўчык) *мужч.* Дзірван. Вы́пусьцілі ко́ней на сіўчык, хай тро́ху папа́сьвяцца. *Дубр.*

СКА'ЗУВАЦЬ (ска́зуваць), -ю, -еш; *зак. тр.* Казаць. У нас ска́зуюць па-ро́знаму, але ш ні ўсе. *В. В.*

СКА'БКІ (скапкі) *адз.* скабка. 1. Пасечаныя рэбры парсюка. Трэ́ба зжа́рыць ска́бак с пяць і хо́піць нам. *Прудз.* 2. Стрэмка. Загна́ў ска́пку ў па́лец, бале́ць на́тта. *Чар.*

СКАКУ'ХА (скаку́ха) *жан.* Жанчына, якая любіць танцаваць. Ну і скаку́ха ш Касьцючы́ха была́. Ні адны́ та́нцы без яе не абхо́дзіліся. *Бяс.*

СКАРА'Ч *мужч.* Ручнік для выцірання рук. Дачу́шка, вы́тры ру́кі скарачо́м. *Кам.*

СКАРО'МНІНА (скаро́мніна) *жан.* Сала, тлушч. Хоць бы доў якую скаро́мніну, ато паста́віў сухо́ю карто́шку. *Кам.*

СКАРО́′МНІЦА. *Гл.* скарóмніна. У мяне́ шчэ шмат скарóмніцы éсьцяка. *Кам.*

СКА́′ЧКІ (ска́чкі) *толькі мн.* Вечарынка. Зьбіра́йся ды на ска́чкі по́йдзем, ка́жуць, сёньня хло́пцы з Ру́дні іграць бу́дуць там. *Узгур.*

СКЛІЗО́′ТА (склізо́та) *жан.* Слізгота. На ву́ліцы склізо́та — на нага́х не ўсто́яць *Р. Ч.*

СКЛО́′ПКА (скло́пка) *жан., асудж.* Жанчына, якая любіць многа гаварыць. А гэ́та скло́пка ўсё бе́гае па сяле́ і ме́ле языко́м. *Бяс.*

СКНЭ́′РА (скнэ́ра) *агульн., неадабр.* Скнара. От скнэ́ра, дык скнэ́ра! У яе ні вы́рвіш нічо́га. *Нар.*

СКО́′БЛЯ *жан.* Прылада для саскрабання кары з дрэва. Пазы́ч, Іван, мне сваю́ ско́блю. *Кам.*

СКО́′РАМ (ско́рам) *мужч.* Сала, здор, тлушч. Вы́шаў ско́рам, то трэ́ба гуркі і цыбу́лю е́сьці. *Уж.*

СКО́′ЧКА (ско́чка) *жан.* Дзіцячая гульня «ў класікі». Усе малы́я дзе́ці ве́льмі ж лю́бяць у ско́чку гуля́ць. *Борк.*

СКРОЗЬ (скрось) *прысл.* Усюды. Цяпе́р скрось лю́дзі добра жыву́ць, а ране́й не так было́. *Кук.*

СКУ́′БСЦІ (ску́бсьці), -у, -еш; *незак. тр.* Кляваць. «Ну як, рыбакі? Скубе́ць сяго́ньня?»—«Кажу́ць, лавілі на Малы́х Шва́кштах на шы́ціхаў, до́бра ску́бла». *Ст. В.*

СКУ́′РЧЫЦЬ (ску́рчыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Скамячыць. Як хапіла мяне́ злосць, вы́рвала я ў яго́ з рук гэ́тую са́мую бума́шку і ску́рчыла яе. *Кам.*

СЛА́′БА (сла́ба) *прысл.* 1. Дрэнна. Сла́ба яны́ рабілі, таму́ і ма́ла палучы́лі. *Р. Ч.* 2. Мала. Муж мой сла́ба гро́шай зарабіў у гэ́тум ме́сяцы. *В. В.*

СЛА́БО́′Е (малако́) *прым.* Малако, якое лёгка выдойваецца. На́шу каро́ўку до́бра даіць, бо малако́ слабо́е, а ў Гану́сі ад яе каро́вы дык па́льцы баля́ць. *Гіл.*

СЛАНЁ́′ВІКІ (сланёвікі) *адз.* сланёвік. Сандалі. У сыбо́ту жы́нка е́гдзіла на кірма́ш, купіла сланёвікі, але я іх прадо́ў. Так ціснулі, про́ста як за се́рца ціснулі. *Заб.*

СЛАНІ′НА (сланіна) *жан.* Сала. Зарэ́залі кабана́, сланіна на сьпіне́ ў пяць па́льцаў была́. *Бяс.*

СЛОН (слон) *мужч.* Услон. Сядай пакуль на слон і чака́й, я за́рас. *Прудз.*

СЛО′НЧЫК (сло́нчык) *мужч.* Услончык. Васіль, як бальшы́, сядзіць на сло́нчыку і абува́ецца. *Прудз.*

СЛУ′ЖАЧКА *жан.* Дачушка. На, слу́жачка, табе́ малака́. *Кам.*

СЛУ′ЖКА (слу́шка) *жан.* Нявестка. До́брая табе́ слу́шка папа́лася, усе́ чы́ста сама́ ро́біць. *Кам.*

СЛУХ (слух) *жан.* Чутка. Слух хо́дзіць, што перамо́га ху́тка. *Войр.*

СЛЫ′ШКА (слы́шка) *жан.* Вестка. Слы́шка хо́дзіць, што ён ско́ра ве́рнецца дадо́му. *Граб.*

СМО′ЛКА (смо́лка) *жан.* Малодзіва. Ху́тка каро́ва мая́ цялі́цца бу́дзя, а смо́лкі дае адну́ ка́плю. *Гіл.*

СМОЛЬ (смоль) *жан.* Кавалкі дрэва для падпальвання. Схадзіў бы ты, сыно́к, прынёс смо́лі, трэ́ба насячы́ яшчэ́ на зіму́, а то застане́мся так. *Р. Ч.* Смалістыя трэскі, якімі падпальваюць дровы. Трэ́ба смо́лі нарыхтава́ць к зіме́, а то ні бу́дзе чым у пе́чы падпа́льваць. *Цял.*

СМЫ′ЖЫЦЬ (смы́жыць), -у, -ыш; *незак. тр.* Гатаваць ежу. Сёньня цэ́лы дзень смы́жыла пачасту́нкі для гасьцёй. *Кам.*

СМАЛІНА′ (смаліна́) *жан.* Тонкія дровы для распальвання ў печы. Пайшо́ў бы ты, сыно́к, нашчапа́ў смаліны́. *Кам.*

СМА′ЛІЦЬ (сма́ліць), -ю, -іш; *незак. тр.* Моцна хацець. З жа́ру так і сма́ліць, каб вы́піць кваску́. *Кам.*

СМАЛІ′ЦЬ (смалі́ць), -ю, -іш; *незак. тр.* Курыць. Што ты сма́ліш гэ́ту лю́льку цэ́лы дзень? *Кам.*

СМІ′РНЫ (сьмі́рны) *прым.* Ціхі маўклівы чалавек. Мікала́й такі́ ужо сьмі́рны. Лішняга сло́ва ні ска́жа, нікога ні пакры́ўдзіць. *Бяз.*

СНАВА′ЦЬ (снава́ць), -ну-ю, -ну-еш; *незак. тр.* Ха-

дзіць без работы. І чаго́ ты снуе́ш тут цэ́лы дзень? Што табе́, рабо́ты нема́? *Прудз.*

СНО́ЎДАЦЦА. *Гл.* Снаваць. Хадзіць без справы. Чаго́ ты сно́ўдаясься тута́ка? *Кам.*

СО́ЎГАЦЦА (со́ўгацца), -ю-ся; *незак. тр.* Хадзіць без справы. Со́ўгаяцца цэ́лы дзень, гульта́й гэ́ты. *Дук.*

СО́ЎКАЦЬ (со́ўкаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Песціць. Ба́пка адно́ то́лькі і ро́біць, што ўну́ка со́ўкае. *Пільк.*

СО́ЎНЕЙКА (со́ўнейка) *ніяк.* Сонейка. Сёньня бу́дзя вясёлы дзянёк, з са́мага ра́нку сьве́ціць со́ўнейка. *Карш.*

СО́ПУХА (со́пуха) *жан.* Сажа. А со́пухі насы́палася с ко́міна! *Уж.*

СО́СКА (со́ска) *жан., перан.* Папяроса. Мой Міхе́т гэ́ту со́ску з ро́та ні выпуска́я. *Кам.*

СПАГО́ДНАСЦЬ (спаго́днасць) *жан.* Спачуванне. Якія вы чэ́рствыя, нема́ ў вас спаго́днасьці да людзе́й. *Цял.*

СПАГНА́ЦЬ (спагна́ць), -ю, -іш; *зак. тр.* Вярнуць назад. Укра́лі ў мяне шчане́, дык я за́ўтра спагані́ю яго назя́т. *Бяс.*

СПАС (спас) *мужч.* Ратунак. Нема́ спа́су ад лісы́, усіх кур перавало́чыць. *Дзям.*

СПАХНЕ́НЦАВАТЫ (спахне́нцаваты) *прым.* Пахучы ад вялікай колькасці прыпраў. Такі спахне́нцаваты суп, такі сма́шны, што за ву́шы не ацьця́гнеш. *Кам.*

СПЛА́ВІЦЬ (спла́віць), -ўл-ю, -іш; *зак. тр.* Згубіць. Зо́ська бра́таву кні́гу спла́віла, а тако́й нідзе́ нема́шака. *Даўг.*

СПЛАСЦІ́ЦЬ (спласьці́ць), -ч-у, -іш; *зак. тр.* Нагрэбці пласт сена. А па́рабак спласці́ў пласт се́на і піхце́ль яго́ ў раку́, ка́жыць: «А я сваёй каро́вя нясу́, бо я гэ́та то́лькі п'ю». *Мік.*

СПРАВЕ́ДАЦЬ (справе́даць), -ю, -еш; *зак. тр.* Праведаць. Захацёў паглядзе́ць ро́дныя мясьці́ны і вось — справе́даў вас. *Руб.*

СПРАЎЛЯ́ЦЬ (спраўля́ць), -яю, -я-еш; *зак. тр*

праўляць. Вот на днях з на́шай вёскі 25 чалаве́к у а́рмію спраўля́лі, ве́села было́. *Р. Ч.*

СПРА́ЎНА (спра́ўна) *прысл.* Добра. Спра́ўна ро́біць маладзіца, ні паткапа́ісься, ды чаму́ не, калі і ба́цька і ма́тка працавітыя. *Сак.*

СПРЭС (спрэс) *прысл.* Зусім. Ён быў спрэс малады́м. *В. В.*

СПУ́ЛКА (спу́лка) *жан.* Суполка. У спу́лца рабі́лі. *Цар.*

СПЫ́ТАЦЬ (спы́таць), -ю, -еш; *зак. тр.* Пакаштаваць. Ён і не спы́тае нават, а адра́зу ло́шку кладзе́. *Чыж.*

СПЯША́КА (сьпяша́ка) *жан., агульн.* Чалавек, які заўсёды спяшаецца. А гэ́ты Іван ве́чны сьпяша́ка, увесь час ён сьпяшы́ць, няма яму супы́нку. *Бяс.*

ССАДЗІ́ЦЬ (ссадзіць), -дж-у, -іш; *зак. тр.* Збіць. Ссадзіла па́лец, цяпе́р хаджу́ і кульга́ю. *Кам.*

ССО́РЫЦЬ (ссо́рыць), -у, -ыш; *зак. тр. Гл.* сплавіць. Дзе ты мой караво́к ссо́рыў? Кап тут за́раз быў! *Нав.*

СТАВІЧКІ́ (ставічкі́) *адз.* ставічок. Дзіцячыя туфлікі. Малышу́ но́выя ставічкі́ абу́лі, усё глядзіць на іх. *Борк.*

СТАГА́Н (стага́н) *мужч.* Стакан. Я яшчэ́ вы́п'ю стага́н ча́ю, толькі саладзе́йшага. *Узгур.*

СТАЁ́НКА (стаёнка) *жан.* Дзіцячая стойка. Прынясі с тэй ха́ты стаёнку, хай дзіця́ пастаіць. *Цяр.*

СТАЛЬНІ́ЧКА (стальні́чка) *жан.* Падстаўка пад скавараду. Пасто́ў скавараду́ на стальні́чку. *Цял.*

СТАЛЮ́ГА (сталю́га) *жан.* Прылада, на якой што-небудзь стругаюць. Дачу́шка, ідзі набяры́ стру́жак пад сталю́гай, у пе́чы ўжо пара́ пале́ць. *Р. Ч.*

СТАЛЮ́ГІ (сталю́гі) *толькі мн.* Казлы для пілавання дроў. Нясі сталю́гі на дрыво́тню, бу́дзем дро́вы ро́заць. *Мац.*

СТАНАВІ́ЦЬ (станавіць), -ул-ю, -іш; *незак. тр.* Будаваць. Гэ́ты гот у Ліцьвя́нах стано́вяць но́вую шко́лу кірпі́чную. *Кам.*

СТА́НІК (ста́нік) *мужч.* Безрукаўка на ваце. Хо́лад-

на ўво́сень бу́льму капа́ць, дажджы́, вот і надзява́ем ста́нік. А зза́ду й аўчы́нку дасі́, кап цяпле́й было́. *Нав.*

СТАНО́К (стано́к) *мужч.* Луг паміж балотамі. Хадзі́ на той стано́к ды ўкасі́ тро́хі каро́ве, а то ма́ла се́ньня напасла́ся. *Р. Ч.*

СТАНІ́НА (стані́на) *жан.* Палатно ў 18 пасаў на стан кашулі. Жанкі́ палатно тка́лі ў 18 пасам, такі́я стані́ны палуча́ліся, на стан кашу́лі ішло, перат і зат. Гэ́та ўжо стані́на, як мы зва́лі. *Пап.*

СТАНКІ́ (станкі́) *толькі мн.* Козлы, на якіх пілуюць дровы. Сёньня з ра́ніцы мой Ко́ля ўсе дро́вы на станка́х папілава́ў. *Кук.*

СТАРАНА́ (старана́) *жан.* 1. Месца ў таку, куды складаюць неабмалочанае збожжа. Ток наш вялі́кі быў, і во́сеньню заўсёды поўная старана́ збо́жжа ляжа́ла. *Гіл.* 2. Палавіна хлява, дзе складаюць сена. Як накладзе́ш гэ́ту старану́ се́на, дык хапа́е на дзве каро́вы. *Кам.*

СТАРА́ННІЦА (стара́ньніца) *жан., адабр.* Старанная жанчына. Така́я яна́ ў нас стара́ньніца, усё ўме́е, усё зро́біць. *Хал.*

СТА́ТНЫ (ста́тны) *прым.* Добры. Яму далі́ ста́тную работу. *Кук.*

СТАРЫ́ КАВАЛЕ́Р. Халасцяк у гадах. Дваю́ранны брат у мяне́ ё, ко́мната ў яго́ сва́я і матацы́кл ё, а жані́ца не хо́ча, мусіць, застане́цца стары́м кавале́рам. *Бяс.*

СТАЎБУ́Н (стаўбу́н) *мужч.* Вялікі гліняны збан. Цэ́лы стаўбу́н малака́ паста́віла на сьмята́ну ды на ма́сла. *Мац.*

СТАЯ́К (стаяк) *мужч.* Грубка. А пячні́к до́бры стаяк нам зрабі́ў, тро́шкі прапа́ліш і цёпла ў ха́це. *Кам.*

СТО́ЛІК (сто́лік) *мужч.* Шуфляда ў стале. Аткры́й сто́лік ды пашука́й, там Пе́цява ру́чка ляжа́ла. *Сям.*

СТО́ЎБЧЫК (сто́ўпчык) *мужч.* Драўляная сальніца. Пада́й сюды́ сто́ўпчык, трэ́ба дасаліць стра́ву. *Р. Ч.*

СТРОП (строп) *мужч.* Столь. Во́сеньню насы́палі бу́льмы пат самы строп у сто́пцы. *Кук.*

СТОЛ (стол) *мужч.* Ежа. Ма́льцы на́шы каза́лі, што стол на выпускно́м (вечары) быў харо́шы, але не́шта ні піць, ні есьці не хаце́лася. *Белар.*

СТОЛЬ (столь) *жан.* Чардак. Пале́зь на столь і даста́нь цыбу́лі пляце́начку. *Р. Ч.*

СТО'ЦЬВЫ (сто́цьвы) *толькі мн.* Ткацкі станок. Ране́й мы тка́лі палатно́ на сто́цьвах. *Бяс.*

СТО'ЙКІ (сто́йкі) *прым.* Устойлівы. Пазы́чця мне казлэ́, ва́шы сто́йкія, не хіста́юцца. *Кам.*

СТО'ЛАК (сто́лак) *мужч.* Маленькая лавачка. Дзед наш на сто́лаку каля́ пе́чы заўсе́ды сядзіць. *Раўч.*

СТО'ПКА (сто́пка) *жан.* Невялікая печ ў пакоі, печка-галанка. Ты ся́ньня сто́пку сам вы́палі, бо по́зна прыду́. *Луц.*

СТРАЕ'ННЕ (страе́ньне) *ніяк.* Хата з прыбудовамі. Страе́ньня было́ бальшо́я, ды згарэ́ла ў дваццаць восьмым году́. *Р. Ч.*

СТРАЖЫ'НЫ (стражы́ны) *толькі мн.* Прыстасаванне для сушкі бульбяніку. Начапля́лі бульбя́ніку на стражы́ны. *Цял.*

СТРАПКА'Ч (страпка́ч) *мужч.* Трапкач. Калі́ не бу́дзеш слу́хаць, дак так атхвашчу́ страпкачо́м, што не ся́дзіш. *Бяс.*

СТРО'КІ (стро́кі) *толькі мн.* Вушкі ў лапцях, у якія працягваюцца аборы. Зацягні́ або́ры ў стро́кі. *Р. Ч.*

СТРО'ЙНА (стро́йна) *прысл.* Смачна, добра. На, паспыта́й майго́ пірага́, як стро́йна па́хне. *Р. Ч.*

СТРУГА'ЦЬ (струга́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Абіраць бульбу. Трэ́ба наструга́ць карто́плі на вячэ́ру. *Цял.*

СТРЫГМА'Ч (стрыгма́ч) *мужч.* Асоба з неахайнаю прычоскаю (у адносінах да мужчын). Усе́ жыцьце́ стрыгмачо́м хо́дзіць — нікó́лі пэ́йсы сваé не падрэ́жа па-лю́цку: то перабярэ́, то до́ўгія ку́чмы пакíне. *Граб.*

СТО'ЧКІ (сто́чкі) *толькі мн.* Месца, дзе зліваюцца рэкі. На сто́чках така́я ўжо бурлі́вая вада́, што там, дзе і ме́лка, бо́язна перахо́дзіць. *Кук.*

СТУШЫ́ЦЬ (стушы́ць), -у, -ыш; *зак. тр.* Патушыць. Стушы́ла агóнь, а сама́ пайшла́ к сусе́ду. *Кам.*

СТЫДА́ЦЦА (стыда́цца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Саромецца. Яна ўжо дзе́ўка вялі́кая, дак стыда́ецца ў адны́м пако́і з усі́мі. *Нар.*

СУМЕ́СНІЦА (семе́сьніца) *жан.* Лес, якім карыстаюцца сумесна некалькі вёсак. Упе́рад жа ў нас былі́ суме́сьніны на лес. *Гіл.*

СУПАКО́Й (супако́й) *мужч.* Спакой, цішыня. Стара́я ціпе́р я, нядзу́жая, супако́й мне тро́ба, а го́тыя фулі́га́ны заўсе́ды пад во́кнамі шнуру́юць. *Кам.*

СУРДУ́К (сурду́к) *мужч.* Сурдут. Сурду́к но́вы апрана́е — хоць зо́ўтра ў сваты́. *Кам.*

СУСТО́ЎКА (суста́ўка) *жан.* Сустаў. Дай мне го́тай расьці́пкі, ве́льмі суста́ўкі баля́ць. *В. В.*

СУСТЭ́П (суста́п) *мужч.* Тустэп (танец). Быва́ла, як пайду́ суста́п гуля́ць, дык усе хло́пцы на мяне́ загляда́юцца. *Р. Ч.*

СУХАПА́РНІК (сухапа́рнік) *мужч.* Адстойнік для малака. Як падаю́ каро́ву, то малако́ налі́ва́ю ў сухапа́рнік і апуска́ю ў кало́дзеш. *Р. Ч.*

СУХО́З (сухо́с) *мужч.* Саўгас. Не́калі ён у на́шым сухо́зе старшынём быў, а по́тым яго зьнялі́, бо не мох нала́дзіць рабо́ту. *Р. Ч.*

СХАРАНІ́ЦЦА (схаранíцца), -ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Схавацца. Пяць дзе́вак схаранілася за та́нкам, а не́мец іх с самале́та і пабі́ў усіх. *Н. К.*

СЦІ́БЧЫЦЬ (сьці́пчыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Украсці. Не́хта са двара́ рыдле́ўку сьці́пчыў, няве́дама дзе шука́ць. Цямне́е, карто́плю не паспе́ю вы́капаць. *Меж.*

СЦІ́РКА (сьці́рка) *жан.* Дошка для мыцця бялізны. Рука́мі б я ні змагла́ б перамы́ць сто́лькі бялі́зны. Дак укі́ну мы́ла, парашо́к, улію, закіда́ю эту адзе́жу. Яна атмо́кнінь, тагды́ мы́ю на э́ту сьці́рку. *Паг.*

СЦІ́ХНУЦЬ (пра дождж) *зак. тр.* Перастаць. Як сьці́хня дождж, тро́ба бу́дзя гнаць каро́ў на па́шу. *В. В.*

СХІНУ′ЦЬ (схінýць), -у, -еш (вокам); *зак. тр.* Акінуць вокам. За гэ́тым ляско́м лух бу́дзе — во́кам ні скі́нуць. *Кам.*

СХІНУ′ЦЬ ВО′КА. Загубіць зрок. Бе́днае маé дзіця́тка, гэ́такае маладо́е, а ўжо во́ка схіну́ла. *Бяс.*

СЦЕБАНУ′ЦЬ (сьцябану́ць), -у, -еш; *зак. тр.* Стукнуць. Як сьцябану́ла яна́ сы́на дупцо́м, дык той, бе́дны, аш прысе́ў. *Кам.*

СЦЁ′БНУЦЬ (сьцёбнуць), -у, -еш; *зак. тр.* Украсці. І хто гэ́та ў яе гро́шы сьцёбнуў? *Цял.*

СЦЁ′БКА (сьцёпка) *жан.* Памяшканне для захавання бульбы, гародніны і прадуктаў. Зімо́ю ў сьцёпцы хава́ем капу́сту, агуркі, кап не зьмёрзьліся. *Бяс.*

СШАЛЕ′ЦЬ (шшале́ць), -ю, -еш; *зак. тр.* Ашалець. Пат ста́расьць дык яна ўжо зусім шшале́ла, сва́рыцца, б'е́цца. *Цял.*

СЫРНІ′ЦА (сырні́ца) *жан.* Сыр, заліты маслам. Ну і ўку́сная ш сырні́ца ў мяне́ бу́дзя. *Р. Ч.*

СЮДЭ′МА (сюдэ́ма) *прысл.* Сюды. Вы як сюдэ́ма шлі, церас сенако́с або па шляху? *Р. Ч.*

СЯГО′ЛЕТА (сяго́лета) *прысл.* Сёлета. От да чаго́ сяго́лета цяшка было́ жыць у вёсцы, бо за́суха нарабі́ла бяды́: усё вы́паліла. *Р. Ч.*

СЯДУ′ХА (сядýха) *агульн., неадабр.* Чалавек, які не працуе, а сядзіць. Сядзіць сядýха і сядзіць, а рабіць за яе хто бу́дзя? *Хал.*

СЯЛЬНІ′К (сяльні́к) *мужч.* Вялікі палатняны мяшок, у якім носяць салому, сена, траву. Я пашы́ла вялі́кі сяльні́к, каб до́бра было́ насіць сало́му. *В. В.*

СЯ′ННЯ (ся́ньня) *прысл.* Сёння. Ба́чыла, кіншчык прыéхаў, ся́ньня кіно́ тады́ бу́дзя. *Луц.*

СЯРЧА′ТЫ (сярча́ты) *прым.* Абідлівы. Такі мой дзет стаў сярча́ты! То́лькі што скажы́ ямý, як ён прыціхне і размаўля́ць ні хо́ча. І до́ўга ча́су про́йдзе, калі ён на ўсё забу́дзяцца і бу́дзя размаўля́ць зноў. *Бяс.*

СЯРЧЫКІ′ (сярчыкі́) *толькі мн.* Запалкі. Фра́нцавіч,

да́йця шэсь кіль цу́кру, бутэ́льку напі́тку, а на рэ́шту да́йця сярчыко́ў ско́лькі там вы́дзіць. *Ст. В.*

Т

ТАБАРЭ́ЧЫК (табарэ́чык) *мужч.* Табурэт. Палажу́ на табарэ́чык до́шку, вазьму́ паду́шку ды атпачыва́ю сабе́ у садо́чку. *В. В.*

ТАГДЫ́ (тагды́) *прысл.* Тады. Як прагна́лі па́на, я тагды́ была́ маленькая. *Кал.*

ТАДЫ́Х (тады́х) *прысл.* Тады. Калі, дачу́шка, высо́ка со́нца, тады́х і мне мо́жна ўста́ць, а то я заляжа́ўся ту́така. *Яц.*

ТАЛАКНО́ (талакно́) *ніяк.* Страва з аўса. З аўсо́ў ране́й талакно́ рабі́лі. *Кл.*

ТАЛА́ННЫ (тала́нны) *прым.* Здольны. Тала́нны на ўсё: як игра́ць, як сьпява́ць, як ішчэ́ што. *Хож.*

ТА́ЛЕЧКА (та́лечка) *жан.* Маточак. На гэ́ту по́сьцілку ў міне́ пайшло́ пяцьдзесят та́лечак бавоўны. *Кам.*

ТАЛЕ́ВЫ (тале́вы) *прым.* Высокі, стройны чалавек. Тале́вая дзяўчы́на, про́ста воч не адве́сьці. *Н. К.*

ТАЛМА́ЧЫЦЬ (талма́чыць), -у, -ыш; *незак. тр.* Тармасіць. Што ты яго талма́чыш, няха́й яшчэ́ пасьпі́ць. *Кам.*

ТА́МЫЦЬКА (та́мыцька) *прысл.* Там. Чаго́ баіся́ся, та́мыцька то́лькі адзін конь. *Карш.*

ТАНДЭ́Т (тандэ́т) *мужч.* Месца гандлю рэчамі старымі, ужыванымі. Гэ́та цяпе́р малады́я ма́ла ро́бяць, а больш гуля́юць. А даўне́й усе служы́лі: то бу́льбу каму́ аскабліш, а не ха́ту памяце́ш, а не за ня́ньку... і я ў Каплы́ма Шму́йлы у тандэ́цэ рабі́ла, паку́ль за́муж. *Сасн.*

ТА́НЧЫЦЬ (та́нчыць) *незак. тр.* Танцаваць. Вот ня тэ́нціць бе́днаму Сьцяпа́ну — і се́лята парсю́к здох. *Дук.*

ТЛУНА́ (тлуна́) *толькі адз.* Непатрэбныя рэчы. Павыкіда́йце вы гэ́ту тлуну́ с ха́ты, красіве́й бу́дзе. *Р. Ч.*

ТАРО′ЙКАЦЦА (тарóйкацца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Бавіцца. Час дадóму ісьцí, а то тарóйкаюся з вáмі тут. *Раўч.*

ТАРО′ЙКАЦЦА (тарóйкацца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Спрачацца. Цэ́лую гадзíну тарóйкаліся, пóкуль згадзíліся рабíць рáзам. *Нар.*

ТАРСІ′НКІ (тарсíнкі). Лёгкія тапачкі. Вот як адзéнеш на нóгі гэ́тыя тарсíнкі, то прахóдзіш цэ́лы дзень і нóгі не баля́ць. *Р. Ч.*

ТАЎЧЫ′ (таўчы́), -к-у, -эш; *незак. тр.* Біць. Вéчна ён таўчэ́ яе у галаву́. *Кам.*

ТО′КА (тóка) *прысл.* Толькі. Гэ́тыя квéткі тóка тут у нас і е, больш нідзé. *Кам.*

ТО′НКАЕ ВУ′ХА. Добры слух. Ну й вýха тóнкае, як ні гавары́ — усё роўна пачу́е. *Ряс.*

ТО′РГАЦЬ (тóргаць) *незак. тр.* Балець. Так нахадзíлася, што нóгі бýдуць тóргаць. *Кам.*

ТО′ЎЗАЦЬ (тóўзаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Тузаць. Што ты мінé ўсё за спадні́цу тóўзаеш, супакóю табе німá. *Кам.*

ТО′РКНУЦЬ (тóркнуць), -у, -еш; *зак. тр.* Даць. Тóркні ім у рукý чаго-нéбуць. *Ліс.*

ТОРП (торп) *мужч.* Торф. Прывéзьлі машы́ну тóрпу. *Цял.*

ТО′ФЕЛЬ (тóфель) *мужч.* Топаль. Тóфель наш разрóсься, сьцягáя сóкі с агарóду. Нéшта рабíць зь ім трэ́ба, бо ўв агарóдзе нічóга не расьцé. *Белар.*

ТРАСУ′ШКА (трасýшка) *жан.* Бульбакапалка. Прыяжджáюць вóсеньню студэ́нты, дык яны́ за трасýшкай капáюць, а мы, бáбы, дык за плýгам. *Бяс.*

ТРА′СЦА (трáсца) *жан.* Нічога. О, дурні́цу нашóў, а трáсцу я табе дам. Лю́біць браць, а аддавáць — дык не. *Бяс.*

ТРАПА′ШКА (трапáшка) *жан.* Трапло. Трапáшкай выбівáлі са льну кастры́цу. *Бяс.*

ТРАХА′ (трахá) *прысл.* Папярхнýлася, дык трахá ні задушы́лася. *В. В.*

ТРАЯ′К (траяк) *мужч.* Вялікае бервяно. Калі на нашай вуліцы ляжыць траяк, то вечарам к яму прыходзіць многа людзей, садзяцца і пачынаецца размова да поўначы. *Р. Ч.*

ТРУДЗЯ′ШЧЫ (трудзяшчы) *прым.* Працоўны, рабочы. Нанялася бялізьну сьціраць, ня гэтая, шта ат трудзяшчага чалавека, каравая, але ад госпад, шта рас адзеніць і мыць. Дзьвесьця пядзісят штук і пядзісят каўняроў памыць і накрахмаліць, каб стаялі — такая мая работа была. *Паг.*

ТРУ′НАК (трунак) *мужч.* Прыправа. Ускінула грыбы на скаварótку, наклала ладна такі здору ці яшчэ ўсякага там трунку. Да чаго ж былі смачныя! Толькі вада п′ецца. *Мал.*

ТРУ′СКІ (трускі) *прым.* Няроўны, нягладкі. Дарога такая труская, што ўсю душу вытрасла. *Хал.*

ТРУЦІ′ЗНА (труцізна) *жан.* Атрута. Ані не глядзіць, што дзеці малыя, гэтую труцізну папакідае абы-дзе. *Бяс.*

ТРЫМА′ЦЬ ПУ′ЛЮ. Хацець развязаць вайну. Яны пулю на нас трымаюць, вайною на нас хочуць пайсьці. *Кам.*

ТРЫМЧЭ′ЦЬ (трымчэць), -у, -ыш; *незак. тр.* Ліпець. Бапка лець трымчэла ўжо, калі ён прыехаў. *Раўч.*

ТРЭ′ЙЧЫ (трэйчы) *прысл.* Тройчы. Як ткала, дык трэйчы стукнула бердам і яно зламалася. *Цял.*

ТУ′БЕЛЬЦЫ (тубельцы). Карэнныя жыхары. У нашай весцы жывуць тубельцы. *Бяс.*

ТУГАВУ′ХІ (тугавухі) *прым.* Глухаваты. Вот гэты тугавухі, гавораць, а ён нічога не чуе. *Бяс.*

ТУДЭ′Ю (тудэю) *прысл.* Тудою. На Вусу вы тудэю ні пройдзяця. *Кам.*

ТУК (тук) *мужч.* Расплаўлены тлушч. Мачайце картоплю ў тук. *Кам.*

ТУМА′РНІК (тумарнік) *мужч.* Вельмі маўклівы чалавек. Прышоў гэты тумарнік і маўчыць, сказаў бы хоць слова. Ці можа табе язык уцягнула? *Бяс.*

ТУРБА́ВЫ (турба́вы) *прым.* Клапотны. Ён, панімáяця, сеў і давáй, брат, ганяць (бульбай па тарцы). А картóшка мóкрая — ён як шарáхнуў па пальцах, брат. Кроў. Ён хóду с хáты. Каыць, укýсная стрáва, але й турбáвая. Палянь, якія маé пáльцы, ні хачý ні кýшаць, ні рабóтаць. *Мік.*

ТУРЛЯ́ЦЦА (турля́цца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Штурхацца. Ні турля́йся, сядзíця спакóйна! *Цял.*

ТУ́ТЫЦЬКА (ту́тыцька) *прысл.* Тут. Ту́тыцька ён да сáмай нóчы і стаяў. *Карш.*

ТУФА́ЙКА (туфáйка) *жан.* Фуфайка. Мы дык свайм дзяўчáткам і туфáйкі давáлі, каб былó цяплéй. *Кам.*

ТЫ́РЫЦЬ (ты́рыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Біць. Сéньня мы бýдзем ты́рыць сусéцкага хлóпца. *Цял.*

ТЫ́ЙДЗЕНЬ (ты́йдзень) *мужч.* Тыдзень. Бáцька мой як паéхаў у Мінск, дык цэ́лы ты́йдзень сядзéла дóма. *Бяс.*

ТЭ́БЕЛЬ (тэ́бель) *мужч.* Вялікі свердзел. На крóквы трэ́ба тэ́бель вялíкі, малéнькім не справíвісься, не пракрýціш. *Буз.*

ТЭ́ЧКА (тэ́чка) *жан.* Сумка. Поўную тэ́чку хлéба прынéс. *Кам.*

У

УБІ́ЦЦА (убíцца), -ю-ся, -еш-ся; Нечакана ўвайсці. Учóра ўбíўся да нас у хáту гэ́ты п'я́ны, ледзь вы́гналі. *В. В.*

УБІ́ВЕЦ (убíвяц) *агульн.* Забойца. Ён жа ўбíвец настаяшчы. Як быў у паліцáях, то яму чалавéка былó забíць, усё рóўна што плюнуць. *Дук.*

УВАЖА́ЦЬ (уважáць), -ю, -еш; *незак. тр.* Заўважаць. Ты не ўважáла, там магазíн аткрыты? *Кам.*

УВЕ́ЧАРА (увéчара) *прым.* Увечары. Прыйшлá ўвéчара кармíць, а маіх качанятак нямá. *Чыж.*

УВЁ́РТКІ (увёртки) *прым.* Кемлівы. Такí ш увёртки

наш бры́гадзір: і камба́йн дагавары́ўся палучы́ць, і сту́дні навыко́пваў там, дзе вада́ харо́шая. *Узгур.*

УВЫ́КНУЦЬ (увы́кнуць), -у, -еш; *зак. тр.* Прывыкнуць. Увы́клі ў сад ла́зіць, і што мне зь імі рабіць? *Буз.*

УВЯРЭ́ДЗІЦЦА (увярэ́дзіцца), -у-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Стаміцца. Я ўчо́ра так увярэ́дзілася, аш яшчэ́ сяго́ньня сьпіна́ бале́ць. *В. В.*

УВАЙСЦІ́ (увайсьці́), -у, -еш; *зак. тр.* Уступіць. Я пе́ршая ўвайшла́ ў калга́с. *Кам.*

УДАРО́ЖЫЦЦА (ударо́жыцца), -у-ся, -ыш-ся; Накіравацца. Му́сіць, ты далёка ўдаро́жыўся, бо ве́льмі ш до́ўга зьбіра́ўся. *Кам.*

УДО́ДЗІК (удо́дзік) *мужч.* Клямка. Заяда́е не́шта наш удо́дзік, бля́га дзьве́ры адчыня́ць. *Кук.*

УЗБАБЭ́РЫЦЬ (узбабэ́рыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Узараць. Яны́ ве́льмі ско́ра ўзбабэ́рылі ўвесь загон. *В. В.*

УЗБІ́ЦЦА (узьбі́цца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* 1. Пабагацець. Мой ба́цька заўсе́ды быў бе́дны, то́лькі за́раз на хазя́йства ўзьбіўся. *Гіл.* 2. Узлезці. Чаго́ ты ўзьбіўся на плот і сядзіш, як пе́вень? *В. В.*

УЗБУДЗІ́ЦЬ (узбудзіць), -у, -іш; *зак. тр.* Разбудзіць. Узбудзі́ мяне́ за́ўтра ў 4 гадзіны ра́ніцы. *Узгур.*

УЗГАВАРЫ́ЦЦА (узгавары́цца), -у-ся, -ыш-ся; *зак. тр.* Пачаць гаварыць. Узгавары́лася я зь ёю, дык яна мне тако́га нарасказа́ла, што і не падумаяш нікі́лі. *Кам.*

УЗНО́Ў (узно́ў) *прысл.* Зноў. Узно́ў яна ро́бя дрэ́нна. *Рат.*

УЗРО́К (узро́к) *мужч.* Позірк. Ну і цяжкі́ ўзро́к у яе: паглядзіць — і крычы́ць дзіця́ як само́ не сваё. *Узгур.*

УЗУСЛО́Н (узусло́н) *мужч.* Услон. На вясе́льлі сто́лькі людзе́й было́, што сваіх ўзусло́наў не хапіла, прышло́ся пазыча́ць. *Кук.*

УКАСАВА́ЦЬ (укасава́ць) *зак. тр.* Сапсаваць. Пасадзіла гурке́ ра́ньнія, але грат усё ўкасаво́ў. *Кам.*

УКАСІ́ЦЬ (укасіць), -у, -іш; *зак. тр.* Накасіць. Пры-

е́халі з Мі́нска, травы́ тро́хі ўкасі́лі — каро́ву шчэ дзяржы́м. *Кам.*

УКАЦІ́ЦЬ (укаці́ць) -у, -іш; *зак. тр.* Нарадзіць. Ціка́ва, што на́ша Га́ля ўко́ця — ці дзе́ўку, ці хло́пца? *Бяс.*

УКВЭ́КАЦЬ (уквэ́каць), -ю, -еш; *зак. тр.* Запэ́цкаць. Усе штаны́ ў гліну ўквэ́каў. *Цяр.*

УКВЯЛІ́ЦЬ (уквяліць), -ю, -іш; *зак. тр.* Уцвяліць. Суддзі́ ўжо шко́да і дзе́да абі́дзець, пасьле́ньнюю адабра́ць цялу́шку ў яго́, і па́на ш баіцца суддзя́ ўквяліць, пан жа багаце́йшы за дзе́да. *Луб.*

УКЛА́СЦІ (уклася́ць), -д-у, -дз-еш; *зак. тр.* Запэцкаць. Што с Са́шам рабіць? Зноў уклаў твар у чарні́ла, не пасьпе́ла і гля́нуць. *Кузьм.*

УКЛЕ́ІЦЬ (уклеіць), -ю, -іш; *зак. тр.* Стукнуць. Ні хо́ча нічо́га слу́хаць, паку́ль ні сту́кнеш, ні ўкле́іш. *Дзям.*

УКЛЕ́НЧЫЦЬ (уклéнчыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Стаць на калені. Як уклéнчыла пе́рад абраза́мі, дак до́ўга стаяла. *Цял.*

УКО́Р (уко́р) *мужч.* Дакор. З такім уко́рам глядзіць, як бы бу́дзя по́мніць кры́ўду ўсё жыцьцё. *Граб.*

УКРА́ДНЯ (укра́дня) *прысл.* Употайкі. Укра́дня хо́дзіць як вінава́ты: вядо́ма ж, сваé дзéці ўжо ма́е, а бадзяецца, як валацу́га які. *Граб.*

УКРЫВА́НКА (укрыва́нка) *жан.* Вялікая суконная хустка. Як укру́цішся ўкрыва́нкай, то ніякі маро́с ні стра́шны. *Дук.*

УЛА́ПІЦЦА (ула́піцца), -пл-ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Ухапіцца. Такі ён ужо чалаве́к, як ула́піцца, то ні ско́ра атпу́сьціць. *В. В.*

УЛЕ́ГЧЫ (улéхчы), -г-у, -ж-аш; *зак. тр.* 1. Пусьціцца бегчы за кім-небудзь. Саба́ка ўлéг за за́йцам. *Уж.* 2. Шчыра ўзяцца за працу. А ён цяпе́р улéг у пра́цу. *Уж.*

УЛІ́ЎНЫ (улі́ўны) *прым.* Праліўны. З Сівіцы ўсе лю́дзі вы́браліся і паéхалі ў лес, пабро́ўшы каро́вы, като́ры ўзéў парсюка́, дзéці малы́я. А тады́ ішоў такі дош

праз дзьве нядзе́лі ўлі́ўны, што па па́хі ў вадзе́ сядзе́лі мы ў тым ле́сі. *Сів.*

УЛО́ННЕ (уло́ньне) *ніяк.* Бярэма. Цэ́лае ўло́ньне дроў набра́ла. *Р. Ч.*

УЛУ́КАТКУ (улу́катку) *прысл.* Зігзагам. Чаму́ ён пашо́ў улу́катку, мо́жа яму дрэ́нна? *Цар.*

УЛЯПІ́ЦЦА (уляпі́цца), -ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Ухапіцца. А ён як улепіцца за Міхася́. *В. В.*

УМАЧЫ́ЦЬ (умачы́ць), -у -ыш; *зак. тр.* Вымачыць. Рыбало́вы пад ра́ніцу умачы́лі ўсю во́пратку. *Узгур.*

УМЕ́СТА (уме́ста) *прысл.* Разам. Усё прывезенае скі́нулі ўме́ста. *Узгур.*

УМЕ́ТНІК (уме́тнік) *мужч.* Ток. От мы се́ньня с сьвякру́хаю так ухадзі́ліся на ўме́тніку, што чуць дамо́ў прышлі́. *Р. Ч.*

УМЕ́ЦЦЕ (уме́цьця) *ніяк.* Амецце. Тро́ба ўме́цьця запа́рыць у цэ́бры. *Р. Ч.*

УМЕ́ЦЦІ (уме́цьці) *толькі мн.* Мякіна. Тро́ба ўме́цьці запа́рыць каро́ві. *Р. Ч.*

УПАДАБА́ЦЦА (упадаба́цца). Спадабацца. Мая́ нявестка ўсім упадаба́лася. *Кам.*

УПАКА́Т (упака́т) *прысл.* Адзін каля аднаго. Спа́лі яны на се́ня упака́т, а Пе́цька на́ват на галаву́ То́лькіную ўссу́нуўся. *Неж.*

УПАЛІ́ЦЬ (упалі́ць), -ю, -іш; *зак. тр.* Зрабіць, сказаць нешта смешнае. Ён тут такое́ ўпалі́ў, што ўсе сьмя́ліся мо́цна і Марыю спу́дзілі. *Хал.*

УПЕ́РАД (упе́рат) *прысл.* Спачатку. Упе́рат, як то́лькі пажані́ліся — сварыліся, а цяпе́р дру́жна жыву́ць. *Кам.*

УПЕ́РЦІ (упе́рці), -у, -эш; *зак. тр.* З'есці. Упе́р чыгу́н капу́сты і ма́ла яму. *Кам.*

УПЛЁ́Т (уплёт) *мужч.* Каснік. Як злягла́ я, рабі́лі рапара́цыю, дык маёй Анюсьцы і ўплёта́ў ні было́ каму́ ўпля́сьці. Ба́пця завя́жыць уплёт за па́сму сьпе́раду й так хадзі́ла. *Заб.*

УПО′ЦІМКУ (упо́цімку) *прысл.* Упацёмку. Даха́ты вярта́ліся ўжо ўпо́цімку: не відаць даро́гі. *Узгур.*

У РА′ДЗІВЕ. Па радыё. Учо́ра ў ра́дзіві гаварылі, што дажджу́ ні бу́дзя. *Кам.*

УРА′НІЦЫ (ура́ніцы) *прысл.* Раніцай. Ура́ніцы сьпі́ць, уве́чары лажы́цца ра́зам с кура́мі, а мне душы́ся адно́й, а чуць-што —«паляжа́ць ямý не даю́ць». *Белар.*

УСАДЗІ′ЦЬ (усадзі́ць), -у, -іш; *зак. тр.* Назначыць. Яго да нас яшчэ залётась старшынём усадзілі. *Кам.*

УСЕ′СЦА (усе́сца). Усесціся. Для таго́ каб усе́сца, нам патрэ́бна 4 крэ́слы. *Узгур.*

УСКАЧЫ′ЦЬ (ускачы́ць), -у, -ыш; *зак. тр.* Падхапіцца. Усе, хто быў у ха́це, хýтка ўскачы́лі. *Узгур.*

УСКРУЦІ′ЦЦА (ускруці́цца), -чу-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Рана ўстаць. Ускруці́ўся яшчэ́ да пе́ршых пе́ўняў, бо дамо́вілася ўспýдку працава́ць. *Пільк.*

УСПАРО′ЦЦА (успаро́цца), -у-ся, -аш-ся; *зак. тр.* Устаць вельмі рана. Я гэ́так хаце́ла успаро́цца ра́на, але не вы́шла. *Кам.*

УСПАРО′ЦЬ (успаро́ць), -у, -аш; *зак. тр.* Вельмі рана разбудзіць. Ма́ма, чаго́ ты мяне́ так рана ўспаро́ла? *В. В.*

УСТУПІ′ЦЦА (уступі́цца), -л-ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Абуцца. Дава́й хучэ́й, табе́ яшчэ́ ўступі́цца патрэ́бна, а дзе вале́нкі? *Ган.*

УСТУПІ′ЦЦА (уступі́цца), -пл-ю-ся; -іш-ся; *зак. тр.* Абуцца. Уступі́ся, дзіця́тка, а то ўся́ка мо́жа быць. У нас і гадзю́кі ё, асцяро́жна бу́цьце. *Р. Ч.*

УСЯДНО′ (усядно́) *прысл.* Усё роўна. Ска́рдзіцца, што ў сярэ́дзіня бале́ць, але ўсядно́ рабо́ты ня хо́ча кі-да́ць. *Дук.*

УСКЛУБІ′ЦЦА (усклубі́цца), -ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Сагнуцца. Чалаве́ку шэ́сцьсят гот было́ ўжо, усклубі́ўся, упы́нку ямv не было. *Кам.*

УСТРО′ІЦЬ (устро́іць), -ю, -іш; *незак. тр.* Вастрыць. Мой пашо́ў у ку́зьню тапо́р устро́іць. *Чар.*

УСТУ′РЫЦЬ (устýрыць), -у, ыш; *зак. тр.* Рана разбудзіць. Бáпка рáна ўстýрыць, каб малакá парнóга папілí. *Чар.*

УТРАВІ′ЦЦА (устравíцца), -ю-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Унадзіцца. І чагó ён утравíўся да нас? *В. В.*

УТРУБІ′ЦЬ (утрубíць), -бл-ю, -іш; *зак. тр.* З'есці. Утрýбіць цэ́лую галóўку часнакá, а тады́ «сэ́рца балíць». То як жа яно ня бýдзя балéць?! *Заб.*

УТРЭ′ЖЫЦЦА (утрэ́жыцца), -у-ся, -ыш-ся; *зак. тр.* Вытрымаць. А гэ́ты малéнькі сабáчка дык ні ўтрэ́жыўся, здох. *Кам.*

УХАДЗІ′ЦЦА (ухадзíцца), -у-ся, -іш-ся; *зак. тр.* Вельмі стаміцца. Ухадзíлася за дзень, што сьвет ні мíлы. *В. В.*

УХАПІ′ЦЦА (ухапíцца), -ю-ся, -іш-ся; *незак. тр.* Прыступіць. Ухапíўся за прáцу агранóма з рáдасьцю, а пасьля астыўў, скіс. *Граб.*

УХО′ДАЦЦА (ухóдацца), -ю-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Стаміцца. Ох і ўхóдалася я сёньня каля гэ́тай пéчы. *Бяс.*

УХАДЗІ′ЦЦА (ухадзíцца), -дж-у-ся, дз-іш-ся; *зак. тр.* Моцна стаміцца. Ухóдзішся за дзень, дык ні рукí, ні нагí ні падняць. *В. В.*

УЦІ′ШЫЦЬ (уцíшыць), -ш-у, -ш-ыш; *зак. тр.* Супакоіць. Балбóчуць і балбóчуць, ніяк іх ні ўцíшыць. *Зайцы.*

УЧО′РЫ (учóры) *прысл.* Учора. Учóры ў Мінск з'éзьдзіла ды купíла грацкóвай крупы́. *Кам.*

УСШЫПЕ′ЦЦА (ушшыпéцца), -пл-ю-ся, -п-іш-ся; *зак. тр.* Узлавацца. Яна ўшшыпéлася, а я ня вéдаю за што. *Дук.*

УШЧАПІ′ЦЬ (ушчапíць), -ю, -іш; *зак. тр.* Надзець. І ні сóрамна ёй; ушчапíла чужýю кóфту і хóдзіць. *Кам.*

УШЧА′ЦЬ (ушчáць), -у, -еш; *зак. тр.* Пачаць. Пісьмо яшчэ́ ўчора ўшчалá писáць, а німá як кóнчыць за гульнёй. *Бяс.*

УШЫ′РЫЦЬ (ушы́рыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Пашы-

рыць. Жале́зная даро́га туды́ ішла́: да Чаля́бінска двухкале́йная, а да́лей аднакале́йная. А ў трына́ццатум го́дзя праклада́лі друго́е палатно́, даро́гу ўшы́рылі. *Белар.*

Ф

ФАЛІВА′РАК (фалі́ва́рак) *мужч.* Фальварак. У фалі́ва́рку каваля́ ні было́. *Цял.*

ФАНЦІ′НА (хванці́на) *жан.* Марля для працэджвання малака. Ма́ня, прынясі ты мне хванці́ну малако́ працадзіць. *Р. Ч.*

ФА′ЙНА (фа́йна) *прысл.* Добра. О, як фа́йна ты суке́нку пашы́ла. *Ліс.*

ФАЦЭ′ТКА (фацэ́тка) *прысл.* Цікава. Ой, як фацэ́тка ён раска́звае. *Кам.*

ФІ′РМАВЕЦ (фі́рмавец) *мужч.* Той, хто працуе на ферме. Ого, цяпе́р калхо́зы крэ́пкія. Цяпе́р усё це́хніка, машы́ны і канба́йны. І калхо́зьнікі до́бра палуча́юць. Вышэ́йшую цану́ дзе́ржаць пасту́хі, па пяцьсо́т выхо́дзя на ме́сяц, за імі фі́рмаўцы, като́рыя ў шта́ця, а тады́ паляво́ды. *Белар.*

ФІРУ′РГ (фіру́рг) *мужч.* Хірург. Дачка́ мая́ Ка́ця па́ляц пакало́ла, нарва́ў ён, нічо́га рабіць ня мо́жа. Стры́жань у па́льцы во які́, а бальні́цы у нас нема́, медыцы́нскі пункт то́лькі, фіру́рга там, як у бальні́цы, нема́. Му́чыцца, бе́нная. *Белар.*

ФО′РТКА (фо́ртка) *жан.* Калітка. Ну і фо́ртку зрабі́лі, як захо́чаш к ім зайсьці ў ха́ту, дык і не зо́йдзеш, бо фо́ртку не адкры́еш. *Р. Ч.*

ФУЛІГА′Н (фулігáн) *мужч.* Хуліган. Фулігáн гэ́ты нарабі́ў бра́згалак і ні дава́ў спаць усю ноч. *Кам.*

Х

ХАБАТНЯ′ (хабатня́) *жан., зневаж.* Рот. Закры́й сваю́ хабатню́, хва́ціць ужэ крыча́ць. *Уж.*

ХАВА′ЦЬ (хава́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Гадаваць. Цяшка было́ хава́ць дзяцей, але як падняліся на но́гі, то і пайшлі ў сьвет. *Пуз.*

ХАВА′ЦЬ (хава́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Трымаць. Цяпе́р вот і не хава́ем бо́лі каро́вы. Сто́лькі растра́т яна нам прыно́ся. *Бяс.*

ХАДА′К (хада́к) *мужч.* Лапаць. Дзет калісьці ў хадака́х хадзіў, а я дак і ня ба́чыў. *Даўг.*

ХАДАЛА′ (хадала́). Ходу. Ішоў я рас ве́чарам гэ́так бе́рагам. Тады́ чу́ю: не́хта бяжы́ць за мно́й, так вот, як ко́шка, ска́ча. Паглядзе́ў — вы́дра. Я схапі́ў па́лку ды агрэ́ў па ёй. Вы́дра пакруці́лася, пакруці́лася і апя́ць ка мне. Я — хадала́, чуць атвяза́ўся ат яе. *Белар.*

ХАЛАДЗЁ′НКА (халадзёнка) *жан.* Халодная вада ў лазні. Ле́на, дачу́шка, нанасі́ вады́ у ла́зьню на халадзёнку. *Хац.*

ХАЛА′Т (халат) *мужч.* Паліто. Увайшо́ўшы у ха́ту, ён ски́нуў халат,— так называ́юць у нас пальто́. *Кам.*

ХАЛЁ′РНЫ (халёрны) *прым.* Дрэнны чалавек. Не́кая халёрная брыгадзі́рша сёлета у нас. *Кам.*

ХАЛУ′ПА (халу́па) *жан.* Невялічкая хата. Залёс у тую халу́пу ды сядзіць, ні выла́зя. *В. В.*

ХА′ҚАЦЬ (ха́каць), -ю, -еш; *незак. тр.* Зяваць. Не́шта цэ́лы дзень сёньня ха́каецца. *Ліс.*

ХАНАБЭ′РЫСТЫ (ханабэ́рысты) *прым.* Фанабэрысты. Дзірэ́ктар быў чалаве́к ве́льмі ханабэ́рысты, ні с кім ня гаварыў і зь ім ніхто́ ня гаварыў. *Р. Ч.*

ХАНЖА′ (ханжа́) *жан.* Неперагнаная другі раз самагонка. Ён жа ня піў ханжу́, таму́ і цьвяро́зы. *Пал.*

ХАРАШО′ (харашо́) *прысл.* Добра. Харашо́, што ты прышла́. а то я хаце́ла к табе́ ісьці. *В. В.*

ХАРАШЭ′Й (харашэ́й) *прысл.* Лепш. Яна ко́жную суббо́ту дадо́му прыязджа́ла, бо до́ма харашэ́й. *В. В.*

ХАТУ′ЛЬ (хату́ль) *мужч.* Клунак. Зьвяза́ла я ў хату́ль ямv са́мыя ну́жныя рэ́чы, і ста́лі мы чака́ць. *Кл.*

ХАЎРУ′СНІҚ (хаўру́снік) *мужч.* Дружбак. Было́ на

на́шым канцы́ ве́скі чаты́ры Ко́лі і ўсе хаўру́сьнікамі былі́. *Кук.*

ХАХЛУ′ХА (хахлу́ха) *жан.* Курыца, якая водзіць куранят. Хахлу́ха така́я дрэ́нная была́, я ў по́грап садзі́ла, і вадо́й мачы́ла, так цяпе́р няхай сядзіць навя́зана, а яны малёнькі, шко́ды не ро́бяць. *Р. Ч.*

ХВАМІ′ЛЛЯ (хвамі́льля) *жан.* Прозвішча. Хвамі́льля у яго́ вельмі рэ́ткая, незвы́кная — Наттачы́лкін. *Узгур.*

ХВАНДО′ЎКА (хвандо́ўка) *толькі мн.* Зборкі. Я Ве́раччы сіні́ла суке́начку ў хвандо́вачкі. *Р. Ч.*

ХВАРСУ′Н (хварсу́н) *мужч.* Фарсун. Нос вы́церці не умее. а ўжо хварсу́н. *Ліс.*

ХВАРТУ′Х (хвартух) *мужч.* Фартух. Хвартухо́м падпяражы́ся. *Ліс.*

ХВА′НДЫ (хва́нды) *толькі мн.* Зборкі. Сёньня малады́я вы́скія суке́нкі но́сяць, а даўне́й, чым больш хва́нда́ў было́, тым харашэ́йшая суке́нка. *Кам.*

ХВА′РБА (хва́рба) *жан.* Фарба. Хва́рба така́я ў па́чках была́. *Кам.*

ХВА′ЦКІ (хва́цкі) *прым.* Прыгожы. Сусе́цкі сын такі́ хва́цкі хло́пяц стаў. *Пуз.*

ХВАШЧАНКА (хвашча́нка) *жан., бат.* Пырнік. Палю́, дзе́тачкі, палю́, рву гэ́ту хвашча́нку, а яна ўсё есь. *Р. Ч.*

ХВІРА′НКІ (хвіра́нкі) *адз.* хвіранка. Фіранкі. За́ра такія прыго́жыя хвіра́нкі ве́шаюць на во́кна, даўне́й е́тага не было́. *Р. Ч.*

ХВО′РТКА (хво́ртка) *жан.* Фортачка. Ла́стаўка ў хво́ртку ўляце́ла. *Ліс.*

ХЕ′ЎРА (хе́ўра) *жан.* Талака. По́йдзем се́ньня з дачко́й у хе́ўру рабіць к сваякам. *Гіл.*

ХЛЕБ (хлеп) *мужч.* Збожжа. Трэ́ба хлеп убра́ць, а то як по́йдуць дажджы́, дык пагніе́. *Кам.*

ХЛЕ′БНІК (хле́бнік) *мужч.* Карміцель. Як пастарэ́ю, сіл не бу́дзе, працава́ць не змагу́, то хле́бнікам сын бу́-

дзе: малóга я кармíў яго, а у стáрасці хай ён кóрміць. *Граб.*

ХЛЯБО́К (хлябóк) *мужч.* Скарынка. Мае дзéці увесь хлябóк абдзярýць, а мя́кіш не ядýць. *Р. Ч.*

ХЛІ́ПАЦЬ (хлíпаць), -аю, -еш; *незак. тр.* Піць. З рэ́ткімі звы́чкамі іх Пéця: вадý як пачнé хлíпаць, бы у кадýшку лье. *Граб.*

ХЛУ́ДЗІНА (хлýдзіна) *жан.* Палка. Вазьмí хлýдзіну ды ганí карóву на пóле. *Р. Ч.*

ХЛЫ́СНУЦЦА (хлы́снуцца) -у-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Ударыцца. Глядзí ні хлысьніся лóбам. *Ліс.*

ХЛУСТ (хлуст) *мужч.* Ссечанае дрэва з абцярэбленым суччам. Толькі тра́ктар мóжа вы́цягнуць гэ́тулькі хлустóў. *Чыж.*

ХРАПО́ТНІК (храпóтнік) *мужч., бат.* Капытнік. Ранéй хадзíлі рвáлі храпóтнік і канéў кармíлі. Зараз не рвем храпóтніку. *Р. Ч.*

ХРЫПАНУ́ЦЬ (хрыпанýць), -у, -еш; *зак. тр.* Выспацца. Хрыпанýў дык хрыпанýў: сóнца з абéдзьдзя даўно павярнýла. *Ліс.*

ХУ́ЖА (хýжа) *прысл.* Горш. Яму было с кóжным днём усё хýжа і хýжа. *В. В.*

ХУ́ЖЫ (хýжы) *прысл.* Горш. Пашлá зáмуш і тагó хýжы стала. *Бар.*

ХУ́РА (хýра) *жан.* Павозка. Ранéй ся́дзеш на хýру і паéдзеш у гóсьці, а цяпéр éдуць на мацыклéтах і лісафэ́тах. *Р. Ч.*

ХУ́РА (хýра) *жан.* Параконны воз. На хýры і нáшы з поля éдуць. *Р. Ч.*

ХУСЦІ́НА (хусьцíна) *жан.* Хустка. Калí жанíх і нявéста панарáвяцца адно́ аднаму́, дагавóрваюцца, каб зóлата кóлькі-нéбудзь, каня́, авéчку, прасьцíны, хусьцíны і рóзнае, што патрэ́бна ў прыдáным. *Баг.*

ХУТ (хут) *мужч.* Зруб. У нáшым калóдзежы такí стары́ хут, што вось-вось абвáліцца, трэ́ба пабудавáць нóвы. *Кук.*

Ц

ЦАБЭ́РАК (цабэ́рак) *мужч.* Невялікі цэбар. Іспа́рце каро́ві се́чку ў цабэ́рку. *Дук.*

ЦАГАНО́К (цаганок) *мужч.* Чыгунок. Пае́дзім на начле́х, дак ён я́ек набе́рыць, цаганок во́зьмець, нава́рым я́ек на начле́зе, паядзе́м — і весяле́й. *Мік.*

ЦАГА́НЧЫК (цага́нчык). *Гл.* цаганок. Бабу́ля ў печ цага́нчык з бу́льбай паста́віла, ты паглядзі́, а я тэж зь ёй пайду́. *Пап.*

ЦАГЕ́ЛКА (цаге́лька) *жан.* Цаглінка. Як ідзе́ш на го́рку — там быў пала́ц, цаге́лькі і цяпе́р бадзя́юцца там. *Вішн.*

ЦАРА́Н (цара́н) *мужч.* Вялікі камень. Цараноў навазіў тра́ктарам падмуро́ўку рабіць. *Р. Ч.*

ЦВІКЛО́ВЫ (цьвіклóвы) *прым.* Сталóвы (бурак). Усяля́кага сяго́дня было́ насе́на: і цьвіклóвых бурако́ў, і быдля́чык, і агурко́ў, і мо́ргавы, і кручкі. *Яц.*

ЦВІ́ЧЫЦЬ (цьві́чыць), -у, -ыш; *незак. тр.* Павучаць, прывучаць. До́бра цябе́ яшчэ тро́ба цьві́чыць, кап чалаве́кам стаў. *Зап.*

ЦВЯЛІ́ЦЬ (цьвяліць), -ю, -іш; *незак. тр.* Дражніць. Што ты цьвялíш мяне́, я ж табе́ не саба́ка яка́я. *Бяс.*

ЦЕЛЯПА́ЦЦА (целяпа́цца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Цягаціа. Целяпа́ецца незнае́мы мне чалаве́к. *Ліс.*

ЦЕРАБЕ́ЖЫК (церабе́жык) *мужч.* Луг сярод лесу. Травы́ ма́ла каро́ві будзя́, хоць бы церабе́жак скасíў схадзíў. *Р. Ч.*

ЦЁ́РЛІЦА (цёрліца) *жан.* Цёрла. Канаплі́ пра́жаць на скавaро́дах перат по́лымям або́ су́шаць у пе́чы, а тады́ таўку́ць у сту́пя, се́яць на ро́шата. Тады́ ту́ю муку́, што палу́чыцца, труць у цёрліцы і зь яе ро́бяць верашча́ку. *Рад.*

ЦІСКІ́ (ціскі́) *толькі мн.* Пастка. Да до́брых ціско́ў абы мыш даткну́лася хоць хвасто́м, як яны ло́вяць яе. *Узгур.*

ЦМЫК (цмык) *мужч.* Прылада для складання сена. Чаму́ ты цмык ні ўзяла́, лепш было п складаць. *Кам.*

ЦО́ПНУЦЬ (цо́пнуць), -у, -еш; *зак. тр.* Схапіць нечакана. Ён мяне́ як цо́пнуў — аж дух заняло́. *Хал.*

ЦУД (цут) *мужч.* Гартэнзія. Ці палівáла ты сёньня цут? Не́шта зямля́ суха́я. *Мацкі.*

ЦУ́ПКАЯ (цу́пкая) *прым.* Старая жанчына, але яшчэ моцная. Бач, Пілíпіха яка́я ба́ба цу́пкая, стара́я, а ўсю бу́льму абматы́чыла. *Р. Ч.*

ЦУРБА́Н (цурба́н) *мужч.* Бервяно. Нам сёньня цурбаны́ на машы́не прывезьлі. *Ліс.*

ЦУ́ХЛІЦЬ (цу́хліць), -ю, -іш; *незак. тр.* 1. Ссаць. Аж гляджу́, а ён папяро́су цу́хліць. *Раўч.* 2. Знасіць адзенне да бляску. Ён ўсё жыццё́ цу́хліць адну сьві́тку, так і хо́дзіць у зацухлёнай. *Раўч.*

ЦЫБУ́Ґ (цыбу́к) *мужч.* Мундштук. І куру́ без цыбука́, не люблю́ гэ́тых цыбуко́ў. *Р. Ч.*

ЦЫБУ́ЛЬКА (цыбу́лька) *жан.* Нарцыс. Цыбу́лька ўжо ско́ра расьцьвіцé. *Кам.*

ЦЫГА́Н (цыга́н) *мужч.* Чыгун. Цыганé тваé на пéчы со́хнуць. *Ліс.*

ЦЫ́МУС (цы́мус) *мужч.* Страва з бручкі. Ну, ма́ці, тако́га цы́мусу даўно́ не вары́ла. *Раўч.*

ЦЫМЯНТО́ВЫ (цымянто́вы) *прым.* Зацэментаваны. Ні ме́ла я шчэ і дваца́ццаць гадо́ў, а ўжо цымянто́выя ако́пы ры́ла. *Кам.*

ЦЫНДУ́ЛЬ (цындýль) *мужч.* Баязлівец. Жыў у нас на тым канцы́ вёскі Міхаíл. Во ўжо цындýль быў. Век у лес адзíн ні паéдзя. *Р. Ч.*

ЦЫПКІ́ (цыпкí) *адз.* цыпка. Полкі ў лазні. Залéз я на цы́пкí, дык так напа́рыўся! За́раз і квасу до́бра вы́піць. *Луц.*

ЦЫРА́ТА (цыра́та) *жан.* Кляёнка. У нас стол засла́ны цыра́таю, вельма ж до́бра, мо́краю ану́чкаю сатрэ́ш і чы́ста. *Цял.*

ЦЫРУ́БІЛЬНІК (цыру́більнік) *мужч.* Бульбоўнік.

А-яй, цыру́більнік які́ паро́с, бу́льбы не бу́дзя. *Р. Ч.*

ЦЫ́ТРА (цы́тра) *жан., абраз.* Злая жанчына. Вунь сядзі́ць цы́тра та́я, во́чы аж блішча́ць ад зло́сьці. *Цяр.*

ЦЭ́ТЛІК (цэ́тлік) *мужч.* Квітанцыя. А ты мне цэ́тлік дай, што я здала́ хлеп. *Уж.*

ЦЮ́КНУЦЦА (цю́кнуцца), -у-ся, -еш-ся; *зак. тр.* Сутыкнуцца, стукнуцца. Сёньні на ву́ліцы з брыгадзі́рам пра́ма ў галаву́ цю́кнуліся. *Р. Ч.*

ЦЮ́ПКІ (цю́пкі) *толькі мн.* Цура. На вячэ́ру нічо́га вары́ць не бу́ду, зьядзім цу́пак. *Чар.*

ЦЮЦЮ́НЬ (цюцю́нь) *мужч.* Тытун. У етым го́дзе сто́лькі цюцюню́ насадзі́лі. *Р. Ч.*

ЦЯНЯНЁ́ХАЦЦА (цянянёхацца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Нянчыцца. Ко́лькі ты бу́дзеш ужо з ім цяня́нёхацца, вялі́кі такі́. *Н. К.*

ЦЯ́ПКА (ця́пка) *жан.* Матыка. Пасьля́ абе́ду ўзяла́ ця́пку, ды й пайшла на сваю́ паласу́ бу́льму апко́пваць. *Кук.*

ЦЯПЛІ́ШЧА (цяплішча) *ніяк.* Вогнішча. Ко́жны ве́чар яны́ зьбіра́ліся ка́ля цяплішча: вары́лі е́сьці, грэ́ліся, гаварылі, а хто сядзе́ў бліжэ́й — той драма́ў ад цяпла́, што ішло́ ад вуга́лля. *Меж.*

ЦЯРУ́ШКА (цяру́шка) *жан.* Пацяруха. Дзе́ці нацяга́лі сало́мы, цяру́шкі гэ́тае насы́палі па ха́це (даўне́й жа матра́цаў гэ́тых ні было́, сало́му кла́лі на карва́ць), дак я на дзяце́й кажу́: «Сало́му што́ пацьцерусі́лі на ха́ця?» *Зап.*

ЦЯРЭ́ШНЯ (цярэ́шня) *жан.* Чарэшня. У Мі́нску на база́ры ўсяго́ мно́га: і ві́шні, і царэ́шні, і памідо́ры, і я́блыкі. Но е́та, наве́рна, усё́ ці с Украі́ны, ці с цёплай страны́ яко́й. *Бяс.*

Ч

ЧАВУ́Н (чаву́н) *мужч.* Чыгун. Пяць чавуно́ў карто́шкі зварыла і ўсё ма́ла. *Р. Ч.*

ЧАГО′СЬ (чагóсь) *часц.* Чагосьці. Чагóсь гэ́та твой сябра прыхóдзіў? *Узгур.*

ЧАЛАВЕ′К (чалавéк) *мужч.* Муж. Пачака́йце, за́рас мой чалавéк пры́дзе. *Кам.*

ЧАЛЕ′СНІК (чалéсьнік) *мужч.* Куток каля печы, дзе стаяць вілкі, качарга, чапяла і іншае хатняе начынне. А′лка, чагó ты сьмéцьце ўсё ў чалéсьнік зьмята́еш? Ба́чыш, ужо скóлькі яго там сабра́лася, глядзі́, скóра і мы́шы мóгуць завясьці́ся там. *Бяс.*

ЧАЛЯ′ДНІК (чаляднік) *мужч.* Шавец. У майгó сусéда ранéй ба́цька чаляднікам быў, спра́ўныя бóты рабіў. *Кам.*

ЧАМО′Т (чамóт) *мужч.* Невялікае памяшканне, дзе захоўваецца ежа. Усё ядзёнае мы ў чамóт ста́вім. *Р. Ч.*

ЧАПЯЛЯ′ (чапяля́) *жан.* Чапяла. Вазьмі́ скавараду́ чапялёй, а не ану́чай. *Р. Ч.*

ЧАПА′ЦЬ (чапа́ць), -ю, -еш; *незак. тр.* Чапляць. Укі́нім у ніт, а тады ўкі́нім у бе́рда, тады́ чапа́ім гэ́тыя ніты́, а ўні́зе панажы́. Скóлькі нітóў, тóлька панажóў чапа́ім: чаты́ры ніты́, чаты́ры панажы́. *Пап.*

ЧАРАНО′К (чаранóк) *мужч.* Качарга. Ты бы хоць чаранкóм вугаль сь пéчы вы́грабала, ды пóтым кубéлак прынéсла. *Крок.*

ЧАРО′ДЗЬ (чарóць) *жан.* Чарга. Станові́ся ў чарóць, а я гля́ну, што даюць. *Меч.*

ЧАРПА′ХА (чарпа́ха) *жан.* Чарпак. А ў на́шай бабу́лі чарпа́ха яшчэ спры́тна ў рука́х хо́дзіць. *Даўг.*

ЧАРЭ′МУХА (чарэ́муха) *жан.* Чаромха. У міне́ ў гарóччыку чарэ́мухі мнóга расьце́. *Кам.*

ЧАРЭ′ННЕ (чарэ́ньне) *ніяк.* Чарэнь. Ну чагó ш ты залéз на чарэ́ньне, кап спаліцца? А тады пла́каць бу́дзеш, што балíць. *Р. Ч.*

ЧАУСО′ЧАК (чаусóчак) *мужч.* Чыгунок. Ху́тка вы́хапі чаусóчак сь пéчы, зварылася ўжо бу́льба. *Кузьм.*

ЧАТЧАВІ′К (чатчавік) *мужч.* Падабабак. Чатчавікóў у гэ́тым гóдзе — зьбірай не зьбярэ́ш. *Бяс.*

ЧВЬІР (чвыр) *мужч.* Жвір. Двор бе́лым чвы́рам па́сыпалі, а шу́лы ўсе пагну́лі і варо́ты ця́шка атчыня́юцца. *Заям.*

ЧО′ВЕНЬ (чо́вень) *мужч.* Човен. Каля́ нас бліска рэ́чка, у вадзе́ заўсе́ды стаяў чо́вень, дык дзе́ці нікО́лі не сядзе́лі до́ма, бра́лі чо́вень і пла́валі. *Р. Ч.*

ЧО′РНЫ (чо́рны) *прым., перан.* Брудны. Ой, дзе́вачкі, я, му́сіць, чо́рная, трэ́ба пайсьці́ памы́цца. *Кам.*

ЧО′РНЫЯ (чо́рныя) *субст. прым.* Карнікі. Прые́дуць гэ́тыя чо́рныя ў ве́ску, дык лю́дзі праз вакно́ ўцяка́юць у лес. *Кам.*

ЧО′РНЫЯ Я′ГАДЫ (чо́рныя я́гады). Суніцы. У нас чо́рныя я́гады ў анны́м баку́, а кра́сныя — у другім. Дале́ка тро́хі, пра́ўда, туды пат пія́не́рскі ла́гер. *Бяс.*

ЧУРБА′Н *мужч.* Бервяно. Сёньня апо́шні чурба́н разрэ́залі, а больш палі́, чым хо́чаш. *Кам.*

ЧУКМЭ′РЫЦЬ (чукмэ́рыць), -у, -ыш; *незак. тр.* Гатаваць ежу. Я, бывала, як ста́ну чукмэ́рыць ядУ́, дык кручу́ся каля пе́чы часы́ два. *Чар.*

ЧУ′НІ (чу́ні). Вяровачныя лапці. Чу́ні зь вяро́вак былі́ вельма мо́цныя. *Р. Ч.*

ЧУ′РКА (чу́рка) *жан.* Шула. Трэ́ба чу́рку памяня́ць, а то варо́та пава́ляцца ско́ра. *Р. Ч.*

ЧУ′СЫ (чу́сы). Гумовыя боты. Чу́сы ро́бяцца з рызі́ны, яны ве́льма мо́цныя, зно́су нямА́. *Р. Ч.*

ЧЫКІЛЬДА′ (чыкільда́) *агульн.* Кульгавы чалавек. Вы́шла за́муж называ́ецца за каго́, а мужы́к — чыкільда́ гэ́тая: як ідзе́, так і высту́квае дзераві́шкай — руб дзе́сяць. *Узгур.*

ЧЫКРЫ′ЖЫЦЬ (чыкры́жыць), -у, -ыш; *незак. тр.* Рэзаць. Чыкры́ш хлеп, абе́даць бу́дзем. *Ліс.*

ЧЫ′ЛЫ (чы́лы) *прым.* Незнаёмы. По́зна но́ччу не́хта пасту́каў у вакно́, а калі дзьве́ры аччыні́ла, уба́чыла чы́лага чалаве́ка. *Хал.*

ЧЫ′ЛЫЯ ЛЮ′ДЗІ. Чужыя людзі. У чы́лых людзе́й не так, як до́ма. І не вы́сьпіся, і не аддыхне́ш. *Кук.*

ЧЫМЕРГЕ′С (чымергéс) *мужч.* Салат з гуркоў, цыбулі, запраўлены смятанай. Нарві цыбýлі і гуркоў, зрóбім чымергéс на абéт. *Р. Ч.*

ЧЫМЕРГЕ′С (чымергéс) *мужч.* Настойка бярозавай кары. У гарóлку кладýць бярóзавую карý і гэ́та чымергéс завéцца. *Р. Ч.*

ЧЭ′МЕР (чэ́мер) *мужч., бат.* Ядавітая лугавая расліна. Кап ты чэ́меру наéўся! *Уж.*

ЧЭ′ПЧЫК (чэ́пчык) *мужч.* Шлём. Чэ́пчыкі насаджáлі на галóвы і сядзя́ць на матацы́клах. *Ліс.*

ЧЭ′РАЙ (чэ́рай) *мужч.* Фурункул. Такí ўжо чэ́рай гарáчы, ні дакранýцца. *В. В.*

ЧЭ′РСТВЫ (чэ́рствы) *прым.* Чарвівы. У гэ́тым гóдзе нéкія чэ́рствыя я́блыкі, бо вялíкая суш усё лета стаíць. *Кам.*

Ш

ШАМК′І (шамкí) *толькі мн.* Бразготкі. Як жаніўся мой брат, та такія шамкí звóнкія. *Р. Ч.*

ШАЙМО′РЫ (шаймóры) *толькі мн.* Мёрзлая бульба. У вайнý мы бéдна жылí. Дзяцéй было мнóга. Кап пракармíць іх, за сем кіламéтраў хадзілі шаймóры капáць, кап тóлькі пражы́ць. *Бяс.*

ШАЛУ′ЦЬКА (шалýцька) *агульн., неадабр.* Неахайны чалавек. Ну ш і шалýцька ты, нóвы лéтнік, а ўжо і дзю́рку прарвáў. *Борк.*

ШАЛУ′ПКІ (шалýпкі) *толькі мн.* Лупіны. Трэ́ба намы́ць карóве шалýпак. *Р. Ч.*

ШАЛЯНО′ЎКА (шалянóўка) *жан.* Вялікая шарсцяная хустка. А якáя ш харóшая шалянóўка былá, але парвáлася. *Кам.*

ША′НЬКА (шáнька) *жан.* Торба. Пакладзí ў шáньку яды́, бýдзем у лéсе дóўга-дóўга, а там апеты́т знáеш якí. *Узгур.*

ША′ПКА (шáпка) *жан.* Верх над вугламі дзвярэй.

Так сту́кнулася ло́бам ап ша́пку, што і́скры з вачэ́й пасы́палі́ся. *Р. Ч.*

ШАПЯЛЯ́ТЫ (шапяля́ты) *прым.* Шапялявы. Вунь пайшо́ў Дані́ла шапяля́ты, ня лячы́лі, так і заста́ўся. *Папл.*

ШАПЯТЛІ́ВЫ (шапятлі́вы) *прым. Гл.* шапяляты. Ен нічо́га хлапе́ц, але тро́шкі шапятлі́вы. *Кальч.*

ШАРАВА́РКА (шарава́рка) *жан.* Абавязковыя работы па ўпарадкаванню дарог. Пры По́льшчы на шарава́рку гна́лі. *Цяр.*

ШАРАХО́НІЦЦА (шарахо́ніцца), -ю-ся, -іш-ся; *незак. тр.* Ганарыцца. І чаго́ то́лькі так шарахо́ніцца, і ў другі́х дзе́ці ву́чацца не горш, пяцёркі прыно́сяць, а каб хоць хто хвалі́ўся. Не, маўча́ць. *Узгур.*

ШАРВА́РКУ АДРАБЛЯ́ЦЬ. Працаваць абы-як. Ро́біць, усё роўна як шарва́рку адрабля́е. *Уж.*

ШАРПА́НКА (шарпа́нка) *жан.* Саматканая дарожка з тоўстай пражы. Даўне́й у мяне́ была́ самадзе́лачная шарпа́нка, вось до́ўга ляжа́ла, і зно́су ёй не было. *Р. П.*

ШАРСТУ́Х (шарсту́х) *мужч.* Спадніца ў зборку. Абула новыя вятру́фкі і шарсту́х надзе́ла но́вы, у кіно́ зьбіра́ецца. *Борк.*

ШАРУДЗІ́ЦЦА (шарудзі́цца), -дж-у-ся, -дз-іш-ся; *незак. тр.* Збірацца, прыбірацца. Шарудзі́цеся, дзе́ўкі, вечары́нка пычына́ецца. *Ліс.*

ШАРШО́ТКА (шаршо́тка) *жан.* Іголка вялікіх памераў. Не ме́ўшы шаршо́ткі, ко́ўдры не пашы́ем, бо гэ́тымі іго́лачкамі на́ват не праткне́ш навылёт. *Узгур.*

ШАРХУ́БЛІК (шарху́блік) *мужч.* Гэблік. А ты яго шарху́блікам, а тады́ ву́равень прыста́ў, ці ро́ўны. *Р. Ч.*

ШАСТАКО́Л (шастако́л) *мужч.* Частакол. Абгарадзі́ла я шастако́лам уве́сь агаро́д, а то чужы́я ку́ры ла́зілі. *Р. Ч.*

ШАТЫ́НКА (шаты́нка) *жан.* Сацін. Прыве́зьлі ў магазі́н ду́жа краси́вую шаты́нку. Трэ́ба бу́дзя на пла́цьце набра́ць. *Бяс.*

ШАФА′РЫК (шафа́рык) *мужч.* Шкафчык. Пайшла́ жаць, а ўну́ку сказа́ла: «Загані́ каро́ву і палу́днуй сам. Хлеб з ма́слам ляжы́ць у шлябане́, по́ткалатка стаіць у пе́чы, малако́ ў шафа́рыку, а квас у скле́пі. Во́зьмеш с ха́ты ко́наўку і там нап'е́сься». *Кор.*

ША′ХВАРАСТ (ша́хвараст) *мужч.* Свавольнік. Ю′рак харо́шы хло́пчык, а Ка́зік — ша́хвараст, ні міну́ты не пасядзіць спако́йна. *Уж.*

ШАХЛА′ТЫ (ша́хлаты) *прым.* Шамкаючы. От, у е́тай ба́пкі зубо́ў нята́, так і вымаўле́ньне ў яе шахла́тае. *Луц.*

ШВА′БСКА (шва́бська) *жан.* Сподняя сарочка. У ма-ёй бабу́сі стара́я-стара́я шва́бська, а яна ўсё но́сіць яе. *Р. П.*

ШВІ′ДКІ (шві́ткі) *прым.* Хуткі. Не́йкі ш ве́льмі шві́ткі ўда́ўся ён. *Кам.*

ШВІНА′Р (швіна́р) *мужч.* Ліхтар. Запа́ліш швіна́р і ідзе́ш у хлеў. *В. В.*

ШВА′ЙНЯ (шва́йня) *жан.* Швейная фабрыка. Нявé-стка мая ў шва́йні і працу́я, до́бра зараблі́я. *Кам.*

ШВІ′ЛЬНАЯ (шві́льная) *субст. прым.* Швейная майстэрня. А по́шля Ве́ры ў нас Ка́зік быў брыгадзі́рам, з Залазо́ўя, гэ́ты, што жа́ніўся з маладо́й, два́ццаць год маладзе́йшай за яго́. Маладо́й, краси́вай, чы́стай, бяля́вай, што ў Гро́дні ў шві́льнай рабі́ла. *Зал.*

ШВЭ′ДА (шве́да) *жан.* Світэр. Мая ш ты наўчы́цялька, знаю я магазы́нныя шве́ды. Як адзе́ла я Стэ́фчыну, была́ як го́лая — нічо́га яна ні грэ́іць. Дзе ш яна бу́дзіць грэ́ць, калі ні́тачкі це́нінькія. *Фал.*

ШКА′ЛІК (шка́лік) *мужч.* Конаўка. Цяпе́р нявéстка ўсё кру́шка завé, а я па-даўне́йшаму — шка́лік. *Р. Ч.*

ШКАПЕ′Ц (шкапе́ц) *мужч.* Кастрыраваны баран ці казёл. Наш шкапе́ц у по́ле с ко́замі пайшо́ў. *Калод.*

ШКЕ′РЫЦЬ (шке́рыць), -у, -ыш; *зак. тр.* Патрашыць рыбу. Се́ньня на́шы хло́пцы налавілі ры́бы, аддалі́ дзяўча́там на ўху́, яны сядзя́ць і шке́раць яе. *Р. Ч.*

ШЛЁ′ГАЦЬ (шлёгаць), -аю, -еш; *зак. тр.* Біць пугай. А ён сабе́ шлёгае каро́ву ды шлёгае, аж я і пу́гу забра́ў. *Гіл.*

ШЛЫ′НДАЦЬ (шлы́ндаць), -ю, -еш; *незак тр.* Хадзіць туды-сюды. Што гэ́та за лю́дзі тут увесь час шлы́ндаюць каля вако́н: то́лькі ішлі к млы́ну, а цяпе́р аттю́ль. *Меж.*

ШЛЯБА′Н (шлябан) *мужч.* Драўляная скрыня, якая служыць за шафу. Альбі́на, дачу́шка, занясі́ сьнеда́ньне ба́цьку, усё стаіць у шлябане́. Нальёш пля́шку малака́, атрэ́жаш лу́сту хле́ба, с патэ́льні вазьмі́ са́ла з дра́нікамі і гэ́та ўсё складзі́ ў то́рбу і занясі́ ба́цьку. *Кор.*

ШЛЯ′ЦЦА (шля́цца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Хадзіць туды-сюды без справы. Цэ́лы дзень се́ньня па ву́ліцы шля́ўся. *Кам.*

ШМАЦЦЯ′НКІ (шмацьця́нкі) *толькі мн.* Палавікі, вытканыя з ануч. От цяпе́р до́бра, ня трэ́ба ткаць шмацьця́нак, пайшо́ў ды за рубле́ў 5 харо́шыя палавікі ку́піш. *Бяс.*

ШМЭ′РГАЦЬ (шмэ́ргаць), -ю, -еш; *незак. тр.* Піла-ваць дровы. Надае́лі мне гэ́тыя дро́вы, цэ́лы ш дзень шмэ́ргалі. *Кам.*

ШНУРО′ЎКА (шнуро́ўка) *жан.* Світка без рукавоў. Пайду́ сваю́ шнуро́ўку надзе́ну, бо халаднава́та ў пле́чы ста́ла. *В. В.*

ШНЫ′ПАРЫЦЬ (шны́парыць), -у, -ыш; *незак. тр.* Шукаць, хадзіць. І чаго́ гэ́та брыгадзі́рка тут цэ́лы дзень шны́парыць? *Кам.*

ШНЫРО′ЎКА (шныро́ўка) *жан.* Безрукаўка. Адзень маю шныро́ўку ды ідзі сьме́ла гуля́ць. Ране́й то́лькі і адзява́лі е́тыя шныро́ўкі. *Р. Ч.*

ШНЫ′РЫЦЬ (шны́рыць), -у, -ыш; *незак. тр.* Хадзіць туды-сюды, каб што-небудзь раздабыць. Гэ́тыя малы́я ўсё тут шны́раць, му́сіць, хо́чуць у сат улёсьці. *Уж.*

ШО′СЦІК (шо́сьцік) *мужч.* Шост. Ляжа́ў я ў го́сьпіталі — санато́ра была́ ра́ньшэ. А вараньё́ цэ́лы дзень га-

лаву́ шалóміць. А быў тут у нас адзін верхалáс, зрабíў ён шóсьцік мéтраў шэсь і паспóрваў усе гнёзда. *Р. Ч.*

ШПА′РЫ (шпáры) *толькі мн.* Выемкі паміж бярвеннямі. Шпáры пазамáзваў глíнай, а цяпéр бýду выклéйваць абóямі. *Чар.*

ШПА′РЫЦЬ (шпáрыць), -у, -ыш; *незак. тр.* Ісці хутка. Глень, хто гэ́та там так шпáрыць каля лéсу? *Узгур.*

ШПАКО′ЎНІЦА (шпакóўніца) *жан.* Шпакоўня. Павéсіў на кóжную бярóзу па шпакóўніцы. *Ліс.*

ШПАНЕ′ (шпанé) *ніяк.* Шпана. Дзіця малое (у жартоўным тоне). Не лезь, шпанé, не ў сваé: сядзі і гуляй са сваíмі цáцкамі. *Граб.*

ШПІГІНА′Р (шпігінáр) *мужч.* Шкіпідар. Натры́ дзіця́ці гру́дзі шпігінáрам, цяплéй стáне, кроў разы́йдзецца па цéле, лягчэ́й бýдзя. *Войр.*

ШУ′ЛА (шýла) *ніяк.* Будынак, куды складаюць торф. Мы капáлі торф, цáла шýла яшчэ́ ё, а сын дроў прывёс. І мне бýдзе на дзьвé зімé. *Р. Ч.*

ШУ′ЛЛЕ (шýльле) *ніяк.* Адлегласць паміж слупамі. Ну які́ ш ты салдáт, калі не мóжаш прабéгчы да шýльляў? *Р. Ч.*

ШУЛО′ (шулó) *ніяк.* Шула. Гэ́та шулó ўжэ пачалó хістáцца, трэ́ба нóвае стáвіць. *Кам.*

ШУМЕ′ЦЬ (шумéць) *незак. тр.* Брадзіць. Настóйку пастáвіла, сáхару мнóга нáда, есьлі меньш палóжыш, дык яна шумéць бýдзя, плахáя бýдзя. *Бяс.*

ШУ′ПЕЛЬ (шýпель) *мужч.* Шуфель. Ідзі к сусéтцы шýпель папрасí, бо бýльбу зграбáць трэ́ба. *Р. Ч.*

ШУ′СЫ (шýсы). Глыбокія галёшы. На дварэ́ сёньні мóкра, шýсы нáда надзéць. *Р. Ч.*

ШЧА′ВІЛЬ (шчáвіль) *мужч.* Шчаўе. Ну і багáта тут разраслóся кóньскага шчáвілю. *Меж.*

ШЧАДРЭ′Ц (шчадрэ́ц) *мужч.* Вéчар пад Нóвы год. А мы на шчадрацá варажы́ць бýдзем. *Уж.*

ШЧАЛУГА′ЦЬ (шчалугáць), -аю, -еш; *незак. тр.* Лушчыць. Сухíя струкí дык і дóбра шчалугáць. *Пільк.*

ШЧАКЕ′Т (шчакéт) *зборн.* Агароджа з дошак. Патрэ́бна пастáвіць шчакéт, а то старáя агарóджа згнілá, уся правалíлася ўшчэ́нт. *Узгур.*

ШЧАНЬ (шчань) *мужч.* Вялікая кадушка. У бáцькі майгó было сямéра дзяцéй. Бывáла, як насóлім цэ́лы шчань гуркóў на зімý, яшчэ й да вясны́ цягнуцца. *Бяс.*

ШЧАРБЯЛІ′ (шчарбялí) *толькі мн.* Дзіравыя зубы. Нéйкіх пяць шчарбялéў сядзíць яшчэ́ ў póце. *Кам.*

ШЧА′ЎЛІК (шчáўлік) *мужч. Гл.* шчавіль. Ты хоць схалзí шчáўліку назьбірáй, увы́кла, што ўсё мáці ды мáці. *Буз.*

ШЧУПАКО′ЎКА (шчупакóўка) *жан.* Спінінг. «Глянь, глянь, якую пацáн вы́цягнуў».—«Ён на шчупакóўку».—«Дак можа і ты п на шчупакóўку папрóбуваў?»—«Я дык ня вéльмі люблю́ на шчупакóўку, круцí да круцí, а як заблы́таецца жы́лка — сядзí». *Белар.*

ШЧЫКЕ′Т (шчыкéт) *мужч.* Штакет. І каго́ ён так баíцца, увесь двор шчыкéтам абнёс. *Кук.*

ШЧЫ′РЫЦЬ (шчы́рыць), -у, -ыш; *незак. тр.* Выведваць што-небудзь. Ну пачакáй, я цябé нéкалі патпільнýю, калі ты ўсё шчы́рыш ды шчы́рыш. Нічóга за табóй ні прынясьцí нямóжна, ні зрабíць што. *Бяс.*

ШЧЫТО′К (шчытóк) *мужч.* Невялікая печка ў пакоі. Люблю́ зімóй калі ў шчыткý дрóвы гараць, вéсела так. *Мац.*

ШЧЭ′ТКА (шчэ́тка) *жан.* Шчотка. Спачáтку трэ́ба лён часáць шчэ́ткаю, а пóтым грэ́бяням. *Дук.*

ШЫ′БКА (шы́пка) *прысл.* Хутка. Ого, як давéдаліся, што ханжá бýдзя, то шы́пка прышлí. *Пуз.*

ШЫДЭ′ЛАК (шыдэ́лак) *мужч.* Кручок для вязання. Трэ́ба шыдэ́лак купíць, бýду вязáць рукавíцы. *Цяр.*

ШЫКАВА′ЦЦА (шыкавáцца), -ю-ся, -еш-ся; *незак. тр.* Рыхтавацца, прыбірацца. На гóсьці шыкýюцца, éг′дзіў да сы́на, а зáрас сын прыéхаў. *Зап.*

ШЫ′ЛЬНІК (шы́льнік) *мужч.* Сасновыя іголкі. Дзе бацька? Шы́льнік зь лéсу вóзіць. *Нар.*

ШЫНКА'Р (шынка́р) *мужч.* Прадавец. Шынка́р каза́ў, што ў магазі́н мно́га чаго́ прывезьлі. *В. В.*

ШЫПЕ'ЦЬ (шыпе́ць), -ю, -іш; *незак. тр.* Злавацца. Шыпі́ш цэ́лы дзень, як змяя́, і прычы́ны ж нямá, а ўсё бóмкаеш. *Узгур.*

Э

Э'ҚСТРЫННА (э́кстрынна) *прысл.* Тэрмінова. Загáд э́кстрынна вяртáцца назáт. *Меж.*

ЭЛЕҚТРО'ЎНЯ (электро́ўня) *жан.* Электрастанцыя. Электро́ўня ў на́шым калхо́зе невялі́кая, але сьве́ту мно́га дае́. *Уж.*

Ю

Ю'ШҚА (ю́шка) *жан.* Грубка. Прынясі́ дроў, ю́шку пратапіць трэ́бы, а то маро́с на двары́ вялікі. *Р. Ч.*

Я

Я'ВАР (я́вар) *мужч.* Аер. Усе́ бяраге́ абрасьлі я́варам. *В. В.*

ЯГА'ЦЦА (ягáцца) *незак. тр.* Брыкацца. У майго́ суседа карóва нейкáя дурнáя — на дзяцей ягáецца. *Р. Ч.*

Я'ГРУС (я́грус) *мужч.* Агрэст. Я'грусу наварыла? Чаму не? Ты́ ж ве́даеш, што я́ люблю́. *Сл.*

Я'ГРУСТ (я́груст). *Гл.* ягрус. Што там ро́біш? Я'груст жа яшчэ не пасьпеў. *Вішн.*

Я'ДЗЕРКА (я́дзерка) *заал.* Божая кароўка. Я'дзерка пакáзвае, калі бýдзе дождж, а калі пагóда. *Уж.*

ЯДУ'ХА (ядýха) *жан.* Ядок. Вот ядýха дык ядýха! Такáя няўклю́нная дзеўчы́на расьце́. Нямá каб зьéла й вы́лезла з-за сталá — панаве́шае, панакідае ўсю́ды. *Бяс.*

ЯЖГУ'Р (яжгýр) *мужч.* Ёрш. Наш Тáдзік у нядзе́лю прывёс кі́лі са тры. Прáўда, до́брай ры́бы было́ нямно́га,

пало́ва яжгуро́ў. *Ст. В.* Як прынясём яжгуро́ў цэ́лы ко́шык — на цэ́лы дзень рабо́ты. Шчэ й ру́кі апкрыва́віш, пако́ліш. *Сцеш.*

ЯЗЬВЕ′НЬ (язьвя́нь) *мужч.* Язьмін. Дык нарве́ця сабе́, дзяўча́ткі, язвяню́ букет. *Кам.*

Я′ЗЬМА (я́зьма) *жан. Гл.* Язвень. Вы́несі ты я́зьму ў пры́вен да дзьве́ры зачыні́, бо галава́ ж бале́ць ад яго. *Мац.*

Я′ЛАВІНА (яла́віна) *жан.* Неапрацаваная зямля, якая служыць пашай для жывёлы. Вунь калга́сны ста́так зь я́лавіны на фе́рму вяртаецца. *Кірк.*

Я′РАЙ (я́рай) *мужч.* Аер. Дзе ш ты сало́мы набярэ́шся? І я́рай на по́тсьціл ідзе́. *Чыж.*

ЯРА́ПЛА′Н *мужч.* Самалёт. Вы́ ш у на́с тут нядаўна, а на́м та́к надаку́чылі гэтыя яраплаиы. *Кам.*

ЯРЛЫЧО′К (ярлычо́к) *мужч.* Рэцэпт. До́ктар ярлычо́к вы́пісаў: трэ́ба ў апте́ку схадзіць, лека́рства пабра́ць. *Неж.*

Я′РУС *мужч.* Стос. На сталé я́русам стаялі талéркі і спо́ткі. *Р. Ч.*

ЯРШО′ЎКА (яршо́ўка) *жан.* Капронавая крышка. Гаспады́ня наліла́ малака́ ў ба́нку і закры́ла яршо́ўкай. *В. В.*

Я′ХА (я́ха) *жан.* Рэха. Та́к гры́мнуў, што́ аж я́ха пайшла́ па ўсём ле́сі. *В. В.*

ПРЫКАЗКІ, ПРЫМАЎКІ, ФРАЗЕАЛАГІЧНЫЯ СПАЛУЧЭННІ

Аблізáць пáльчыкі. *Цял.*

Адбівáць тýпікі. Нічога не рабіць. Хóпіць адбівáць тýпікі, пóйдзем працавáць. *Кам.*

Адрэ́заць слóўца. Сказаць рэзкае слова. Размаўля́лі, размаўля́лі, а пóтым ён як адрэ́заў рэ́скае слóўца, што самóму ямý сóрамна стáла і ён пашóў дамóў. *В. В.*

Аж нос у пры́сяткі ідзé. *Крок.*

А, сватóве-панóве, ці вы нас не вéдалі? *Бар.*

Бáча вóка далéка, а рóзум яшчэ́ дáлей. *Борк.*

Бíбікі біць. Б'е цэ́лы дзень бíбікі, а картóпля ні паганя́ная. *Цял.*

Біць у званы́. Аб гэ́тум ужó даўнó ўсё ў званы́ б'юць. *Цял.*

Бóўтаць мáсла. Біць масла. Я яшчэ́ ні бóўтала сéньня мáсла. *В. В.*

Браць у плéчы. Мерзнуць. Мяне́ нéшта сéньня вéльмі ў плéчы бярэ́. *В. В.*

Бýхаць, як у бóчку. Нáша цéтка нáтта ш прастудзíлася, цэ́лаю ноч бýхала, як у бóчку. *Цял.*

Вáлам ісьцí. Ісці вялікімі групамі адзін за другім па 30—40 чалавек. *Р. Ч.*

Вы́зваць на кавéр. Пагаварыць па душах, прачытаць мараль. *Луц.*

Вы́кацiць трубóй. Выгнаць. Калí самá не пóйдзяш, дык я цябé трубóй вы́качу. *Кам.*

Вы́ставіць лы́тку. І што ты, Гáнька, там рóбіш, усé дóма, хоць бы лы́тку куды́ вы́ставіла, ці ў клуп, ці на сяло́. *Бяс.*

Вы́сьці настóўніцай. Яна́ настóўніцай вы́дзя, як інстытýт скóнчыць. *Кам.*

Гнаць свет. Раней ён сьвет гноў у на́шай дзьвя́галцы. *Кам.*

Гаварыць, як ма́кам сы́паць. *Крок.*

Го́лы, як бізýн. Сьме́шны гэ́ты Ю′зік. Го́лы, як бізýн, а яшчэ́ задаѐцца. *Цял.*

Гульта́й за рабóту — мазóль за рýкі. *Крок.*

Гульта́й за пра́цу, мазóль за рукý. *Цял.*

Даганя́ючы ні нацалýяся. *Цял.*

Да гíбялі. Вельмі многа. У нас буякóў да гíбялі. *Дук.*

Дажы́ць да сівы́х валасóў. Дажы́ў да сівы́х валасóў, а ні паразумне́ў. *Цял.*

Даць джухара́. Ну і дала́ ш я се́ньня джухара́ свайму́ п'я́ніцу. *Кам.*

Даць пліту. Я ба́чыў, як ён даў пліту вунь у той бок. *Нав.*

Даць у каўнѐр. Як ажэ́ніцца, то дасць у каўнéр. *Кам.*

Даць у кóсьці. *Бяс.*

Дзе на́ша не прападала́, хай і тут ля́сьне. *Кірк.*

Для маéй душы́ усé харашы́. *Дук.*

Дóбры, хоць на ра́ны прыкладáй. *Кірк.*

Дýра сíлава. Вельмі дурная. *Карш.*

Е′сьці — аш трусíцца. *Крок.*

Забіва́е вóздух. Не хапае паветра, няма чым дыхаць. Забіва́я вóздух мянѐ ў гóрадзі, нямá чым ды́хаць. *Кам.*

Забіва́ць галаву́. Цяпéр малады́м галóвы забіва́юць, а нéкалі ніхтó ні вучы́ўся. *Кам.*

Забра́ць пад мятлý. Вѐльмі ця́шка было́ пасьля́ вайны́, бо ўсё пад мятлý забра́лі нéмцы. *Дук.*

Завéў шарма́нку зь вéчара да ра́нку. *Кірк.*

Загаварува́ць зýбы. Ты мне ні загава́рувай зýбы, а кажы́ прóўду. *Цял.*

Задра́ць нос. Задра́ў нос — і жэ́рткай не дастáнеш. *Кірк.*

Заéхаць, як Анэ́та ў Дарахí. *Кірк.*

Залажы́ць за га́льштук. Ані́ не глядзі́ць, што гро́шай нямá, залóжыць за га́льштук і хóдзіць, як ду́рань. *Бяс.*

Зачапля́ць за жывóе. «А ты ня руга́йся, змóўчы!»— «Не магу́ маўча́ць, калі́ мяне́ зачапля́юць за жывóя». *Белар.*

Збыць з галавы́. *Бяс.*

Зрабíў — каму́ нага́, каму́ галава́. *Кірк.*

Зрабíць у галаве́. Зрабíў гэ́та я ў галаве́, ды пайшóў да́лей. *Сак.*

З усíх ног. Паліца́й заўва́жыў хлóпца і пача́ў страля́ць па ём, а той з усíх нох кíнуўся ў лес. *Кам.*

Зямлёй абярну́цца. Але́ ш яна́ вось цябе́ ўсё скубе́ і скубе́. І што ёй ат цябе́ трэ́ба? Глядзíш, мо сама́ яна́ ско́ра зямлёй абе́рнецца, калí на тваю́ зямлю́ паква́пілася. *Бяс.*

Ісцí, як серада́ на пя́тніцу. *Кірк.*

Кóжнаму адно́ ле́та. Усім пароўну. Бач во, як рабíць, дык ра́зам з íмі, а як уча́стак — дык асóбна, ім ле́пшы. А хíба ш так трэ́ба. Кóжнаму адно́ ле́та — патрэ́бна ўсё ра́зам дава́ць. *Бяс.*

Кама́р прыбíў. Кволы, слабы. *Луц.*

Камары́ куццю́ таўку́ць. *Кірк.*

Кóсьці абмыва́ць. *Цял.*

Кроў з нóса ка́пай. Сéньня зрабí, хоць кроў з нóсу ка́пай, а зрабí. *Цял.*

Крыча́ць на чым свет стаíць. Чаго́ ты крычы́ш на чым сьвет стаíць? *Цял.*

Крычыць, як каза́ ў Му́нькі на гары́. *Раўч.*

Ла́ецца, як ціціха. *Раўч.*

Лы́нды біць. Мой хло́пяц цэ́лы дзень лы́нды б'е, што зь яго́ бу́дзе, не ве́даю як прывучы́ць да рабо́ты. *Р. Ч.*

Ляце́ць, як з гары́ ўніс. Як усы́палі яму на схо́дзі, дак ляцéў дадóму, як з гары́ ўніс. *Цял.*

Мало́ць языко́м. Слу́хай то́лькі, што яна́ ме́ле языко́м, дык галава́ ско́ра забалíць. *Цял.*

Мець га́ньбу. Гэ́та дзяўчы́на нічо́га, але́ ма́е га́ньбу: до́ўгі нос. *Хож.*

Набі́ць аско́му. Тваѐ дурны́я разгаво́ры аско́му набі́лі. *Цял.*

Набра́ць у галаву́. *Дук.*

Набра́ць як павалачы́. *Граб.*

Надава́ць па мурзака́х. За́рас як вазьму́ што-не́будзь, нада́ю па мурзака́х, то другі́ раз бу́дзеш вѐдаць, як рабі́ць абы́-што. *Бяс.*

Налізáўся, як Сёмушка. *Кірк.*

Налізáцца па завя́зку. *Крок.*

На валаску́ ліпе́ць. *Аз.*

Навастры́ць ву́шы. *Клет.*

На ве́кі ве́чныя. *Мядзь.*

Наве́сці спра́ўкі. *Меж.*

Наве́сці на пу́ць. *Баг.*

Не дава́ць у абі́ду. *Кузьм.*

Не засну́ць ні на валасі́нку. *Луц.*

Ні знаць гольля́. Ле́тась было́ сто́лькі я́блыкаў і ігруш — ні знаць гольля́. *Кам.*

Ні імкні́ся жыць, як набяжы́ць. *Цял.*

Німа́ на панюх таба́кі. *Цял.*

Ні мець во́ка. Я даўно́ ні ма́ю на яго́ во́ка. *Цял.*

Не ўбіва́цца ў гра́мату. Ране́й то ў гэ́ту гра́мату не вѐльмі ўбіва́ліся. *Кам.*

Ні ўбіў, ні ўе́хаў. *Кірк.*

Ні ўцяць, ні ўзяць. *Цял.*

Паво́ем расьсці́ла́цца. *Крок.*

Падвѐсці пад манасты́р. Падвялі́ мяне́, ду́рня старо́га, пад манасты́р бо́гу памалі́цца. *Цял.*

Пайсьці́ па ро́ду. Я пашла́ па яго́ ро́ду. *Цял.*

Пазы́чыць у саба́кі вачэ́й. *Бяс.*

Пазы́чыць вачэ́й. Хі́ба трэ́ба пазы́чыць вачэ́й, каб ісьці́ к сьвякру́хі ў ха́ту. *Цял.*

Па́лец ап па́лец не сту́кнуць. Другу́ю нядзе́лю сядзі́ць до́ма і па́лец ап па́лец ні сту́кне. *Кам.*

Папа́сьці па́льцам у не́ба. Папо́ў па́льцам у не́ба. *Цял.*

Працу́ям сьвет мацу́ям. *Цял., Дук., Бяс.*

Прысьці́ да ро́зуму. Калі ты ўжэ пры́дзеш да ро́зуму? Усё́ ро́біш ні так, як тро́ба. *Цял.*

Пе́рці, як ганча́к. *В. В.*

Разьне́сьці па ха́тах цёплянькае. Яна́ така́я, ні ўсьпе́я пачу́ць, як разьнясе́ па ха́тах цёпляньКая. *Цял.*

Сабіра́ць радню́. Склікаць радню. Як на вясе́льля, то сабіра́юць радню́. *В. В.*

Свой калі́ не запла́ча, то хоць скры́віцца. *Цял.*

Свой свайго́ пазно́ў, ды на по́частку пазво́ў. *Цял.*

Скіда́юцца гурке́. Вянуць і гінуць. Хо́ладна цяпе́р і гуркі́ скіда́юцца. *В. В.*

Слаба́я галава́. Дрэнная памяць. Я слабо́й галавы́ і по́мніць нічо́га ня по́мню. *Р. Ч.*

Сло́ва саро́ка но́сіць. *Крок.*

Слу́хаўшы ма́мку не мець жаніха́. *Кук.*

Смерць заку́свае. Як льга жыць, дык ужо сьмерць заку́свая. *Кухц., Кам.*

Спа́сьці с цёла. Чаго́ ж ва́ша Га́нька спа́ла сь це́ла? Ці мо́жа го́ра яко́е ў вас? *Бяс.*

Сь пе́чы ды пад услон. *Крок.*

Спусьці́ць во́чы. Яна́ тут ціхенька спусьці́ла во́чы, сядзіць і нічо́га ні слу́хая. *Кам.*

У во́чы зь ме́дцам, за во́чы зь пе́рцам. *Крок.*

У галаву надава́ць. Хто яго́ ве́дае, гэ́тага Цімо́ху, яшчэ́ ў галаву́ надае́. *Сак.*

У даро́зе і жук мя́са. *Белар.*

Узя́цца за жыццё. Пачаць добра жыць. *Кам.*

У каго́ сем, у таго́ й до́ля ўсем, у каго́ адна́, дык і до́лі нема́. *Цял.*

Упаліць шту́ку. От жа ўпалі́ў шту́ку, што і сам ні рад, хоць ты цяпе́р людзя́м на во́чы не пака́звайся. *Бяс.*

Упа́сьці на во́чы. Нядаўна мая́ дачка́ зусім на во́чы ўпа́ла. *Кам., Кухц., Цял.*

У по́лі крапіва жыгліва́я, а ў ха́це сьвякру́ха сварлі́вая. *Кук.*

Хваста́ць пу́гаю па вадзе́. Бяс то́лку гаварыць — усе́ ро́ўна што хваста́ць пу́гаю па вадзе́. *Цял.*

Хто на чом стаіць, той таго́ і глядзіць. *Кам.*

Чужо́е і сыро́е сма́чна. *Крок.*

Чужая да́ньня на адно́ сьняда́ньня. *Дук.*

Як во́ка ў ілбе́. Ён жа ў мяне́ адзін, як во́ка ў ілбе́. *Цял.*

Як гаро́х пры даро́зе, хто ідзе́, той адшчыпне́. *Цял.*

Як ма́ці памро́, дак ба́цька асьле́пня. *Цял.*

Як сеў, дык і прыкіпе́ў. *Цял.*

ЗМЕСТ

Прадмова 3
Умоўныя скарачэнні 4
Матэрыялы для слоўніка 8
Прыказкі, прымаўкі, фразеалагічныя спалучэнні 136

МАТЕРИАЛЫ К СЛОВАРЮ
МИНСКО-МОЛОДЕЧНЕНСКИХ ГОВОРОВ

На белорусском языке

Издательство Белорусского государственного
университета им. В. И. Ленина. Минск, Кирова, 24.

Рэдактар А. М. Ляпіч
Мастацкі рэдактар Л. Г. Мядзведзева
Тэхнічны рэдактар В. П. Безбародава
Карэктары В. А. Ждановіч, А. М. Гуль

АТ 24150. Здадзена ў набор 21/VII 1976 г. Падпісана да друку 10/XII 1976 г. Фармат 70X108¹/₃₂. Папера друкарская № 1. Ум.-друк. арк. 6,3. Улік.-выд. арк. 6,48. Тыраж 1000 экз. Заказ 1876. Цана 19 кап. Выдавецтва Беларускага дзяржаўнага універсітэта імя У. І. Леніна. Мінск, вул. Кірава, 24. Друкарня Выдавецтва БДУ імя У. І. Леніна. Мінск, вул. Кірава, 24.

У Выдавецтве БДУ імя У. І. Леніна
ў 1976 годзе выйшлі ў свет
і маюцца ў кнігарнях
наступныя кнігі па філалогіі:

М. Г. Булахов. **Восточнославянские языковеды.**

Т. В. Кабржыцкая, В. П. Рагойша.
Карані дружбы.

А. И. Киселев.
Частицы в современных восточнославянских языках.

Лірычныя песні. Пад рэдакцыяй Н. С. Гілевіча.

А. І. Наркевіч. **Назоўнік.**
Граматычныя катэгорыі і формы.

Н. С. Мажэйка, А. Я. Супрун.
Частотны слоўнік беларускай мовы
(мастацкая проза)

В. І. Смыкоўская. **Творчая канцэпцыя пісьменніка.**
(Задума і яе мастацкае ўвасабленне ў «Палескай хроніцы» І. Мележа.)

А. А. Станюта. **Постижение человека.**

19 к.